

ТВОЙ САБАКА — ТВАЯ ПРАБЛЕМА? МС

ЯК ЗМАГАЦЦА З СУМНІКАМ КАНАДСКІМ? МС



Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

6 ВЕРАСНЯ 2019 г.
ПЯТНІЦА
№ 169 (29036)

9-24 стар. МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ +TV ПРАГРАМА

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Ігар КАРПЕНКА, міністр адукацыі:**

*«Атрымаўшы базавую адукацыю, абавязковую для ўсіх, падлетак сёння не можа выйсці ў самастойнае жыццё. Яшчэ ўзрост не дазваляе. Па прычыне ўзроставых абмежаванняў ён не можа атрымаць паўнавартасную работу, таму мы ў новым Кодэксе аб адукацыі заклалі пераход на абавязковую агульную сярэднюю адукацыю. Для гэтага нам практычна ніякіх намаганняў прыкладаць не трэба. Яна ўжо фактычна пачала рэалізоўвацца, мы дэ-юрэ зацвердзім тое, што дэ-факта існуе».*

# БУЛЬБА ЎРАДЗІЛА!



Фота БелТА.

У гаспадарцы «Світанак» імя К. Арлоўскага Кіраўскага раёна пачалі масавую ўборку бульбы. Другі хлеб, які займае тут 300 гектараў, сёлета надзвычай добры — ураджайнасць складае больш за 400 цэнтнераў з гектара. *На здымку:* механізатар Валерый ПІСКУНОЎ і памочнік Уладзіслаў ЧАБАН.

## КОРАТКА

● **«Беларуськалій» да 2025 года павялічыць вытворчыя магутнасці па выпуску ўгнаенняў да 15,5 млн тон штогод.**



● У краіне будзе створана рэгіянальная сетка крызісных псіхолагаў, да якіх людзі змогуць звяртацца непасрэдна на месцах.

● **У Беларусі закладваюцца плантацыі фундуку і грэцкага арэха для наступнага вывучэння ў прамысловых умовах.**

● На Мінскім паўмарафоне, які пройдзе 15 верасня, будзе працаваць адна тысяча валанцёраў.

ISSN 1990 - 763X

Брэст 1000 год!

## ГОРАД, ЯКІ ЛЮБІЦЬ НАС І ЯКІ ЛЮБІМ МЫ

### Кожнаму ў Брэсце сёння ёсць што сказаць малой радзіме

**Сёння наш горад пачынае сваё грандыёзнае святкаванне. Як быццам, ёсць нагода. Усё-такі 1000-гадовы юбілей адзначаем. Другі такі праз 10 вякоў наступіць. Ці будзе на гэтым месцы нейкае пасяленне, і якім яно будзе, дакладна не скажа ніхто. А зараз у Брэсце жывуць людзі, іх 350 тысяч чалавек. Большасць з іх, несумненна, любяць свой горад, хочуць, каб ён квітнеў і развіваўся.**

З многімі давялося гаварыць апошнім часам пра тысячагоддзе. Пра будучы юбілей у нас сталі згадваць не ўчора, а нашмат раней. Гэта актыўная падрыхтоўка ішла ў апошнія гады, маецца на ўвазе ўзвядзенне і рамонт розных аб'ектаў, шматпланавае добраўпарадкаванне. А ў культурніцкім асяродку тэма мілленіума ўзнікала даўно, ідэі выспявалі загадзя. Многія з тых ідэй знайшлі сваё ўвасабленне ў праграме святкаванняў, таму і выглядае названая праграма вельмі цікава.

Яшчэ некалькі гадоў таму, на адной з навуковых канферэнцый, прысвечаных Берасцейскім кнігазборам, тагачасны намеснік дырэктара па навуковай рабоце Брэсцкай абласной бібліятэкі **Ала МЯСНЯНКІНА** нагадала аўдыторыі, што 1000-гадовая гісторыя ўвасобленая не ў сценах і мурах, тым больш што іх тут фактычна не засталося, а ў дакументах, у пісьмовых і друкаваных помніках. Сапраўды, спачатку было слова. Інакш хто б даведаўся, калі той Брэст узнік.

СТАР. 4

Жыллё

## СМАЛЯВІЧЫ І РУДЗЕНСК — У ПЕРШУЮ ЧАРГУ

### Менавіта тут будзе актыўна весціся будаўніцтва кватэр для мінчан



Фота БелТА.

**Ні для кога не сакрэт, што тэрыторыі, якія знаходзяцца блізка ад індустрыяльнага парка «Вялікі камень», лічацца найбольш ліквіднымі. Перспектыва атрымаць жыллё (а ў далейшым і работу) у такім індустрыяльным месцы здаецца досыць павабнай. І нядзіўна, што на першы эксперыментальны дом у Смалявічах, а дакладней на 192 кватэры ў гэтым доме, прэтэндуе паўтары тысячы чалавек.**

СТАР. 3

# УЗАЕМНАЯ ЗАЦІКАЎЛЕНАСЦЬ

**Кіраўнік Беларусі Аляксандр Лукашэнка сустрэўся з прэзідэнтам Азіяцкага банка інфраструктурных інвестыцый Цзінь Ліцюнем.**

Беларускі лідар адзначыў, што адносіны паміж Беларуссю і Азіяцкім банкам інфраструктурных інвестыцый толькі пачынаюцца. «Гэта старонка чыстая, там няма нічога станоўчага, бо гэта першыя крокі, але, на шчасце, няма і нічога дрэннага, — сказаў ён. — Таму мы поўныя рашучасці выбудаваць нашы адносіны так, каб гэта стала ўзорам для іншых».

Аляксандр Лукашэнка падзякаваў кіраўніку банка за намер інвеставаць сродкі ў беларускую інфраструктуру. «Вы ведаеце, што Беларусь — гэта цэнтр Еўропы, транзітная краіна, і для нас вельмі важна развіццё інфраструктурных кірункаў, перш за ўсё дарожнай сеткі, — паведаміў Прэзідэнт Беларусі. — У сувязі з гэтым вы цудоўна разумееце, што для сувязяў паміж Азіяцкім рэгіёнам, перш за ўсё, Кітайскай Народнай Рэспублікай і заходнім светам, Заходняй Еўропай, Беларусь становіцца досыць прывабным цэнтрам. Паўныя напрацоўкі ўжо ў нас ёсць і па аўтамабільным, і па чыгуначным транспарце ў плане гандлёвых зносін — гэта таксама павінна ўзмацніць вашу цікавасць да Беларусі».

Кіраўнік дзяржавы падтрымаў намер банка ўкласці інвестыцыі ў інфраструктуру Кітайска-беларускага індустрыяльнага парка «Вялікі камень». «Я таксама ведаю, што вы сур'ёзна займаецеся пытаннямі гарадской гаспадаркі, энергетыкай — усё гэта ў Беларусі запатрабавана, і мы будзем прапаноўваць вам праекты, калі вы палічыце патрэбным у іх удзельнічаць, і будзем за гэта ўдзячныя, тым больш што ўмовы, якія ваш банк прапануе, не горшыя за ўмовы іншых міжнародных банкаў», — дадаў Аляксандр Лукашэнка.

Ён праінфармаваў суразмоўніка, што ў Беларусі вельмі шмат і ўласных сродкаў, і сродкаў еўрапейскіх фінансавых арганізацый, і Сусветнага банка апошнім часам укладзена ў развіццё дарожнай сеткі. «У нас засталіся дзве дарогі, якія пакуль недабудаваныя і не прафінансаваныя. Гэта дарога на поўнач — да Полацка, і дарога, якую мы плануем па поўдні, каб перахапіць паўднёвы напрамак, які ідзе з Расійскай Федэрацыі, — Гомель — Брэст. Вось дзве такія дарогі, якія я асабіста мару пабудаваць у найбліжэйшы час», — паведаміў спадару Цзіню Ліцюню Аляксандр Лукашэнка.

Рэканструкцыю дарогі ў напрамку Полацка Азіяцкі банк інфраструктурных інвестыцый гатовы падтрымаць, на гэтую тэму ідуць перагаворы з беларускім урадам. Прэзідэнт Беларусі прапанаваў банку разгледзець і праект па паўднёвым транспартным калідоры з тым, каб наша краіна мела магчымасць абраць найлепшы з варыянтаў, які ёй прапаноўваюць розныя міжнародныя фінансавыя арганізацыі.

«А таксама пытанні энергетыкі, водаадвядзення, магчыма, рэінавацый будынкаў для жылля нашых грамадзян... Увогуле, праблем, якія трэба вырашаць калі не сёння, то заўтра, шмат, і калі вы нас у гэтым падтрымаеце, будзем удзячныя вам і гатовыя супрацоўнічаць», — рэзюмаваў Аляксандр Лукашэнка.

Спадар Цзінь адказаў, што банк удзячны Прэзідэнту Беларусі за падтрымку і магчымасць удзелу ў развіцці інфраструктуры краіны. «З таго моманту, як членства Беларусі было зацверджана ў нашым банку, мы адчувалі вашу падтрымку і ўдзячныя за яе», — сказаў ён. «За апошнія два дні мы правялі шмат сустрэч з прадстаўнікамі Савета Міністраў, банкаў, у тым ліку Банка развіцця. І я ўражаны тым, наколькі людзі адданыя справе развіцця краіны».

У размове з журналістамі ён назваў сустрэчу з Прэзідэнтам Беларусі вельмі плённай. «Мы абмяркоўвалі магчымасці нашага супрацоўніцтва і тую ролю, якую можа выканаць наш банк у далейшым сацыяльна-эканамічным развіцці краіны, — паведаміў ён. — Для нас будзе гонарам супрацоўнічаць з такой працаздольнай нацыяй».

Прэзідэнт банка дадаў, што з пункту гледжання геаграфіі Беларусь знаходзіцца ў стратэгічна важным месцы, яна з'яўляецца свайго роду мостам паміж Еўропай і Азіяй, таму развіццё яе транспартнай сістэмы выходзіць на першае месца. Ён расказаў, што яго ўразіла дынаміка развіцця Кітайска-беларускага індустрыяльнага парка «Вялікі камень», і што ў банка ёсць поўныя ідэі па ўдзеле ў развіцці парка, якія будуць абмяркоўвацца камандай фінансістаў больш дэталёва.

**Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.**

### Да ведама

Штаб-кватэра Азіяцкага банка інфраструктурных інвестыцый знаходзіцца ў Пекіне. 100 краін з'яўляюцца яго членамі і кандыдатамі на ўступленне. Самыя буйныя акцыянеры — Кітай, Індыя і Расія. Статутны капітал банка складае 100 мільярдаў долараў.

Асноўная мэта банка — садзейнічанне ўстойліваму эканамічнаму развіццю і паляпшэнню інфраструктурных сувязяў у Азіі шляхам ажыццяўлення інвестыцый у інфраструктуру і іншыя вытворчыя сектары эканомікі.

# У БРЭСЦЕ СТВОРАЦЬ IT-КЛАСТАР

**На II Эканамічным форуме гарадоў-пабрацімаў і партнёраў Брэста падпісана пагадненне аб стварэнні ў горадзе IT-кластара.**

Пагадненне аб супрацоўніцтве заключана паміж кампаніямі «Эполь софт» і «Оранжсофт дэвэлапмент», Брэсцкім мясцовым фондам рэгіянальнага развіцця, Брэсцкім навукова-тэхналагічным паркам, Брэсцкім дзяржаўным тэхнічным універсітэтам і Брэсцкім дзяржаўным універсітэтам імя А.С. Пушкіна. Дакумент прадугледжвае стварэнне ў абласным цэнтры кластара інфармацыйных тэхналогій.

У пагадненні партнёры прапісалі ўмовы супрацоўніцтва, яно пасля будзе напаўняцца праектамі ў розных галінах.

Па словах **рэктара БрДТУ Аляксандра ДРАГАНА,** IT-кластар адкрывае вялікія перспектывы для ўсіх удзельнікаў. У найбліжэйшы час ва ўніверсітэце адкрыецца новая лабараторыя робататэхнікі.

Усяго падчас эканамічнага форуму падпісана больш за 20 пагадненняў аб супрацоўніцтве, паведамляе БелТА. Развіваць кантакты з прадпрыемствамі, арганізацыямі і установамі Брэста маюць намер прадстаўнікі Расіі, Польшчы, Славакіі, Балгарыі, Грузіі, Ізраіля, Літвы і іншых краін.

## ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### Брытанскія парламентарыі прагаласавалі за адтэрміноўку «брэксіту»



Палата абшчын Вялікабрытаніі прыняла праект аб пераносе «брэксіту», які першапачаткова быў запланаваны на 31 кастрычніка гэтага года. Прэм'ер-міністр Борыс Джонсан прыгразіў парламенту перавыбарамі за перанос тэрмінаў выхаду краіны з ЕС.

Выхад краіны са складу Еўрасаюза адтэрмінаваны на тры месяцы — да 31 студзеня. Пра гэта сведчаць вынікі галасавання, якое адбылося ў сераду ў ніжняй палаце заканадаўчага органа. На карысць унясення змены выказаліся 329 дэпутатаў, супраць прагаласавалі 300 парламентарыяў.

Папраўкі супярэчаць пазіцыі прэм'ер-міністра Борыса Джонсана, які мае цвёрды намер вывесці Злучанае Каралеўства з Еўрасаюза 31 кастрычніка незалежна ад таго, удасца яму дамагчыся пагаднення з Бруселем ці не.

Джонсан ужо паабяцаў, што калі дэпутаты выкажуцца за адтэрміноўку, то ён распусціць парламент і прызначыць на 15 кастрычніка датэрміновыя выбары, паведамляе ТАСС.

### Індыя выдзеліць крэдыт на 1 млрд долараў на развіццё Далёкага Усходу

Індыя гатова выдаць крэдытную лінію на 1 млрд долараў для развіцця Далёкага Усходу, заявіў прэм'ер-міністр краіны Нарэндра Модзі, выступаючы на Усходнім эканамічным форуме ва Уладзівастоку.

«Для таго каб працягваць дапамагаць развіваццю Далёкаму Усходу, Індыя выдзеліць крэдытную лінію ў памеры $1 млрд», — заявіў індыйскі прэм'ер.

Ён адзначыў, што гэтая мера з'яўляецца беспрэцэдэнтнай. Паводле яго слоў, Індыя вельмі актыўна працуе ў гэтым рэгіёне. Модзі расказаў, што Нью-Дэлі і Масква падчас УЭФ ужо заключылі каля 50 пагадненняў аб інвестыцыях на 5 млрд долараў, бо Далёкі Усход валодае вялікімі прыроднымі рэсурсамі, а таксама патэнцыялам для актыўнага развіцця.

«Мы без усякага сумнення будзем заставацца актыўнымі партнёрамі ў нашым прыярытэтным супрацоўніцтве», — дадаў ён.

Раней паведамлялася, што Індыя заказала ў Расійскай Федэрацыі ўзбраенне на суму ў 14,5 млрд долараў.

### Суд дазволіў французскаму пеўню Марысу кукарэкаць уранку



Суд французскай камуны Рашфор адхіліў іск пенсіянераў да гаспадыні пеўня Марыса, які перашкаджаў суседзям спаць. На іх думку, птушка пачынала кукарэкаць занадта рана.

«Юстыцыя дазволіла пеўню Марысу працягваць співаць, адхіліўшы іск суседзяў, якія абвінавачвалі яго ў ранніх пабудках», — паведаміў 5 верасня партал France Info.

Яшчэ ў 2017 годзе пажылая пара Біронаў пачала скардзіцца на пеўня, які крычыць занадта рана. У той жа час у падтрымку гаспадыні галасістай птушкі Корын Фесо стварылі дзве петыцыі. Іх падпісала амаль 155 тысяч чалавек.

У ліпені 2019 года прайшло пасяджэнне суда па справе гучнага пеўня. На яго не з'явіліся ні пазоўнікі, ні адвакат іх цяжбы. Абвяшчэнне вердыкту адклалі тады да 5 верасня.

# МІЛІЦЫЯ ЧУЕ ЛЮДЗЕЙ

## Прэзідэнт прыняў з дакладам міністра ўнутраных спраў Юрыя Караева

**Кіраўнік дзяржавы спытаў міністра пра яго першыя ўражанні на новай пасадзе, заўважыўшы, што з нагоды парадку новы міністр унутраных спраў добра знаёмы. «І трэба сказаць, што да нашых падраздзяленняў, якія лічацца за Міністэрствам унутраных спраў, я прэтэнзій практычна не меў. Дзякуй богу, што ў нас і абстаноўка была больш-менш спакойная ў краіне. Дай бог так і надалей. Тым не менш гэта і дзякуючы таму, што ўсе разумеюць — рэакцыя будзе імгненнай і адэкватнай», — заўважыў беларускі лідар.**

У якасці прыкладу добрай работы міліцыі ён прывёў раскрыццё абрабавання ювелірнай крамы ў Мінску. «На выклік вы дастойна адказалі. Няхай так заўсёды будзе. Вы вельмі хутка развярнуліся і раскрылі гэту крымінальную справу, хоць следства і суд яшчэ прымуць рашэнне, ну а вашы хлопцы спрацавалі добра. Малайцы! Я вас прашу, перадайце ім маю шчырую падзяку за аператыўную работу, за той прафесіяналізм, які яны праявілі», — дадаў Аляксандр Лукашэнка.

Прэзідэнт таксама пацікавіўся думкамі міністра пра абстаноўку ў грамадстве: ці ёсць моманты, на якія трэба звярнуць увагу.

Міністр далажыў Прэзідэнту, што сёлета абстаноўка ў краіне застаецца падкантрольнай органам унутраных спраў. «Па выніках сямі месяцаў захоўваецца ўмераны тэмп прыросту агульнай колькасці злачынстваў, пры гэтым удзельная вага цяжкіх і асабліва цяжкіх злачынстваў зменшылася. Тэндэнцыя росту адбываецца за кошт правапарушэнняў у сферы высокіх тэхналогій, — праінфармаваў ён. — Гэта ў асноўным крадзяжы з дапамогай банкаўскіх картак і ўзломы інтэрнэт-акаўнтаў карыстальнікаў».

Каментуючы журналістам свой даклад кіраўніку дзяржавы, міністр дадаў, што апошнім часам таксама нязначна павялічылася падлеткавая злачыннасць за кошт правапарушэнняў у сферы наркаспажывання.

На думку Юрыя Караева, трэба ўзмацніць яго кіраўніцкі ўплыў на дысцыпліну, маральна-псіхалагічны клімат у шэрагах супрацоўнікаў органаў унутраных спраў. Міністр далажыў таксама Прэзідэнту пра крокі, якія МУС робіць для выпраўлення хібаў, аб якіх ішла размова на нядаўняй нарадзе ў кіраўніка дзяржавы, прысвечанай рабоце праваахоўных органаў. У прыватнасці, датычна павышэння якасці збору доказаў падчас расследавання карупцыйных спраў і эканамічных злачынстваў.

«Узмоцненая работа па павышэнні якасці рэагавання на звароты грамадзян. Тое, што казалі ў Адміністрацыі Прэзідэнта, — 25 працэнтаў усіх зваротаў датычацца праваахоўных органаў, іх якасці работы. Будзем больш дасканала, дэталёва разбірацца з кожнай заявай, каб грамадзяне не атрымлівалі адпіскі. Будзем разбірацца, у чым супрацоўнікі органаў унутраных спраў парушылі правы грамадзян, магчыма, паводзілі сябе некарэктна, не стрымаліся. Будзем даваць такім выпадкам прынцыповую ацэнку, каб тыя, хто звяртаецца да нас, упэўніліся, што яны пачутыя», — сказаў міністр МУС.

Юрый Караеў запэўніў журналістаў, што яго ведамства больш уважліва вывучае таксама інфармацыю, якая датычыцца работы міліцыі, у СМІ. « У тым ліку ў інтэрнэце, у тым ліку ў незалежных, апазіцыйных СМІ, бо яны ж аднекуль гэтыя матэрыялы бяруць, не заўсёды яны прыдуманыя, паклёп, недзе падставы ёсць. Каб не было беспакаранасці і ўсёдазволенасці тых, хто за імя ўлады можа валодаць нейкімі прывілеямі, як ім падаецца. Усе павінны дакладна, як ваенныя людзі, як людзі ў пагонах, выконваць свае абавязкі перш за ўсё, і памятаць, што служаць народу, грамадзяніну, грамадству, абараняюць яго правы», — рэзюмаваў міністр.

**Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.**

## Надзённыя пытанні і іх вырашэнне

**7 верасня ў аблвыканкамах і Мінгарвыканкаме адбудуцца традыцыйныя прамыя тэлефонныя лініі кіраўніцтва рэгіёнаў з жыхарамі. У гэтую суботу з 9.00 да 12.00 на сувязі будуць:**

першы намеснік старшыні БРЭСЦКАГА аблвыканкама Валерый Васілевіч Рабкавец (8 016 221 31 21);

намеснік старшыні ВІЦЕБСКАГА аблвыканкама Барыс Сяргеевіч Яфрэмаў (8 021 222 22 22);

намеснік старшыні ГОМЕЛЬСКАГА аблвыканкама Уладзімір Аляксандравіч Прывалаў (8 023 233 12 37);

старшыня ГРОДЗЕНСКАГА абласнога Савета дэпутатаў Ігар Георгіевіч Жук (8 015 273 56 44),

кіраўнік спраў МАГІЛЁЎСКАГА аблвыканкама Рыгор Аляксандравіч Воронін (8 022 250 18 69);

першы намеснік старшыні МІНСКАГА аблвыканкама Ігар Мікалаевіч Макар (8 017 500 41 60);

старшыня МІНСКАГА гарадскога Савета дэпутатаў Васіль Васілевіч Панасюк (8 017 222 44 44)

# СМАЛЯВІЧЫ І РУДЗЕНСК — У ПЕРШУЮ ЧАРГУ

## У сталіцы будуем усё менш


realt.by

«Паводле аператыўнай інфармацыі, за студзень — жнівень гэтага года ў Мінску ўведзена 280 тысяч квадратных метраў жылля, што складае 42 % ад гадавога задання ўрада. Яго па выніках года плануецца выканаць у поўным аб'ёме», — заявіў **начальнік упраўлення жыллёвага будаўніцтва камітэта будаўніцтва і інвестыцый Мінгарвыканкама Дзяніс НІКІЦІН** у прэс-цэнтры БелТА.

Асноўнымі пляцоўкамі для будаўніцтва жылля ў сталіцы ў апошнія гады з'яўляюцца тэрыторыі, якія рэканструююцца са зносам малакаштоўнай індывідуальнай сядзібнай забудовы. Цяпер актыўнае асваенне вядзецца ў межах вуліц Шаранговіча — Гарэцкага — Рафіева, мікрараёнаў Лошыца і Чыжоўка. Спецыяліст адзначыў, што пачынаючы з 2015 года назіраецца тэндэнцыя скарачэння аб'ёмаў жыллёвага будаўніцтва, бо застаецца ўсё менш вольных пляцовак. Прадугледжана памяншэнне штогадовых аб'ёмаў новага будаўніцтва жылля да 600 тысяч квадратных метраў.

Менавіта таму былі вызначаны шэсць гарадоў-спадарожнікаў Мінска. Гэта Дзяржынск, Заслаўе, Лагойск, Рудзенск, Смалявічы і Фаніпаль. Пры паэтапным скарачэнні аб'ёмаў жыллёвага будаўніцтва ў сталіцы тут плануецца рассяліць да 120 тысяч мінчан.

## Момант ісціны для эксперымента

А вось мінчане з ліку чаргавікоў да канца наступнага тыдня змогуць азнаёміцца з поўнай інфармацыяй пра эксперыментальны дом.

«Да канца гэтага тыдня на сайце Мінгарвыканкама будзе размешчаная інфармацыя пра дом: арыенціровачны кошт квадратнага метра, агульныя характарыстыкі, колькасць кватэр і іншая цікавая інфармацыя, што датычыцца гэтага жылля», — сказаў Дзяніс Нікіцін. Зрэшты, ужо цяпер цікавасць да гэтага дома вялікая. Нават не ведаючы кошту квадратнага метра, некалькі тысяч чалавек звярнулася ў адміністрацыі раёнаў Мінска.

Мець магчымасць атрымаць кватэру ў гэтым доме могуць усе тыя, хто мае патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў, незалежна ад даты іх пастаноўкі на ўлік (пры ўмове, калі яны здымуцца з чаргі ў сталіцы). Але перш за ўсё, відома, будуць разглядацца заяўкі шматдзетных. Заказчыкам будаўніцтва выступае УКБ Мінгарвыканкама, падрадная арганізацыя — акцыянернае таварыства «МАПІД», якое ўжо рыхтуе пляцоўку для забудовы. Гэта будзе тыпавы пяціпавярховы дом на 192 кватэры. Нарматыўны тэрмін будаўніцтва — дзесяць месяцаў, таму налета будынак павінен быць здадзены ў эксплуатацыю.

Вызначаны крыніцы фінансавання ўзвядзення жылля, аб'ектаў сацыяльнай, інжынернай, транспартнай інфраструктуры, добраўпарадкавання тэрыторый у гарадах-спадарожніках. Прадугледжаны міжбюджэтны трансферт Мінска ў кансалідаваны рэспубліканскі бюджэт для накіравання ў бюджэт Мінскай вобласці на гэтыя мэты. Памер трансферту будзе зацвярджацца Мінгарсаветам дэпутатаў па ўзгадненні з Мінаблвыканкамам.

«З мэтай далейшага асваення гарадоў-спадарожнікаў цяпер уносяцца змяненні ва Указ № 103 у частцы павелічэння аб'ёмаў будаўніцтва жылля для грамадзян, якія стаяць на ўліку маючых патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў. Праект указа знаходзіцца на ўзгадненні», — дадаў Дзяніс Нікіцін. Гэта значыць, пакуль невядома, якія менавіта гарады-спадарожнікі ў яго будуць уключаныя, акрамя Смалявіч. Між тым у гэтым горадзе, па словах прадстаўніка сталічнай мэрыі, да 2022 года плануецца пабудаваць каля 150 тысяч квадратных метраў жылля. Колькасць дамоў і аб'ектаў вызначыцца пазней, на этапе праектавання.

**Намеснік старшыні Камітэта па архітэктуры і будаўніцтве Мінаблвыканкама, галоўны архітэктар Мінскай вобласці Вадзім НІКАЛАЕНКА** заўважыў, што сталічны рэгіён са свайго боку запытвае карэкціроўку генплана Смалявіч, Рудзенска і Фаніпаля — з мэтай павышэння камфорту пражывання (напрыклад за кошт зніжэння паверхавасці).

«Гэтую работу мы пачынаем сёлета. Спадзяюся, скончым у другой палове наступнага года», — дадаў ён. Паводле планавых разлікаў, да 2030 года ў Смалявічах павінна пражываць 23 тысячы чалавек. Пасля карэкціроўкі гэтая лічба можа зменшыцца, але запланаванае раней будаўніцтва спыняцца не будзе, унясенне карэкціровак будзе адбывацца паралельна. Пакуль сумарна ў Смалявічах плануецца ўзвесці каля 20 дамоў, з іх прыблізна для адзінаццаці аб'ектаў заказчыкам выступае УКБ Мінгарвыканкама.

Таксама Вадзім Нікалаенка патлумачыў, чаму Смалявічы і Рудзенск — першыя ў чарзе па асваенні праграмы гарадоў-спадарожнікаў. Для Рудзенска прычынай з'яўляецца размяшчэнне тут вытворчасці беларускай нацыянальнай біятэхналагічнай карпарацыі. А на рост Смалявіч уплыў аказвае Кітайска-беларускі індустрыяльны парк «Вялікі камень». Першы жылы дом на тэрыторыі парка больш чым на 150 кватэр павышанай камфортнасці ўрачыста здадзены ў канцы жніўня гэтага года. Вось так. Трэба і ў Смалявічах будавацца.

**Сяргей КУРКАЧ.**

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Надвор'е

# ДЗЕСЬЦІ ВОСЕНЬ, АЛЕ НАОГУЛ — ЦЁПЛА

### Уначы ўжо свежа: 8—10 цяпла, а ўдзень па-летняму — плюс 20—25 градусаў

**У гэтыя выхадныя ў нас у краіне будзе далёка не холадна, толькі ў некаторых раёнах пройдуць кароткачасовыя дажджы, паведамілі спецыялісты Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды.**

У суботу чакаецца сонечнае надвор'е, толькі ў асобных раёнах пройдуць невялікія кароткачасовыя дажджы. Слабы вецер месцамі будзе пераходзіць ва ўмераны. Максімальная тэмпература паветра складзе ад 18 да 24 цяпла, а па паўднёвым усходзе паветра прагрэецца да плюс 25 градусаў.

У нядзелю да нас з поўдня Еўропы прынясе цэлы шэраг атмасферных франтоў. Але на ўсходзе нашай краіны надвор'е ў асноўным будзе вызначаць вобласць павышанага атмасфернага ціску. У цэлым жа значна павялічыцца і воблачнасць. Таму ўначы ў заходніх, а ўдзень і ў цэнтральных раёнах краіны пройдуць кароткачасовыя дажджы, месцамі з навальніцамі. У начныя і раніштнія гадзіны ў нізкіх месцах і паблізу вадаёмаў прагназуецца слабы туман. Сіноптыкі абяцаюць нам умераны заходні вецер, пры навальніцах парывісты. Тэмпература паветра ўначы складзе ад плюс 8 да плюс 15 градусаў, удзень — усё тыя ж 16—23 цяпла, а па ўсходзе яшчэ цяплей — ад плюс 24 да плюс 27 градусаў.

Па папярэдніх прагнозах айчынных сіноптыкаў, у пачатку наступнага тыдня сітуацыя з надвор'ем у нас практычна не зменіцца. Таму ў панядзелак у заходніх і цэнтральных раёнах краіны месцамі захаваюцца кароткачасовыя дажджы, удзень магчымыя навальніцы. Уначы і раніцай у асобных раёнах чакаецца слабы туман. Вецер умераны, пры навальніцах парывісты. Нягледзячы, што верасень, будзе па-летняму цёпла. Тэмпература паветра ўначы складзе плюс 8—15 градусаў, удзень — ад плюс 18 да плюс 25 градусаў, а па паўднёвым усходзе краіны прыгрэе да 27 цяпла.

**Сяргей КУРКАЧ.**

Спорт-тайм

## БЕЛАРУСКАЯ ТЭНІСІСТКА ЗГУЛЯЕ Ў ПАРНЫМ ФІНАЛЕ US OPEN

**А вось хто дакладна гэта будзе, стане вядома сёння.**

Усе тры нашы суайчынніцы з партнёркамі напярэдадні ў чвэрцьфіналах перамаглі сваіх апанентак. Прычым пара Сасновіч/Кужмава ўжо ў 1/2 фіналу сустракалася з парай Азаранка/Барці ўчора позна ўвечары. Раней у паўфінал трапілі Сабаленка з Мертэнс, іх саперніцамі ў сённяшняй гульні будуць амерыканкі Даўлдхайд і Кінг. Такім чынам, у фінальным матчы жаночых пар на US Open згуляе як мінімум адна беларуская тэнісістка.

## СУСТРЭЧА АЎТСАЙДАРАЎ

**Зборная Беларусі сёння сустрэнецца з камандай Эстоніі ў кваліфікацыі чэмпіянату Еўропы 2020 года.**

Нашы футбалісты вельмі няўдала пачалі цяперашні адборачны цыкл, прайграўшы ўсе чатыры матчы ў сваёй групе С: Паўночнай Ірландыі — 1:2 і 0:1, Нідэрландам — 0:4 і Германіі — 0:2. Эстонцы таксама прайгралі ўсе свае сустрэчы.

Склад нацыянальнай каманды: варатары — Аляксандр Гутар, Андрэй Клімовіч, Максім Плотнікаў; абаронцы — Дзяніс Палякоў, Сяргей Паліцэвіч, Сяргей Мацвейчык, Захар Волкаў, Аляксандр Паўлавец, Мікіта Навумаў, Мікалай Золатаў; паўабаронцы — Станіслаў Драгун, Ігар Стасевіч, Дзмітрый Бага, Яўген Яблонскі, Павел Няхайчык, Юрый Кавалёў, Макс Эбонг, Іван Маеўскі, Уладзіслаў Клімовіч, Кірыл Пячэнін, Іван Бахар, Яўген Шаўчэнка; нападаючыя — Мікалай Сігневіч, Максім Скавыш.

## ВЫЕЗД ПАЧАЛІ ТАКСАМА З ПАРАЖЭННЯ

**Хакеісты мінскага «Дынама» прайгралі другі матч чарговага чэмпіянату КХЛ.**

У першай выязной гульні нашы гульцы саступілі аднаклубнікам з Масквы з лікам 2:3, хоць першыя адкрылі лік у сустрэчы. У дынамаўцаў галы забілі Цему Пулкінен і Андрэй Касціцын.

**Іван КУПАРВАС.**

Чалавек і прырода

# Глушэц — птушка года—2020

**Грамадская арганізацыя «Ахова птушак Бацькаўшчыны» абвясціла птушку года, якая стане наступніцай сёлетняга крылатага сімвала — вялікага арляца.**



Глушэц — гняздуючы аселы від з атрада курападобных. Распаўсюджаны вельмі нераўнамерна па ўсёй тэрыторыі нашай краіны, але часцей сустракаецца ў паўночных раёнах і на ўсходзе. Старыя ацэнкі колькасці 8000 — 9000 асобін. Гэта таёжны, паўночны від, і ў сувязі са зменай клімату ён паступова паўзодна па Беларусі знікае. Асабліва катастрафічнае становішча цяпер на захадзе і поўдні краіны — у Белавежскай пушчы сто гадоў таму жылі сотні глушцоў, а цяпер ён тут амаль знік.

У нас жывуць два падвіды глушца: заходнееўрапейскі і сярэднярускі. У песні заходнееўрапейскага падвіду ёсць характэрны элемент «корак», таксама чорнае бруха амаль не мае белых плям, і ён больш буйны, чым усходняя раса. На жаль, колькасць заходнееўрапейскага падвіду нізкая: не перавышае 500 асобін.

На глушцоў дазволена паляванне. Паляўнічыя і далі калісьці назву птушцы — падчас вясенняй песні глушэц нічога не чуе і дае магчымасць людзям падысці на адлегласць трапнага стрэлу. Самец глушца — памерам з хатняга індыка і добра адрозніваецца ад самак бліскучай чорна-зялёнай расфарбоўкай. Самка меншага памеру і афарбаваная пад колер лісцяў і зямлі. Такая афарбоўка асабліва патрэбная ёй для маскіроўкі падчас насяджвання яек.

Глушэц — сапраўдны патрыёт, амаль усё жыццё можа пражыць у адным лесе. Гэтыя птушкі жывуць і гняздуюцца ў хвойных лясах паблізу мохавых балотаў. Увесну і ўлетку глушэц есць парасткі, кветкі, пупышкі, лісце, лясныя ягады, насенне і насякомых. Увосень птушкі кормяцца лісцем асін, ягадамі журавін, зімой — хваёвай ігліцай, пупышкамі. Птушанятам патрэбны бялок, таму ядуць у асноўным казурак і павукоў.

**Сяргей КУРКАЧ.**

Запрашальнік

# «Гукі будоўлі» з... музычнай шкатулкі

**У сталіцы пройдзе першы інжынерна-акустычны Open Air.**

7 верасня жыхары і госці Мінска стануць удзельнікамі першага інжынерна-акустычнага Open Air «Гукі будоўлі», які пройдзе ў Цэнтральным Батанічным садзе Нацыянальнай акадэміі навук Рэспублікі Беларусь. Мерапрыемства, арганізаванае Інфармацыйным цэнтрам па атамнай энергіі (ІЦАЭ) пры падтрымцы інжынірынгавага дывізіёна Дзяржкарпарацыі «Расатам» (генеральнага праекціроўшчыка і генеральнага падрадчыка будаўніцтва Беларускай АЭС), адбудзецца ў рамках Фестывалю навукі Scifest.

«Гукі будоўлі» — праект аб сінтэзе будаўніцтва і мастацтва, які прадстаўляе пляцоўку ўзвядзення АЭС як работу зладжанага аркестра. «Спецыяльна для гэтай праграмы быў створаны ўнікальны арт-аб'ект — музычная шкатулка «Вальс для цэнтрыфугі з аркестрам», — адзначыла **кіраўнік ІЦАЭ Таццяна ШЛЫК.** — Любы ахвотны зможа прывесці механізм шкатулкі ў дзеянне ды пачуць шум і гук работы розных механізмаў і сістэм АЭС, якія збяруцца разам такім чынам, што ўсе наведвальнікі пачуюць знакаміты вальс Генрыха Вагнера — заслужанага дзеяча мастацтваў і народнага артыста Беларускай ССР».

Таксама ў праграму ўключаны арыгінальныя пастаноўкі з удзелам байцоў студэнцкіх будаўнічых атрадаў Беларускай АЭС.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

**Дэпутаты Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь і работнікі Сакратарыята Палаты прадстаўнікоў выказваюць глыбокае спачуванне намесніку старшыні Гродзенскага абласнога выканаўчага камітэта, дэпутату Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь пятага склікання Лісковічу Віктару Андрэевічу ў сувязі з напаткаўшым яго вялікім горам — смерцю БАЦЬКІ.**

# ГОРАД, ЯКІ ЛЮБІЦЬ НАС І ЯКІ ЛЮБІМ МЫ




Фота БелТА.

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

І дата — 1019 год — узятая з «Аповесці мінулых гадоў», лічыцца першым упамінаннем аб старажытным Бярэсці. Праўда, даследчыкі гісторыі Анатоль Гладышчук і Анатоль Нікітчык знайшлі дакумент, у якім гаворыцца, што Яраслаў Мудры хадзіў да Бярэсця ў 1017 годзе. Але ж указаная інфармацыя была агучаная адносна нядаўна, у 2014 годзе, і афіцыйна прынятая дзень нараджэння горада пакуль застаецца нязменным.

**Анатоль ГЛАДЫШЧУК**, фізік па прафесіі і нястомны краязнавец, шмат зрабіў для аднаўлення і папулярызацыі гісторыі горада. Яго трылогія «Замак Берасцейскі», якая складаецца з кніг «Русь», «Літва», «ResPublika» пра старажытны Брэст і яго жыхароў. Цікава, што ён, прафесіянал у фізіцы, сказаў на адной з прэзентацый сваіх твораў такую рэч: «Шмат тэхнічных навінак стварыў чалавечы розум, яны істотна аблягчаюць наша жыццё. Але ніводзін самы наварочаны гаджэт не працуе без батарэйкі. А кніга працуе.»

Сапраўды, можна ганарыцца кнігазборамі колішніх берасцейцаў, якія апошнім часам удалося ўзнавіць, няхай сабе толькі ў электронным выглядзе. А нядаўна ўся краіна зноў успаміналa Брэсцкую біблію, бо яе факсімільнае ўзнаўленне прэзентавала Нацыянальная бібліятэка. У Брэсце ёсць і арыгінал гэтай кнігі, выдадзенай некалі Мікалаем Радзівілам Чорным, праўда, не цэлы фаліянт, а толькі яго фрагмент.

Нашы нястомныя музейшчыкі, што прыдумалі цікавы праект «12 артэфактаў тысячагоддзя» на кожным новым паказе яшчэ і яшчэ раз нагадваюць гараджанам, якімі прасунутымі і культурнымі для свайго часу былі продкі. Гэта відно па ўпрыгажэннях, пабытавых рэчах, якія ствараліі на гэтай зямлі. Многія з артэфактаў знайшлі пры раскопках нашай сусветнай славутасці — старажытнага паселішча гарадзян, якое датуецца XI—XIII стагоддзямі. Цяпер там вядомы музей «Бярэсце», які, дарэчы, нядаўна перажыў рэканструкцыю. І той факт, што Брэст першым на беларускіх землях атрымаў грамату на магдэбургскае права — 15 кніжня 1390 года, — гаворыць аб значнасці горада ў сярэдневечныя часы. Грэх было б і не згадаць гістарычную сустрэчу, прысвечаную распрацоўцы генеральнага плана Грунвальдскай бітвы. Сустрэча польскага караля Ягайлы і вялікага князя літоўскага Вітаўта прайшла ў снежні 1409 года ў Брэсце. І ўсё гэта адлюстравана ў дакументах, навуковых працах, шматлікіх кнігах. Таму, вядома, кніга сёння адзін з галоўных герояў святкавання мілениума.

Дырэктар мемарыяльнага комплексу «Брэсцкая крэпасць-герой» **Рыгор БЫСЮК** любіць паўтараць, што ў свядомасці тысяч і мільёнаў людзей, асабліва жыхароў былога Саюза, Брэст успрымаецца як месца подзвігу абаронцаў крэпасці. І гэта сапраўды так. Бывае, знаходзячыся недзе на адпачынку ці ў паездцы, згадаеш сваю малую радзіму, і ўсе адразу: «Брэст, ведаем, у крэпасці былі на экскурсіі з класам сорак, трыццаць... гадоў таму». А вось калі пачынаеш расказваць, што ў 30-я гады XIX стагоддзя горад паміж Мухаўцом і Заходнім Бугам быў поўнасцю зруйнаваны дзеля будаўніцтва на яго месцы Брэсцкай крэпасці, людзі часта здзіўляюцца. Але ж гэта наша гісторыя. І крэпасць для горада асаблівае месца. На яе цяперашняй тэрыторыі была аддрукаваная знакамітая Брэсцкая біблія, тут была заключаная Брэсцкая унія, падпісаны Брэсцкі мір. А ў 1941 годзе абаронцы крэпасці паказалі свету ўзор стойкасці і гераізму.

А цяпер шматлікія госці выказваюць захапленне тым, як мы ўмеем захоўваць і падтрымліваць помнік, па якім пазнаюць Брэст. І гэта прыемна. Мы сапраўды шмат робім для захавання памяці не толькі гераізму, але і трагізму часоў вайны. Амаль трэцюю частку жыхароў даваеннага горада знішчылі акупанты падчас Халакосту. І напярэдадні святкавання юбілею гэтая трагедыя нечакана зноў напомніла пра сябе. У самым цэнтры горада пры вопкаванні катлавана знойдзена масавае пахаванне вязняў гета. Астанкі 1214 чалавек былі ўзняты і перапахаваны на Паўночных могілках. Там цяпер ёсць памятны знак. На месцы расстрэлу таксама неўзабаве з'явіцца мемарыяльны знак.

Памяць пра свае карані, сваю гісторыю, несумненна, галоўнае ў культуры і калектыўнай свядомасці любой супольнасці. Гэтую памяць паспяхова падтрымліваюць брэсцкія музеі. А яшчэ тут абавязкова раскажуць пра знакамітых людзей-сучаснікаў. Такіх, напрыклад, як мастак-ювелір **Мікалай КУЗЬМІЧ**. У краіне пра яго даведаліся пасля таго, як ён узнавіў крыж Ефрасінні Полацкай. Нядаўна мастак стаў ганаровым грамадзянінам Брэста. Мікалай Пятровіч сказаў, што да юбілею горада падрыхтаваў асобны твор, а які — сюрпрыз. Думаю, сёння і раскрыецца тайна. А пра сябе мастак стрымана дадаў: «У маёй асобе ўзнагародзілі культуру». А вось **Ганна РАДЗЬКО** прадстаўляе маладое пакаленне мастакоў. Гэта яна стварыла лагатып святкавання тысячагоддзя і прыцягвае здзіўляць крэатыўнымі работамі пра свой горад. «Уся мая любоў сёння імкнецца туды», — сказала Аня, якая апошнімі днямі была па справах у сталіцы, а ўчора вярнулася ў Брэст.

І калі цяперашняя брэсцкая культура трывала асацыюецца з асобамі дзеячаў мастацтва, то брэсцкі спорт неаддзельны ад перамогі алімпійскай чэмпіёнкі **Юліі НЕСЦЯРЭНКІ**, дарэчы, ганаровай грамадзянкі Брэсцкай вобласці. А калі б мяне папрасілі намаляваць словамі партрэт брастаўчанкі-сучасніцы, то гэта была б Юлія: прыгожая, працавітая і вельмі сціплая. «Я люблю свой горад, тут нарадзілася, вырасла, дасягнула спартыўнага поспеху», — кажа спартсменка.

Думаю, было б недаравальнай памылкай гаварыць пра брастаўчан сённяшняга дня і не згадаць будаўнікоў, чыёй старанной і складанай працай горад падрыхтаваны да свята. У даволі сціслыя тэрміны ўзведзена 28 так званых аб'ектаў тысячагоддзя. Гэта толькі тыя, што фінансаваліся з рэспубліканскай праграмы. Насамрэч іх значна больш. За год-два ў горадзе з'явіліся новы Кобрынскі мост, велічны тэатр лялек, пераўтварылася набярэжная ракі Мухавец, адкрыўся аднаўлены Гарадскі сад. І самы значны ды маштабны праект у пераліку называецца Заходні абход, які ўрачыста адкрываецца сёння і абазначае новую якасць жыцця для значнай колькасці гараджан. Адна з арганізацый, якая займалася ўзвядзеннем гэтага пуцепровада, — ААТ «Палессежылбуд». На рахунку згаданых будаўнікоў новы аўтавакзал, іншыя аб'екты тысячагоддзя. Генеральны дырэктар ААТ **Анатоль ПЯТРЫНІЧ** сказаў, што гэтае свята немагчыма аддзяліць ад вялікай стваральнай працы інжынераў і рабочых усіх арганізацый, якія былі задзейнічаны на будаўнічых пляцоўках: «Людзі працавалі ад цямна да цямна, у выхадныя і святы, у спякоту і ў холад, каб усе астатнія гараджане карысталіся потым новымі будынкамі, мастамі, дарогамі».

Будаўніцтва і паляпшэнне не завяршаюцца пасля маштабнага святкавання. Падчас адкрыцця Гарадскога саду старшыня гарвыканкама **Аляксандр РАГАЧУК** сказаў, што апаска на гэты конт не мае пад сабой грунту. Ужо ёсць праграма на добраўпарадкаванне і паляпшэнне ў 2020 годзе і на наступныя гады. Так што горад застанецца з тым, што было створана і абноўлена да свята, і будзе развівацца далей.

***

У кожнага з нас, брастаўчан, ёсць свае асаблівыя мясціны ў горадзе. Калі спытаць мяне, то я і не адказала б напэўна, якая самая любімая. Цяпер родным падаецца мікрараён Кавалёва ў раёне Вясляркага канала, куды я пераехала чвэрць стагоддзя таму. Тады яшчэ новы, неўладкаваны раён, цяпер адзін з найлепшых у плане інфраструктуры. Прыемна прайсціся па Набярэжнай, часам гуляю па Савецкай, дзе турысты натоўпам фатаграфуюцца з іх улюбёнцам — ліхтаршчыкам. У час правядзення «Белай вежы» люблю тэрыторыю вакол тэатра, тут заўсёды назіраецца асаблівы рух, урачыстасць, многа святочна апранутых людзей. Але ж галоўнае... як там у Янкі Брыля: «Абавязкова ёсць на гэтым шалёным свеце куток, дзе любяць і цябе». Гэты куток і ёсць мой горад, дзе жывуць родныя і блізкія людзі, куды кожны вечар спяшаешся, бо веdaеш: цябе чакаюць.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**

## Раман Васілюк праводзіць развітальны матч

Легенда беларускага футбола, рэкардсмен чэмпіянату Беларусі па забітых галах, 40-гадовы Раман Васілюк правядзе свой развітальны матч у складзе «Дынама-Брэст» супраць польскай «Ягелоніі» ў суботу, 7 верасня. Дабрачынная сустрэча пачнецца ў 17.30 на АСК «Брэсцкі». Усе сродкі ад продажу білетаў будуць пералічаны Мікіту Палуяновічу. 9 мая гэтага года хлопчык трапіў у бяду, пасля чаго застаўся без часткі левай нагі. Цяжкая траўма не зламала баявы дух маленькага футбаліста. Ён, як і раней, працягвае гуляць і радавацца перамогам сваёй любімай каманды. Падтрымаць маленькага футбаліста, а таксама пабачыць на полі аднаго з найлепшых форвардаў беларускага футбола, які ў пачатку гэтага года аб'явіў аб завяршэнні кар'еры, можна, набыўшы білеты на сайце kvitki.by. Кошт на любое месца — тры рублі.

**Алена КРАВЕЦ.**

## Установы дадатковай адукацыі запрашаюць...

**Сёння Міншчына ўрачыста адкрывае Рэспубліканскі тыдзень устаноў адукацыі дзяцей і моладзі. Клецк і Нясвіж плануюць прыняць каля паўсотні гасцей з усіх абласцей і горада Мінска — прадстаўнікоў Міністэрства адукацыі, спецыялістаў упраўленняў па адукацыі аблвыканкамаў, дырэктараў устаноў дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі.**

Клецкі раён падзеліцца вопытам работы аб'яднанняў эколага-біялагічнага, турысцка-краязнаўчага, прыродазнаўча-матэматычнага кірункаў, прадэманструе інавацыйныя, творчыя, даследчыя праекты, распрацоўкі ў галіне тэхнічнай творчасці.

А ў Нясвіжы будзе прэзентавана дзейнасць мастацкіх аб'яднанняў. Пройдуць выстаўкі, майстар-класы, будуць паказаны ініцыятывы, скіраваныя на арганізацыю вольнага часу дзяцей і моладзі, прапаганду здаровага ладу жыцця, папулярызацыю розных відаў спорту, выхаванне бяспечных паводзін і цікавасці да адраджэння і захавання гісторыка-культурнай спадчыны.

**Алена ДЗЯДЗЮЛЯ.**

## Ну і ну!

### Падрапаў аўто на 1,8 тысячы

#### Гэта цана рэўнасці мінчаніна

**У аператыўна-дзяжурную службу Партызанскага РУУС сталіцы паступіла паведамленне ад жыхароў дома, размешчанага на завулку Вучнёўскім, што на паркоўцы невядомы мужчына драпае аўтамабіль маркі Mercedes-Benz C220.**

На месцы міліцыянеры ўстанавілі, што пашкоджаная машына належыць 48-гадовай жыхарцы сталіцы. Падчас апытання ўладальніцы аўто стала вядома, што свой транспартны сродак яна перадала ў карыстанне сяброўцы на некаторы час і пра тое, што ён пашкоджаны, яна не ведала.

Пагутарыўшы з сяброўкай пацярпелай, праваахоўнікі ўстанавілі меркаванага зламысніка. Ім аказаўся 53-гадовы муж сяброўкі. Жанчына расказала, што да здарэння яна выходзіла з дому і нечакана для сябе заўважыла свайго мужа. Падышоўшы да яго, мінчанка стала з ім абмяркоўваць асаблівасці шлюбаразводнага працэсу, аднак гутарка зайшла ў тупік, і пара пасварылася. Пасля размовы жанчына накіравалася да аўтамабіля сяброўкі, паколькі планавала здзейсніць на ім паездку. Убачыўшы, што ў яго жонкі з'явілася новая машына, 53-гадовы мінчанін выказаў здагадку, што аўто ёй падарыў іншы мужчына. Гэтая акалічнасць раззлавала фігуранта, і ён стаў драпаць машыну ключамі. У выніку з-за бяздумнага ўчынку зламысніку прыйдзецца пакрыць шкоду ў памеры 1800 рублёў, паведамляе ГУУС Мінгарвыканкама. Вядома, што раней мужчына да крымінальнай адказнасці не прыцягваўся.

### Пахваліўся сукамернікам пра брата...

#### І тыя скралі з кватэры амаль 10 тысяч долараў

**Жыхарка пасёлка Зялёны Бор прыглядае за кватэрай роднага брата, пакуль той знаходзіцца ў камандзіроўках у Польшчы. У адзін з дзён жанчына выявіла адсутнасць шыбы, але больш непрыемнасцю аказалася нястача буйной сумы грошай, — амаль 10 тысяч долараў.**

Супрацоўнікі крымінальнага вышуку Івацэвіцкага РАУС і УУС Брэсцкага аблвыканкама ўстанавілі, што брат пацярпелага знаходзіцца ў турме. Сваім сукамернікам ён не раз апавядаў пра паспяховага сваяка, які дзякуючы законнай рабоце мае поспех у жыцці. Выйшаўшы на волю, жыхар Бярозы 1996 года нараджэння і жыхар Пінска 1994 года нараджэння сустрэліся са сваім знаёмым пінчуком 2001 года нараджэння. Абмеркавалі план дзеяння і ноччу пранікі ў кватэру пацярпелага.

Здабычу падзялілі паміж сабой, купілі два аўтамабілі і раз'ехаліся ў розныя бакі. На наступны дзень аператыўнікі затрымалі жыхара Бярозы ў яго дома, там жа была выяўлена частка выкрадзеных грошай. Праз некаторы час пінчукі на адным з аўтамабіляў патрапілі ў невялікае ДТЗ, пашкодзіўшы набыты транспарт, калі праязджалі па двары шматкватэрнага дома позна ўвечары. Спалохаліся і кінулі машыну. Па гарачых слядах сышчыкі Пінскага ГАУС затрымалі зламыснікаў і перадалі івацэвіцкім калегам.

### Таксіст абакраў пасажырку

**Супрацоўнікі крымінальнага вышуку Кастрычніцкага РУУС Мінска затрымалі 38-гадовага кіроўцу таксі, які выкраў забытыя рэчы кліента.**

Як аказалася, 41-гадовая жанчына пасля застолля ў сваёй сяброўкі вырашыла дабрацца дадому на таксі. Калі на выклік прыехала машына, жанчына села ў аўто і загадзя перадала таксісту абумоўленую суму грошай за аплату. Паколькі ўжо была позняя ноч, пацярпелая заснула на заднім сядзенні.

Прыехаўшы ў патрэбнае месца, таксіст разбудзіў кліентку і пачаў выпраўджваць яе з машыны. Увязаўшыся ў канфлікт з кіроўцам, жанчына зусім забылася пра сваю сумку, пакінутую ў машыне. Гэтым і скарыстаўся зламыснік. У ручной паклажы ён знайшоў мабільны тэлефон, дакументы і кашалёк з грашыма ў суме 230 рублёў. Апошнія і сотавы мужчына забраў сабе, а вось дакументы і сумку фігурант выкінуў у раку. Пацярпелая ўспомніла пра рэчы раніцай, пасля чаго адразу ж звярнулася ў міліцыю.

Як пазней стала вядома, прысвоеныя грошы мужчына выдаткаваў на ўласныя патрэбы, а мабільны тэлефон меў намер прадаць, але яму перашкодзілі аператыўнікі. Фігурант затрыманы. Вядома, што раней ён ужо прыцягваўся да крымінальнай адказнасці за крадзеж і заведама хлусілвы данос.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

АБО ВЯСЁЛЫЯ І ПРАЎДЗІВЫЯ ГІСТОРЫІ З ЖЫЦЦЯ ЧЫТАЧОЎ «ЗВЯЗДЫ»

# АЛЁ, НАРОД НА ПРОВАДЗЕ!

## З ВАЧЭЙ СЫШОЎ, ДЫ НЕ З ПАМЯЦІ

...У свой час я захапляўся творчасцю Васіля Шукшына, а найбольш, здаецца, яго апавяданнямі пра дзівакоў. Цікавыя людзі! На аднаго з іх і мне пашчасціла. Хударлявы такі, высокі, усмешлівы... Яму тады за 50 было. І прозвішча адметнае — Авяр'янчык: усе, хто на слых па-руску запісваў, заўсёды пыталіся, што пасля «р» — цвёрды знак ці мяккі?

Але ж запомніўся ён не столькі гэтым, колькі сваім проста неверагодным талентам трапляць у розныя гісторыі. Ці нават ствараць іх...

Значыць, неяк інстытуту бульбаводства, які знаходзіцца ў Самахвалавічах (а гэта з дзясятак кіламетраў ад Мінска), тэрмінова спатрэбілася новае абсталяванне. Заказ на яго вытворчасць атрымала наша прадпрыемства. І вось работа зроблена, засталася, можна сказаць, драбяза — даставіць «груз» на месца.

Каб не адрываць спецыялістаў ад асноўнай работы, гэтую задачу (пагрузіць, завезці, разгрузіць...) даверылі нам, itээраўцам, так званым белым каўнерыкам. Адпаведнага рабочага адзення ніхто з нас, вядома ж, не меў. «Прыбіраліся» ў тое, хто што знайшоў (потым адзін з аднаго смяяліся, бо кожнага ну хоць ты ў канаплі — замест пудзілаў)...

Ну а далей — завезлі тое абсталяванне, што называецца, здалі заказчыку, а самі наводшыбе, у цянькy селі чакаць аўтобуса.

Трэба сказаць, што яго даўгавата не было — рабочы дзень канчаўся. Таму, калі пад'ехаў, «загрузіліся» мігам, але не ўсе: Авяр'янчык прапаў!

Мы спачатку гукалі яго, потым шукалі, потым, літаральна, прачасалі нагамі найбліжэйшыя кусты... Усё без толку — чалавек як скрозь зямлю праваліўся!

...Рашэнне ехаць у горад без яго далося нам вельмі цяжка: не ведалі, што думаць, што рабіць, усю дарогу перажывалі, дома ноччу не спалі...

А нараніцу наш Авяр'янчык як ні чога ніякага прыйшоў на работу. Мы ледзь не загрудкі: «Дзе быў?» Кажа: «Спаў... У кусце». Гэта ў яго са службы, маўляў, засынаць пры «дзявятым вале» і тады хоць з гарматы страляй... Вечарам прачнуўся сам, за чатыры гадзіны пехатой прыйшоў дадому. Пра «аўтастоп», казаў, нават не марыў, бо такога абадранца нават ноччу машыны здалёк аб'язджалі.

Гэта — адна прыгода. Раскажу пра другую.

Наша прадпрыемства знаходзілася ў прыгарадзе. Сцежка да яго пралягала цераз калгаснае поле. І калі на яго вывозілі гной...

«Водар» — нішто, а вось «паласа перашкод»... Баючыся на ёй паслізнуцца, мы скакалі ад «міны» да «міны». Здаралася прамахнуцца. Здаралася паслізнуцца...

А потым на нашым полі пасадзілі капусту, і вырасла яна вялікая ды прыгожая: не дзіва, што пад восень асобныя качанчыкі, што раслі бліз дарогі, сталі патроху знікаць.

Паквапіўся на іх і наш Авяр'янчык. Дзень пры гэтым выбраў удалы:



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

людзі выйшлі на масавую ўборку. А вось з часам ён крыху памыліўся. Факт, што неўпрыкмет прымкнуўшы да працуючых, наш дзівак стаў, што называецца, носам круціць — вышукваць найлепшыя качаны ды складаць сабе ў торбы.

Між тым у калгаснікаў пачаўся перапынак на абед: людзі кінулі работу, пайшлі па дамах. Авяр'янчык таго не заўважыў — ён «шчыраваў» сабе далей. А вось яго заўважылі вартаўнікі (поле было пад аховай) і, вядома ж, у крык...

Злодзей прыкінуў, што ногі доўгія, лес блізка — уцячэ.

Аднаго не ўлічыў, што бегчы давядзецца яшчэ і ад сабак — да таго ж на... «лаўца»...

Карацей, прыпусціў — як той бусел на ўзлёт, толькі замест крылаў — торбы з капустай. Лес ужо за пару метраў быў. А там, бачыць, яшчэ два ахоўнікі — вогнішча распальваюць. Авяр'янчык як зараве: «Ла-жы-сь!..» Тыя ніцма... Ён — цераз агонь і ў лес.

...Хвілін праз сорак з'явіўся на рабоце з дзвюма торбамі капусты. Сабакі, сказаў, яго не дагналі, бо па лесе пятляў, як сапраўдны заяц.

...Калі Авяр'янчык сышоў на пенсію, мы спачатку з палёгкай уздыхнулі, бо прыгод такіх з ім была процьма. А потым — не паверыце — засумавалі, бо Васіль Макаравіч Шукшын меў такі рацыю: у чалавечым «разнатраўі» дзівакі зусім не лішнія. З імі цікавей.

**Іван Гаральчук,**
*г. Мінск.*

## РАСОНСКІ ІДАЛ

У інтэрнэце чытаў, што ў нашай рацэ Дрысе знайшлі старажытнага ідала, які на паверку аказаўся...

Зрэшты, пра гэта чытачам любімай звяздоўскай рубрыкі мне хацелася б расказаць не прозай. Такім чынам

*У адной з мясцовых вёсак*
*Дзед Вінцук рабіў унёсак*
*У тутэйшы сельскі быт:*
*Каб палепшыць дабрабыт,*
*Майстраваў ён, як вядзецца,*
*Усё, што толькі давядзецца*
*То драбіны, то начоўкі,*
*Скажуць — ручку для нажоўкі*
*Ці акенца, каб відней...*
*Ці карыта для свіней.*

*Майстар просты быў, вясковы,*
*Толькі ўразлівы на словы.*
*Да таго ж меў добры «стаж»...*
*Вось і кінуўся ў кураж:*
*— Тапарышча для сякеры?!*
*Ды рукам сваім я веру.*
*Нават ідала зраблю!*
*Стаўка?*
*З носа па рублю!..*

*Калі «рушыў» у заклад,*
*То ні кроку ўжо назад.*

*Значыць, ціхенька, здаля*
*Маракуе ля камля:*
*Абкарыў... Стакроць памераў,*
*Цюкаў нештачка сякерай...*
*— Ці не з глузду з'ехаў дзед, —*
*Баба хрысціцца ад бед. —*
*Гаспадарку не спраўляе,*
*У пуні штосьці вырабляе*
*Ад світанку аж да ночы —*
*Уваліліся ўжо вочы...*

*Не было б другога ліха:*
*Праца ў майстра ішла паціху.*
*Стаў яго цурбан дубовы*
*Неяк дзіўна хмурыць бровы.*
*Доўгі нос да губ звісаць,*
*Вочы строга пазіраць...*
*Нават ручкі змог злажыць!*
*Дзед — мастак!*
*Каб мне так жыць!*

*Вось — нарэшце —*
*скончыў справу*
*(Хоць бяры і на выставу!):*
*Трубіць збор сябрам-суседзям,*
*Каб жа ўсякі мог агледзець*
*Можа, нават шапку зняць*
*Ды й заклад яму аддаць...*

*Глупства, пане дабрадзею,*
*Песціць марныя надзеі:*
*Людзі грошай шкадавалі,*
*Таму дружненька прызналі:*
*— Можа, ідал трохі й гожы,*
*Але ж гэта толькі можа...*

*Дзед рашучыя меў рысы:*
*На спіну й... на бераг Дрысы.*
*Там —*
*статуі ўсё адно —*
*Галавой яе — аб дно!*

*...Колькі часу там ляжала,*
*На сягоння звестак мала.*
*Толькі дайверы аднойчы*
*Акруглілі ў масках вочы:*
*Гістарычная знаходка*
*Кружыць розумы салодка!*
*Сталі думаць-вырашаць —*
*Як жа ідала падняць?*
*Навукоўцаў запрасілі,*
*Каб жа вартасць ацанілі...*

*Тыя з лупай ды пінцэтам,*
*Справу робячы з імпэтам*
*Выдаюць вердыкт суровы:*
*Гэты ідал — яшчэ «новы!» —*
*Гадоў сорак і не болей*
*Праляжаў ён у «няволі».*
*xxx*
*...Паглядзіш у інтэрнэце, —*
*Многа цудаў ёсць на свеце!*
*Я ж за вухам чухаю:*
*Гэты быў не ў Бухаве?*

**Аляксандр Матошка,**
*Расонскі раён.*

***Заўвага аўтара: Бухава — невялікая вёска на беразе Дрысы.***

***Анекдот у тэму ад вядучай рубрыкі Валянціны ДОЎНАР: вучоныя-археолагі знайшлі шлем Аляксандра Македонскага. А праз дзесяць метраў — знайшлі яго матацыкл.***

***Пішыце! Свет захаваўся таму, што смяяўся. І думаў.***

Неасабісты суб'ектыў



# ШОСТЫ ДЗЕНЬ ВОСЕНІ

## Той, каго чакаеш і шукаеш, прыходзіць і знаходзіцца. А ці трэба?

На практычных занятках па псіхалогіі ў нас аднойчы быў цікавы трэнінг. Трэба было расказаць дзве гісторыі, адна з якіх — суцэльная выдумка, другая — найчысцейшая праўда. А аўдыторыя павінна была ўгадаць, што ёсць што. Пахвалюся: мне, акрамя выкладчыцы, удалося падмануць усіх. Яна як прафесіянал — па жэстах, міміцы — вылічыла ісціну. Астатнія мае аднагрупнікі — дарослыя дзядзькі і цёткі з багатым жыццёвым досведам (занняткі праходзілі на факультэце перападрыхтоўкі), пракаловаліся на гісторыі праўдзівай — не паверылі. Яна здалася ім неверагоднай і мала падобнай на праўду. Але жыццё часам закруціць такі сюжэт — ніводзін таленавіты белетрыст не пераплюне. Пачула я яе падчас адной са сваіх камандзіровак ад нерасрэднай дзеючай асобы, так што сумнявацца ў тым, што так і было, не выпадала.

А гісторыя гэта, на першы погляд, тыповая. Пра дзяўчыну, якая ў далёкім 1983-м праводзіла свайго каханага ў армію. І пра хлопца, які ішоў служыць, верачы, што яна яго дачакаецца, што, калі ён вернецца, яны пажэняцца і будуць жыць доўга і шчасліва. Пра Афганістан — крывавы тагачасны кашмар многіх савецкіх сем'яў — куды хлопца з беларускай вёскі накіравалі служыць у дэсантны полк. Пра ліст, які праз паўгода атрымалі яго бацькі, у якім значылася страшнае: «Прапаў без вестак»...

На гэтым тыповасць гісторыі заканчваецца. Бо дзяўчына ў гэтым паведамленні знайшла для сябе суцяшэнне: не забіты, значыць — жывы. І... паехала яго шукаць. Яна ўжо скончыла медыцынскае вучылішча, збіралася паступаць у медінстытут. Але інстытут мог пачакаць. А яна ўсімі праўдамі і няпраўдамі дабілася, каб яе накіравалі ў шпіталь у Кабуле. Там і прабыла фактычна да 89-га, да вываду войскаў. Факт сам па сабе неверагодны: больш за два кантрактныя гады рэдка хто затрымліваўся. Але яна кожны раз угаворвала кіраўніцтва пакінуць яе яшчэ на два гады — працягвала шукаць яго, распытвала, пісала запыты, аднойчы пра яе нават карэспандэнт цэнтральнай газеты ў сваім афганскім нарысе два сказы напісаў. Кожны дзень думала: а раптам вось сёння яго, параненага, знясіленага, прывязуць у шпіталь... Міналі дні, месяцы, гады, і ёй ужо было не дзевятнаццаць, а дваццаць пяць. Але пра тое, каб штосьці мяняць у сваім жыцці, яна нават не думала, і, калі савецкія войскі з Афганістана сышлі, яна не паехала далёка — засталася працаваць медсястрой у невялікім таджыкскім гарадку побач з граніцай. Каб быць бліжэй, калі раптам...

А «раптам» здарылася праз пару месяцаў, як ён прапаў. Яго, беспрытомнага, у вельмі цяжкім стане спачатку прывезлі ў шпіталь у Ташкент, пасля — у Маскву. Ён нейкі час быў нават у коме, дакументы пісаліся-перапісваліся, і яго ў рэшце рэшт паблыталі з поўным цёзкам з Украіны (толькі дата нараджэння не супадала), які насамрэч прапаў дзесьці ў гарах. Тое, што здарылася пасля, не паддаецца ніякай логіцы і тлумачэнням (прынамсі з жаночага пункту гледжання). Сяк-так выкараскаўшыся пасля ранення і цяжкай кантузіі, ён, даведаўшыся пра гэтую блытаніну, вырашыў, што так яно і трэба, і... не стаў аб'яўляцца дома. У вялікай краіне, якую скаланала перабудова, прапасці без вестак наноў было вельмі проста. Бацькі яго так і не дачакаліся — памерлі перад развалам Саюза.

А яна — дачакалася. Калі ў пачатку 90-х у Сярэдняй Азіі пачаліся беспарадкі, вярнулася дадому. Паступіла ў медінстытут — у сваё амаль трыццаць! — скончыла, паехала працаваць у раённую паліклініку недалёка ад родных мясцін. А ён аднойчы прыйшоў да яе ў кабінет па даведку — пасля шматгадовых блуканняў ён вярнуўся на радзіму, атабарыўся ў суседнім гарадскім пасёлку...

КАЛІ яна расказвала мне гэтую гісторыю, на дварэ быў, здаецца, 2001-ы. Яны ўжо дзесяць гадоў жылі разам, гадавалі сына. З поўначы Беларусі пераехалі на поўдзень, на Палессе. Пабудавалі добры дом, завялі гаспадарку. Спакойнае, размеранае жыццё пачалося. «Ці шчаслівая я? — перапытала ў мяне здзіўлена. — Не ведаю. Я толькі нядаўна перастала баяцца, што ён зноў кудысьці знікне. Баяцца перастала, а вось упэўненасці няма. І не будзе, пэўна, ніколі. Але куды ж я без яго...»

Я, калі аднакурснікам гэтую гісторыю, у якую ніхто не паверыў, два гады таму расказала, вырашыла пацікавіцца, што было з яе героямі далей. Патэлефанавала ў сельсавет, спыталася. Так, доктарка працуе ў амбулаторыі, адказалі. Сын паступіў вучыцца ў медыцынскі. Муж? Гадоў пяць як з'ехаў у Расію на заробкі і прапаў. А яна яго чакае... А ўчора мне ў тым жа сельсавеце сказалі, што доктарка летась прадала дом і з'ехала. Куды — ніхто не ведае...

«ОСЕНЬ недавно в городе — шестой день. // Мое время уезжает вдаль на игрушечном поезде...» Я чамусьці на пачатку верасня заўсёды прыгадваю не хіт Шуфуцінскага пра «трэцяе верасня», які гучыць у гэты дзень з кожнага праса, а гэтую песню старога добрага «Вісакоснага года». Вось і сёння абавязкова знайду ў інтэрнэце і прайграю некалькі разоў. Вечная, як гэты свет, абсалютна восеньская і непадробна шчырая гісторыя. Пра жанчыну з шэрымі вачыма, якая чакае і шукае паўсоль галоўнага героя, набіраючы нумары тэлефона, бо думае, што ён не можа ні хвіліны жыць без яе шэрых вачэй. І ўласна пра яго, яе мужчыну, у якога час ездзе на цацачным цягніку, які рэдка зазірае ў каляндар і раптам нечакана для сябе («опанькі!») заўважае, што шэрых вачэй той, якая яго чакае і шукае, ён не бачыў ужо цэлы год.

На гэтым песня і заканчваецца. Але я ведаю: яна яго дачакалася. А ён да яе нарэшце прыйшоў.

**Алена ЛЯЎКОВІЧ.**

## ИЗВЕЩЕНИЕ о проведении аукциона

Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона) по поручению ОАО «Прудники-Агро» (продавец) проводит открытый аукцион по продаже **здания зернохранилища общей площадью 2 006 кв. м с инв. № 633/С-13573, расположенного на земельном участке с кадастровым номером 624082010101000103 (право аренды по 12.05.2115) площадью 0,3995 га по адресу: Минская область, Мядельский район, Княгининский с/с, 10, вблизи д. Осово.**

***Начальная цена с НДС (20 %) – 128 400,00 бел. руб. (задаток 10 % от начальной цены – 12 840,00 бел. руб.).***

**Условия продажи:**

- улучшение эстетического вида объекта, благоустройство земельного участка, отведенного для обслуживания недвижимого имущества, и наведение на нем порядка в течение трех месяцев с момента подписания акта приема-передачи недвижимого имущества;

- поддержание надлежащего санитарного, технического состояния недвижимого имущества и земельного участка в течение всего срока использования (эксплуатации) объекта до его сноса (гибели);

- обращение в течение одного месяца с даты государственной регистрации перехода права собственности на недвижимое имущество (в случае отчуждения незарегистрированного объекта – с даты подписания акта приема-передачи) в районный исполнительный комитет для получения разрешения на разработку проектно-сметной документации, проведение проектно-изыскательских работ (в случае необходимости ее разработки) либо информирование соответствующего исполнительного комитета в указанный срок об отсутствии такой необходимости;

- разработка проектно-сметной документации, проведение проектно-изыскательских работ в срок не позднее 6 месяцев с момента получения разрешения, если иное не предусмотрено законодательством;

- проведение реконструкции (строительства) недвижимого имущества в сроки, предусмотренные проектно-сметной документацией, с окончанием строительства не позднее 2 лет с даты государственной регистрации перехода права собственности на недвижимое имущество, если иное не установлено решением районного исполнительного комитета;

- использование земельного участка в строгом соответствии с действующим законодательством;

- запрет на отчуждение недвижимого имущества до его ввода покупателем в эксплуатацию.

**Задатки перечисляются на р/с № BY55BPSB30121082600169330000 в ЦБУ № 701 ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, БИК BPSBBY2X, УНП 690324015, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации».** Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата объекта производится в течение 30 (тридцати) банковских дней со дня заключения договора купли-продажи, если иное не предусмотрено договором купли-продажи. Победитель (единственный участник) аукциона оплачивает Организатору аукциона вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение результативного аукциона, в размере 4 (четырех) процентов от окончательной цены продажи предмета аукциона. Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.rlt.by. **Аукцион состоится 08.10.2019 в 12.00 по адресу:** г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. **Заявления на участие и необходимые документы принимаются по 07.10.2019 до 16.00 по указанному адресу.**

**Тел.: (8017) 207-71-34, (8029) 102-21-17**

---

**ОАО «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга»** (организатор аукциона) **по поручению ОАО «Гомельский ликеро-водочный завод «Радамир»** (продавец) **извещает о проведении 9 октября 2019 года открытого аукциона по продаже имущества в 11.00 в городе Гомеле по улице Гагарина, 20**

| № лота | Наименование предметов торгов | Начальная цена продажи имущества, с учетом НДС, бел. руб. | Сумма задатка, с учетом НДС, бел. руб. |
|---|---|---|---|
| **Местонахождение имущества: г. Гомель, ул. Севастопольская, 106** | | | |
| 1 | **Автомобиль MAZ 437143 332, 2011 г. в., рег. № AI 1172-3,** цвет – белый, тип ТС – грузовой бортовой тентовый, пробег – 410 234 км, состояние – на ходу | **14 652,00** | 732,60 |
| 2 | **Автомобиль MAZ 437143 332, 2011 г. в., рег. № AI 1173-3,** цвет – белый, тип ТС – грузовой бортовой тентовый, пробег – 403 033 км, состояние – не на ходу | **14 652,00** | 732,60 |
| 3 | **Автомобиль MAZ 437143 332, 2011 г. в., рег. № AI 0668-3,** цвет – белый, тип ТС – грузовой бортовой тентовый, пробег – 433 118 км, состояние – на ходу | **14 652,00** | 732,60 |
| 4 | **Автомобиль GAZ 3307, год выпуска не определен, рег. № AK 4623-3,** цвет – белый, тип ТС – грузовой специальный фургон изотермический, пробег – 463 431 км, состояние – на ходу | **2 904,00** | 145,20 |
| 5 | **Автомобиль GAZ 3309 KUPAVA 473800, 2005 г. в., рег. № AA 2635-3,** цвет – белый, тип ТС – грузовой специальный фургон изотермический, пробег – 521 650 км, состояние – не на ходу | **3 168,00** | 158,40 |
| 6 | **Автомобиль GAZ 2705, 1999 г. в., рег. № EA 8515,** цвет –темно-синий, тип ТС – грузовой фургон, пробег – 423 961 км, состояние – не на ходу | **1 584,00** | 79,20 |

**Продавец:** ОАО «Гомельский ликеро-водочный завод «Радамир», г. Гомель, ул. Севастопольская, 106. **Порядок ознакомления с имуществом осуществляется по контактным тел.:** 8 (0232) 37-14-49, 8(029) 677-35-56 – начальник транспортного цеха Туманов Александр Николаевич. **Шаг аукционных торгов – 5 %. Для участия в аукционе необходимо:** 1) Оплатить задаток на расчетный счет **Продавца (ОАО «Гомельский ликеро-водочный завод «Радамир»):** р/с BY45 BLBB 3012 0400 0783 1600 1007 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гомельской области, УНН 400078316, БИК BLBBBY2X, назначение платежа – задаток за участие в аукционных торгах по лоту № (задаток для участия в аукционе перечисляется до подачи заявления); 2) Подать заявление организатору аукциона по установленной форме с приложением необходимых документов можно **с 6 сентября 2019 г. по адресу:** г. Гомель, ул. Гагарина, 20, 2-й этаж, каб. «Эксперт-Услуга» в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 16.00. **Прием заявлений для участия в аукционе заканчивается 7 октября 2019 г. в 16.00. Заявления, поступившие после установленного срока, не принимаются. Подача документов по почте не допускается. Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее, чем за три дня до его проведения.**

**Для участия в аукционе предоставляются:** документ, подтверждающий внесение суммы задатка (задатков) на текущий (расчетный) банковский счет, указанный в извещении, с отметкой банка; юридическим лицом или индивидуальным предпринимателем Республики Беларусь – копия документа, подтверждающего государственную регистрацию этого юридического лица или индивидуального предпринимателя, без нотариального засвидетельствования; иностранным юридическим лицом – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны учреждения (выписка должна быть произведена не ранее шести месяцев до подачи заявления на участие в торгах) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны учреждения с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык; иностранным индивидуальным предпринимателем – легализованный в установленном порядке документ, подтверждающий статус, с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык; представителем юридического лица Республики Беларусь – доверенность, выданная в установленном законодательством порядке (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель); представителем гражданина или индивидуального предпринимателя Республики Беларусь – нотариально удостоверенная доверенность; представителем иностранного юридического лица, иностранного физического лица или индивидуального предпринимателя – доверенность, легализованная в установленном законодательством порядке, с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык. При подаче документов заявитель (его представитель) предъявляет документ, удостоверяющий личность, а руководитель юридического лица – также документ, подтверждающий его полномочия (приказ о назначении на должность руководителя, или заверенная выписка из решения общего собрания, правления либо иного органа управления юридического лица в соответствии с учредительными документами, или трудовой договор (контракт), или соответствующий гражданско-правовой договор, или иные документы в соответствии с законодательством).

В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только единственным участником, объект аукциона продается этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на **5 (пять) %.** Участник торгов имеет право до начала торгов письменно отозвать свое заявление на участие. Неявка участника торгов на торги признается отказом от участия в торгах. В этих случаях сумма внесенного им задатка возвращается Продавцом в течение **5 (пяти) рабочих дней** со дня проведения торгов. Победителями торгов будут признаны участники, предложившие более высокую цену. Лица, являющиеся победителями торгов, обязаны: подписать протокол о результатах аукциона; заключить договор купли-продажи в течение **20 (двадцати) календарных дней** от даты подписания протокола о результатах аукциона; оплатить приобретаемое имущество согласно договору купли-продажи и возместить затраты на организацию и проведение аукциона в течение **3 (трех) рабочих дней** с момента подписания протокола. Задатки, уплаченные участниками аукциона, ставшими победителями, будут учтены в счет исполнения обязательств по договору купли-продажи. Проводится аукцион в соответствии с Положением Открытого акционерного общества «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» о порядке организации и проведения аукционов по продаже имущества и права на заключение договоров аренды нежилых помещений (их части). **Порядок оформления участия в аукционе, в том числе документации, необходимой для регистрации участника торгов, порядок проведения аукциона размещены на официальном сайте Организатора торгов – www.gomeloblreklama.by, раздел «Аукционы». Дополнительная информация по контактным телефонам Организатора аукциона: 8 (0232) 23-23-54 (тел./факс), 23-23-56, 8 (029) 126-66-62.**

---

## ООО «Фрондера» извещает о проведении открытого аукциона по продаже имущества РУП «Жилкоммунтехника»

**Таблица № 1**

| Лот | Наименование | Местонахождение | Начальная цена без НДС, бел. руб. | Задаток, бел. руб. | Шаг аукциона, бел. руб. |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 1. Производственный корпус, инв. № 70020991, площадь 8 589,3 кв. м; 2. Проезды и площадки заводской территории, инв. № 70020998; 3. Ограждение инв. № 70021009. Сети электроснабжения 0,4 кВт, инв. № 70021011; 4. Внеплощадочные телефонные сети, инв. № 70021012; 5. Дождевая канализация, инв. № 70021013; 6. Установка для перегонки нефти, инв. № 70021001; 7. Канализация производственно-бытовая, инв. № 70021014; 8. Канализация производственная, инв. № 70021015; 9. Установка для очистки сточных вод, инв. №70021000; 10. Установка для перегонки нефти, инв. № 70021002; 11. Установка для очистки сточных вод, инв. № 70020999; 12. Внеплощадочные сети дождевой канализации, инв. № 70021016; 13. Внеплощадочные сети производственно-бытовой канализации, инв. № 70021017; 14. Водопровод хозяйственно-питьевой, инв. № 70021018; 15. Внеплощадочные сети водопровода, инв. № 70021019; 16. Противопожарный водопровод, инв. № 70021020; 17. Резервуар для воды, инв. №70021005 | Могилевская обл., Осиповичский р-он, г. Осиповичи, ул. Проектируемая, д. 14 | 1 097 910,00 | 109 791,00 | 54 895,50 |
| 2 | 1. Административно-бытовой корпус инв. № 70020992 площадь 2 786,8 м кв.; 2. Проезды и площадки предзаводской территории инв. № 70020997; 3. Ограждение ж/б, инв № 70021010 | | 381 150,00 | 38 115,00 | 19 057,50 |
| 3 | Гараж, инв. № 70020993, площадь 424 м кв. | | 33 570,00 | 3 357,00 | 1 678,50 |
| 4 | Гараж, инв. № 70020994, площадь 320 м кв. | | 24 840,00 | 2 484,00 | 1 242,00 |
| 5 | Склад, инв. № 70020974, площадь 43,4 м кв. | | 3 420,00 | 342,00 | 171,00 |
| 6 | 1. Котельная, инв. № 70020972, площадь 33,7 м кв.; 2. Дымовая труба инв. № 70020973; 3. Емкость 3,2 м куб., инв. № 70021006; 4. Емкость 3,2 м куб., инв № 70021007 | | 5 796,00 | 579,60 | 289,80 |
| 7 | 1. Склад металла, инв. № 70020996; 2. Ограждение склада металла инв. № 70021008 | | 62 460,00 | 6 246,00 | 3 123,00 |

Земельный участок площадью 4,6297 га с кадастровым номером 724850100001001442. Целевое назначение – для размещения объектов промышленности. Право постоянного пользования. Переход права на земельный участок осуществляется в соответствии с действующим законодательством Республики Беларусь.

В отношении имущества проводятся первые повторные торги. Окончание приема заявлений в 18.00 20.09.2019

**Таблица № 2**

| Лот | Наименование | Местонахождение | Начальная цена без НДС, бел. руб. | Задаток, бел. руб | Шаг аукциона, бел. руб. |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | Компрессор 4ВУ1-5/98, инв. № 70021115 | Могилевская обл., Осиповичский р-н, г. Осиповичи, ул. Проектируемая, д. 14 | 3 300,00 | 330,00 | 165,00 |
| 2 | Кран козловой эл. г/п 10 тн, инв. № 70021127 | | 12 500,00 | 1250,00 | 625,00 |
| 3 | Кранбалка груз. 3,2 L 22,5 м, инв. № 70021132 | | 3 900,00 | 390,00 | 195,00 |
| 4 | Кран-балка подв. г/п 3 т L 22,5 м, инв. № 70021136 | | 4 100,00 | 410,00 | 205,00 |
| 5 | Кран-балка подв. г/п 3 тн L22,5 м, инв. № 70021124 | | 3 700,00 | 370,00 | 185,00 |

В отношении имущества проводятся первые торги. Окончание приема заявлений в 18.00 07.10.2019

УСЛОВИЯ

Победитель аукциона либо в случае, если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в аукционе подано единственным участником, либо единственный участник явился для участия в аукционе и он согласен приобрести Объект (Объекты) по начальной цене, увеличенной на 5 % (пять процентов), – Претендент на покупку должен заключить с Продавцом договор купли-продажи Объекта (Объектов) после возмещения затрат на организацию и проведение аукциона, затрат на публикацию в течение 14 (четырнадцати) дней со дня проведения аукциона.

Оплата приобретенного на аукционе Объекта (Объектов) производится в соответствии с договором купли-продажи, но не позднее 30 (тридцати) дней со дня проведения аукциона.

Победитель аукциона (Претендент на покупку) обязан возместить Организатору аукциона стоимость затрат на организацию и проведение открытого аукциона, а также затраты по размещению публикации в газете и на сайте bankrot.gov.by на основании счета-фактуры в течение 5 (пяти) дней со дня проведения аукциона.

На Претендента на покупку распространяются правила и условия, установленные законодательством Республики Беларусь для Победителя аукциона.

**Аукцион по лотам, указанным в Таблице № 1, состоится 23.09.2019 в 12.00 (регистрация участников с 11.50 до 12.00) по адресу: г. Минск, ул. Мележа, 1, оф. 1122.**

**Аукцион по лотам, указанным в Таблице № 2, состоится 09.10.2019 в 12:00 (регистрация участников с 11.50 до 12.00) по адресу: г. Минск, ул. Мележа, 1, оф. 1122.**

Порядок оформления участия в аукционе, критерии выявления победителя торгов и порядок оформления результатов торгов содержатся на сайте https://sites.google.com/site/pcjuristcom/torgi.

До подачи заявления необходимо внести задаток на р/с **BY36ALFA30122215570040270000** в Отделении «На Красной» ЗАО «Альфа-Банк», код банка ALFABY2X, УНП 192789344.

Получатель – ООО «Фрондера». Назначение платежа: задаток для участия в аукционе по продаже имущества РУП «Жилкоммунтехника» (Таблица № __, Лот №__), проводимом «__»____________2019 г.

Участник торгов, желающий участвовать в торгах по нескольким лотам, вносит задаток в размере, установленном для лота с наибольшей начальной ценой.

Заявления на участие и необходимые документы принимаются в рабочие дни с 10.00 до 18.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, 1, оф. 1121.

Все желающие могут предварительно ознакомиться с Объектами аукциона. Контактное лицо для осмотра Объектов: Чеслав, 8 (029) 275 60 59.

Дополнительная информация по предметам торгов: Погосова Анаида, 8 (029) 308 28 97, e-mail: a.a.pogosova@tut.by.

Организатор аукциона вправе после опубликования извещения о проведении аукциона отказаться от его проведения в любое время, но не позднее чем за пять дней до наступления даты его проведения.

Организация и проведение аукциона осуществляется на основании норм Закона Республики Беларусь от 13.07.2012 № 415-З «Об экономической несостоятельности (банкротстве)».

**Организатор аукциона – ООО «Фрондера»:**
**☎ 8 (029) 305 86 50**
**• e-mail: frondera@mail.ru**

---

**УП «Белконфискат»**
**обьявляет о проведении электронных торгов 26.09.2019 г. по продаже имущества, изъятого у Кулевской Е. И.**

Легковой джип «Nissan X-Trail», 2004 г. в., начальной стоимостью 7 300 рублей. На сайте Belkonfiskat.by размещена информация о лоте, порядке проведения торгов и участия в них. **Справки по тел.: 8 (017) 2269489, 8 (029) 7790809.**

УНН 190431606

---

## Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»

**извещает о повторном аукционе**

| |
|---|
| ЛОТ 1: капитальное строение, инв. № 420/С-28377 (назначение – здание специализированное розничной торговли, наименование – магазин), обшей площадью 234,4 кв. м, расположенное по адресу: г. Лида, ул. Чехова, 23 (доля в праве 49/117) |
| Лот № 1 расположен на земельном участке, кадастровый № 441300000005000522, площадью 0,0290 га (назначение – обслуживание магазина), расположенном по адресу: г. Лида, ул. Чехова, 23 (доля в праве 49/117) |
| Начальная цена продажи – 68 256 р. (шестьдесят восемь тысяч двести пятьдесят шесть рублей) с учетом НДС. Сумма задатка – 6 825 р. (шесть тысяч восемьсот двадцать пять рублей) |
| ОАО «Торгово-производственная фирма «Лида», 231300, г. Лида, ул. Кирова, 6, Тел. 8-0154-617-577, факс 8-0154-522-540 |
| Организатор торгов – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Гродно, ул. Врублевского, д. 3, каб. 209, тел.: 45-05-38, 41-98-32 |
| Условия проведения аукциона – возмещение победителем аукциона (лицом, приравненным к победителю аукциона) затрат Продавца на организацию и проведение аукциона, в том числе затрат по уплате вознаграждения организатору аукциона в размере 1,5 % от конечной цены продажи объекта. Условия оплаты – по договоренности сторон. Срок заключения договора купли-продажи – не позднее 20 рабочих дней с момента подписания протокола аукционных торгов |
| Номер р/с для перечисления задатка – BY44BLBB30120500833225001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, код банка BLBBBY2X, УНП 500833225 |
| **Аукцион состоится 19 сентября 2019 г. в 14.00 по адресу: Гродненская область, г. Гродно, ул. Врублевского, 3** |
| Порядок регистрации в качестве участника аукциона и правила проведения аукциона содержатся на сайте организатора аукциона http://grodnoino.by/aukcion/uchastniku. Объявление о проведении первого аукциона было размещено в газете «Звязда» от 17.07.2019 г. |
| **Заявления на участие принимаются по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 208, с 8.30 до 17.30 (понедельник – четверг) и с 8.30. до 16.30 (пятница). Обед с 12.30 до 13.18. Последний день приема заявлений – 17 сентября 2019 г. до 15.00** |
| Телефон для справок: 45-05-38 – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» http://grodnoino.by |

---

## ОБЪЯВЛЕНИЕ

**Открытое акционерное общество «Барановичское производственное хлопчатобумажное объединение» ищет потенциальных покупателей на приобретение через аукцион капитальных строений, находящихся в собственности ОАО «БПХО:**

– Здание компрессорной станции №1, расположенное по адресу: Брестская обл., г. Барановичи, ул. Фабричная, 13В/1, одноэтажное каркасное, стены кирпичные, общая площадь – 428,0 кв. м, размеры в плане – 36*12 (м), высота – 7 м, имеются все коммуникации.

– Здание компрессорной станции № 2, расположенное по адресу: Брестская обл., г. Барановичи, ул. Фабричная, 13В/2, каркасное, стены панельные, производственная часть одноэтажная, бытовая двухэтажная, общая площадь – 659,0 кв. м, размеры плане – 43*12 (м), высота – 7 м, имеются все коммуникации.

Общая оценочная стоимость двух зданий составляет 242 880,00 белорусских рублей с НДС (двести сорок две тысячи восемьсот восемьдесят рублей ноль копеек с НДС). Данные здания предлагаются к продаже одним лотом.

**Контактные телефоны: (8 0163) 47 75 78, 47 75 33, 64 05 19.**

УНП 200166488

---

## Результаты розыгрыша рекламной игры «Снова в лето с WDL Оптикой»

1. УП «ВДЛ», УНП 101532265, 220073, г. Минск, ул. Кальварийская, 25, пом. 419, св-во о регистрации № 101532265 выдано Минским Горисполкомом.
2. Рекламная игра «Снова в лето с WDL Оптикой».
3. Срок начала рекламной игры – 15 апреля 2019 года, срок окончания рекламной игры – 20 сентября 2019 года.
4. Свидетельство о государственной регистрации № 3516 от 04.04.2019 года.
5. Количество участников рекламной игры: 2594 участника.
6. Призовой фонд разыгран полностью.
7. ФИО победителей:

| № купона | ФИО | Приз |
|---|---|---|
| 06161 | Поборцева Ольга Алексеевна | Подарочный сертификат УП «ВДЛ» номиналом 50 руб. 00 коп. сроком действия 3 месяца с даты получения стоимостью 50 руб. |
| 01615 | Гернович Светлана Валерьевна | Подарочный сертификат УП «ВДЛ» номиналом 50 руб. 00 коп. сроком действия 3 месяца с даты получения стоимостью 50 руб. |
| 05406 | Шутова Ольга Константиновна | Подарочный сертификат УП «ВДЛ» номиналом 50 руб. 00 коп. сроком действия 3 месяца с даты получения стоимостью 50 руб. |
| 04115 | Красноносов Артем Александрович | Подарочный сертификат УП «ВДЛ» номиналом 50 руб. 00 коп. сроком действия 3 месяца с даты получения стоимостью 50 руб. |
| 02171 | Шпиленок Ева Михайловна | Подарочный сертификат УП «ВДЛ» номиналом 50 руб. 00 коп. сроком действия 3 месяца с даты получения стоимостью 50 руб. |
| 08816 | Зубарь Ирина Викторовна | Подарочный сертификат УП «ВДЛ» номиналом 100 руб. 00 коп. сроком действия 3 месяца с даты получения стоимостью 100 руб. |
| 01908 | Шевченко Игорь Юрьевич | Подарочный сертификат УП «ВДЛ» номиналом 100 руб. 00 коп. сроком действия 3 месяца с даты получения стоимостью 100 руб. |
| 07197 | Демешко Людмила Алексеевна | Подарочный сертификат УП «ВДЛ» номиналом 100 руб. 00 коп. сроком действия 3 месяца с даты получения стоимостью 100 руб. |
| 05646 | Никитенко Ольга Ивановна | Подарочный сертификат УП «ВДЛ» номиналом 200 руб. 00 коп. сроком действия 3 месяца с даты получения стоимостью 200 руб. + денежные средства для оплаты подоходного налога в размере 10,31 руб. |
| 02671 | Титковский Сергей Владимирович | Подарочный сертификат УП «ВДЛ» номиналом 200 руб. 00 коп. сроком действия 3 месяца с даты получения стоимостью 200 руб. + денежные средства для оплаты подоходного налога в размере 10,31 руб. |
| 01876 | Шкловчик Дарья Леонидовна | Подарочный сертификат УП «ВДЛ» номиналом 500 руб. 00 коп. сроком действия 3 месяца с даты получения стоимостью 500 руб. + денежные средства для оплаты подоходного налога в размере 55,14 руб. |
| 08247 | Герасимова Людмила Николаевна | Туристическое путешествие в Турцию на 7 дней на двоих стоимостью 3167,00 руб. + денежные средства для оплаты подоходного налога в размере 453,66 руб. |

**8. Телефон для справок по вопросам проведения рекламной игры +375 (44) 709-95-57.**

**Поздравляем победителей и благодарим всех принявших участие в рекламной игре**

# Усходні гараскоп на наступны тыдзень

**АВЕН.** На гэтым тыдні любая праява арыгінальнасці з вашага боку будзе ўспрымаццаневакольнымі неадназначна. У сераду вы бліскуча прадэманструеце прафесіяналізм. У вас атрымаецца выцягнуць нават безнадзейныя, з пункту гледжання калег па рабоце, праекты, выклікаўшы навокал шэпт захаплення і здзіўлення. У выхадныя дні варта заняцца добраўпарадкаваннем кватэры або дачы.

**ЦЯЛЕЦ.** На рабоце справы будуць прасоўвацца паспяхова, але не парушыце ўсё паспяховасцю або раздражняльнасцю. Вы шмат можаце паспець, было б жаданне. Сваю энергію накіруйце на новыя праекты і атрыманне дадатковых ведаў. Вучыцеся слухаць, чуць і чытаць паміж радкоў і атрымаеце інфармацыю, якая дазволіць змяніць успрыманне свету.

**БЛІЗНЯТЫ.** Тыдзень спрыяльны ў многіх кірунках, пачынаюць рэалізоўвацца вашы запаветныя планы і задумы. Значныя перамены, якія адбудуцца з вамі, павінны паўплываць на ваша жыццё на доўгія месяцы наперад. Да серады вы набераце добры працоўны тэмп — паспрабуйце не збівацца з яго як мага даўжэй. Гэта абяцае прыбытак. Самы час заняцца справай, якая даўно адкладалася. Бліжэй да выхадных парадуе кожны чалавек.

**РАК.** Тыдзень будзе працякаць без асаблівых узрушэнняў. Спрыяльны час для прадуктыўнай працы і дзелавых сустрэч. Ідэі, якія прыйшлі вам у галаву, могуць стаць пачаткам сапраўды грандыёзных здзяйсненняў у будучым. У чацвер не варта ставіць на карту ўсё, што ў вас ёсць, нават калі раптам здасца, што надышоў час перамен. Звярніце ўвагу на падзеі, якія адбудуцца ў нядзелю: яны не выпадковыя.

**ЛЕЎ.** Навакольныя пачнуць разумець, чаго вы на самай справе вартыя. Не расчаруйце іх, выявіце свае схаваныя таленты. Асабліва напружанымі могуць стаць панядзелак і чацвер. У гэтыя дні пажадана праяўляць асцярожнасць ва ўсіх справах. У аўторак могуць адбыцца доўгачаканыя прыемныя падзеі. Выхадныя дні прысвяціце хатнім справам.

**ДЗЕВА.** Вашы жаданні і задумы будуць выконвацца ў той меры, у якой яны шчырыя і не супярэчаць інтарэсам іншых людзей. Паспрабуйце не панікаваць, і своечасова выпраўляць дапушчаныя памылкі. Не варта раздражняцца па дробязях і звяртаць увагу на недарэчныя заўвагі. Змяніце гнеў на міласць ды больш канструктыўна падыдзіце да вырашэння наспелых праблем. Пажадана не слухаць плётак і не ўдзельнічаць у інтрыгах.

**ШАЛІ.** Груз незавершаных спраў на гэтым тыдні будзе даволі цяжкі. Нямала сіл можа спатрэбіцца, каб урэгуляваць хоць частку надзённых праблем. Не варта засмучацца, калі ў пачатку тыдня давядзецца сутыкнуцца з пэўнымі перашкодамі ў асабістай або прафесійнай сферы. Бліжэй да выхадных магчымыя перамены, якія пойдуць вам на карысць. Удзяліце дзецям больш часу, ім неабходна ваша ўвага.

**СКАРПІЁН.** Гэта тыдзень камфортнага жыцця. Паспрабуйце ўдзяліць больш увагі сабе і свайму любімаму чалавеку. Надыходзіць перыяд змены светаадчування, магчымая пераацэнка духоўных каштоўнасцяў, якая адаб'ецца на вашым лёсе. Не падпускайце да сябе роспач, дзяліцеся пазітывам і энергіяй — вельмі хутка вас чакаюць вялікая радасць і адчувальны прыбытак.

**СТРАЛЕЦ.** Давядзецца шмат часу прысвяціць рабоце, цяпер не час ленавацца і пазбягаць адказнасці. Пажынаючы плады сваёй працы, паспрабуйце не расслабляцца, інакш вашы планы акажуцца пабудаванымі на пяску. Праявіце цярпенне і паспрабуйце не спрачацца з начальствам, ад гэтага вы толькі выйграеце. У чацвер, перш чым прыняць новую прапанову, пераканайцеся, што гэта не падман. Палепшацца адносіны ў сям'і.

**КАЗЯРОГ.** Выдатны тыдзень для смелых і энергічных дзеянняў, а вось таптацца на месцы не варта. Цяпер спрыяльнае становішча для творчых дасягненняў у прафесійнай сферы. Не давядзецца асабліва задумвацца над тым, што рабіць і як сябе паводзіць, — вы выдатна ўсё ведаеце. Трэба скласці план на дзень і ўсё запісаць, бо ў сераду ёсць рызыка забыць штосьці важнае. У выхадныя дні магчымыя цікавыя знаёмствы, зоркі не раяць праводзіць гэты час у адзіноце.

**ВАДАЛІЎ.** Пабераджыце свае сілы, дайце навакольным самім вырашыць свае праблемы. Магчымыя змены планаў і зрыў дамоўленасцяў, што пацягне дадатковыя клопаты. Праекты, якія былі прыпынены, пачнуць паступова развівацца. У пятніцу ў справах будзе спадарожнічаць поспех, намаганні прынясуць вынікі. У нядзелю магчымыя канфлікты на бытавой глебе, паспрабуйце не выплюхваць эмоцыі, трымайце іх пад кантролем.

**РЫБЫ.** Падумайце пра сябе. У вас быццам нямала спраў і нявырашаных праблем, якія адкладаць ужо нельга. Але не спрабуйце зрабіць усё адразу, пачынайце з самага галоўнага. Сябры дапамогуць пераадолець многія цяжкасці. У рабоце вызначаюцца новыя цікавыя перспектывы, не ўпусціце шанц. Ваша асноўная задача на гэтым тыдні — апынуцца ў патрэбны час у патрэбным месцы.

# СЁННЯ

## Сонца

| | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 6.26 | 19.49 | 13.23 |
| Віцебск — | 6.13 | 19.41 | 13.28 |
| Магілёў — | 6.16 | 19.39 | 13.23 |
| Гомель — | 6.15 | 19.34 | 13.19 |
| Гродна — | 6.41 | 20.04 | 13.23 |
| Брэст — | 6.44 | 20.02 | 13.18 |

## Месяц

*Першая квадра ў 6.10.*
*Месяц у сузор'і Стральца.*

## Імяніны

***Пр.** Калініка, Мікалая, Паўла, Яфрэма.*
***К.** Дароты, Ваўжынца, Лаўрэна, Станіслава, Тодара.*



Фота Ліны МАЛІНІНАЙ.

# ЗАЎТРА




## Даты | Падзеі | Людзі

### 6 ВЕРАСНЯ

У краіне

**1563** год — 4—6 верасня з Брэсцкай друкарні выйшла Біблія, у якой былі змешчаны ўсе тэксты Старога і Новага запаветаў. Лічыцца адным з самых поўных і лепшых выданняў таго часу; вядомая як «Брэсцкая Біблія» ці «Радзівілаўская Біблія». Гэтая вялікая і багата аформленая беларуская друкаваная кніга XVI стагоддзя. У пераплёце са скуры, з цудоўнымі ілюстрацыямі і прадметным паказальнікам, што было ўпершыню ў беларускім кнігадрукаванні. Лёс Бібліі аказаўся трагічным. Пасля смерці Радзівіла Чорнага яго сын, Мікалай Радзівіл Сіротка, пасля пераходу ў каталіцтва патрацiў 5000 злотых для выкупу і публічнага спалення ўсіх экземпляраў Брэсцкай Бібліі, што і было зроблена ў двары Нясвіжскага замка. Да нашага часу дайшло толькі некалькі асобнікаў.

**1934** год — нарадзіўся (вёска Багушэвічы Бярэзінскага раёна) Валянцін Белахвосцік, беларускі акцёр, народны артыст Беларусі. Служыў у Нацыянальным акадэмічным тэатры імя Я. Купалы. Яго творчай манеры былі ўласцівы спалучэнне жыццёвай дакладнасці з яркім тэмпераментам, багатая галасавая гама, пластычнасць і ўменне адцяніць у вобразе нюансы ўнутраных перажыванняў. Больш за сорак фільмаў з удзелам артыста зняты на студыях «Беларусьфільм», імя А. Даўжэнкі, імя М. Горкага, «Масфільм» і «Ленфільм». Сярод найлепшых фільмаў — «Аптымістычная трагедыя», «Воўчая зграя», «Трэцяга не дадзена» і іншыя. Выступаў у тэле- і радыёпастаноўках. Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі. Памёр у 2003 годзе.



**1954** год — у Мінску на базе аддзялення Беларускага політэхнічнага інстытута заснаваны Беларускі інстытут механізацыі сельскай гаспадаркі (з 1992 года —Беларускі аграрны тэхнічны ўніверсітэт).

**1959** год — пачаў сваю гісторыю Мінскі завод халадзільнікаў, вядомы сёння як вытворчае аб'яднанне «Атлант». У 1962 годзе выпушчаны першы халадзільнік ХКС-125 «Мінск-І». У 1973-м — халадзільнікам прадпрыемства «Мінск-5» і «Мінск-6» прысвоены дзяржаўны Знак якасці. Халадзільнікі МЗХ экспартаваліся ў Грэцыю, Францыю, Англію, Італію, Бельгію, ФРГ, Аўстралію. У 1977 годзе створана вытворчае аб'яднанне «Атлант», у склад якога ўвайшлі Мінскі, Смаленскі, Алітускі заводы халадзільнікаў і Мажэйкяйскі завод кампрэсараў. У пачатку 1990-х гадоў, пасля распаду СССР, прадпрыемствы, якія ўваходзілі ў склад ВА «Атлант», сталі працаваць самастойна.

У свеце

**2000** год — у Арганізацыі Аб'яднаных Нацый (Нью-Ёрк) прайшоў «Саміт тысячагоддзя» кіраўнікоў дзяржаў — членаў ААН — самая вялікая сустрэча нацыянальных лідараў у гісторыі чалавецтва, на якой былі вызначаны мэты на наступныя 20 гадоў.

## УСМІХНЕМСЯ

**Найлепшыя рэчы пачынаюцца на літару П:**
**пельмені,**
**піва,**
**пятніца.**

— У Старажытным Рыме некаторым рабам дазвалялася мець сваіх рабоў.
— Цяпер гэта называецца менеджар сярэдняга звяна.

**Учора ў рэстаране замовіў пасту «Фарфеле» ў сметанковым соусе з ласосем.**
**Такога дарагога «Ролтана» я яшчэ не еў.**

На сумоўі:
— Як бы вы адмовілі сабе ў прыёме на работу, калі б былі на маім месцы?




caricatura.ru

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА
ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь
РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.
Дырэктар — галоўны рэдактар СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.
РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: В. АНУФРЫЕВА (намеснік галоўнага рэдактара), Н. ДРЫНДРОЖЫК, Н. КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. ЛЯЎКОВІЧ (першы намеснік дырэктара), М. ЛІТВІНАЎ (намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК.
Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».
НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.
ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, маркетынгу — 337 44 04, бухгалтэрыі: 287 18 81.
Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.
http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zviazda.by,
(для зваротаў): zvarot@zviazda.by
ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zviazda.by
Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.
Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.
Тыраж 14.804. Індэкс 63850. Зак. № 3122.
Нумар падпісаны ў 19.30 5 верасня 2019 года.
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

# МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

6 верасня 2019 г. № 36 (521)

Штотыднёвы дадатак газеты ЗВЯЗДА

ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ


ТЭМА ТЫДНЯ



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

# НЕ РЭЧЫ, А ЖЫВЫЯ ІСТОТЫ

**Пра дабрабыт грамадства можна меркаваць па тым, як у ім ставяцца да жывёл. Паколькі ў нас дастаткова часта з'яўляюцца навіны аб прыцягненні да адказнасці за жорсткае абыходжанне з жывёламі, на вуліцы вялікіх і малых гарадоў выкідваюць скрынкі са шчанюкамі, а ў вёсках рэгулююць колькасць жывёл шляхам іх утаплення і закопвання, то можна меркаваць, што ў соцыуме шмат жорсткасці і безадказнасці.**

## Каго павінен абараняць закон?

Цяпер пытанні ўтрымання жывёл у нашай краіне рэгулююцца «Правіламі ўтрымання хатніх сабак, катоў, а таксама адлову безнаглядных жывёл у населеных пунктах Рэспублікі Беларусь», а таксама шэрагам іншых дакументаў не самага высокага статусу.

«Закон заўсёды нясе выхаваўчую функцыю. Грамадзяне абавязаны паважаць перш за ўсё закон. Менавіта ён легітымуе ў грамадскай свядомасці любыя правілы і пастановы. Укараніць у свядомасць абывацеля неабходнасць, напрыклад, стэрылізацыі і чыпавання значна лягчэй праз паважаны большасцю насельніцтва дакумент, — піша **каардынатар грамадзянскай ініцыятывы «Мы з табой у адным доме» Вольга МАЁРАВА** на сваёй старонцы ў Facebook. — Само слова «закон» мае значна большую вагу, чым «пастанова» або «правіла».

стар. 15

БЛІЗКАЯ ЎЛАДА

**Наталля ЯКУБІЦКАЯ:**

# «У рабоце з людзьмі імкнуся да таго, каб вынік быў»

**Тэлефонны званок на прамую лінію стаў ужо звыклай магчымасцю ўзняць набалелыя праблемы перад вышэйшымі інстанцыямі для любога жыхара самага аддаленага ад цэнтра раёна. Для прадстаўнікоў улады гэта самая аператыўная форма работы з насельніцтвам. Пра тое, наколькі давяраюць людзі таму ці іншаму чыноўніку, красамоўна сведчаць тэматыка і ўзровень узнятых людзьмі пытанняў. У мінулую суботу, 31 жніўня, дыялог з насельніцтвам вяла старшыня Мінскага абласнога Савета дэпутатаў Наталля ЯКУБІЦКАЯ. Пра вынікі праведзенай прамой лініі і пра штодзённыя клопаты кіраўніка — у інтэрв'ю «МС».**

## Чалавеку важна, каб яго пачулі

***— Алё, гэта прамая лінія? Турбуе Курдзюк Міхаіл Уладзіміравіч са Слуцка, інвалід першай групы. Вось усе кажуць пра безбар'ернае асяроддзе для людзей з абмежаванымі магчымасцямі, а ў нашым доме няма пандуса.***

З далейшай размовы з жыхаром Слуцка высвятляецца, што ён не адзін такі жыхар у шматкватэрным доме, для якога любое перамяшчэнне за межы свайго жылля робіцца праблемай. У гэтым жа пад'ездзе пражывае дзяўчынка 14 гадоў з інваліднасцю.

Высветліўшы ўсе дэталі, Наталля Якубіцкая тут жа звязваецца са старшынёй Слуцкага райвыканкама Андрэем Янчэўскім. Вынікам размовы стала ўключэнне дома, у якім пражываюць два інваліды-калясачнікі, у спіс па аператыўным фінансаванні мерапрыемстваў па стварэнні безбар'ернага асяроддзя.

стар. 3

## СЁННЯ Ў НУМАРЫ


### Дарожныя карты для парламентаў



Шляхі далейшага супрацоўніцтва з Міжпарламенцкім саюзам. стар. 2

### Камісіі сфарміраваныя



Ініцыятыўныя групы можна рэгістраваць. стар. 3

### Хто ў хатцы жыве?



Катоў таксама трэба рэгістраваць. стар. 13

### Эпідэмія антыгуманізму



У лес – з гадаванцам, назад – без яго. стар. 14

### Сумнік – гэта сумна



Таму што ён пагражае традыцыйным відам раслін і жывёл. стар. 16

НА ПАРАДКУ ДНЯ

# ДАРОЖНЫЯ КАРТЫ ДЛЯ НАЦЫЯНАЛЬНЫХ ПАРЛАМЕНТАЎ

## Спікеры дзвюх палат беларускага парламента абмеркавалі са старшынёй Міжпарламенцкага саюза шляхі далейшага супрацоўніцтва

**НА працягу двух дзён кіраўнік Міжпарламенцкага саюза Гарыэла Куэвас Баран знаходзілася ў беларускай сталіцы. Яна прымала ўдзел у міжнароднай канферэнцыі высокага ўзроўню пад агульнай назвай «Барацьба з тэрарызмам пры дапамозе інавацыйных падыходаў і выкарыстання новых і ўзнікаючых тэхналогій». У рамках гэтага візіту адбылася і сустрэча са старшынямі верхняй і ніжняй палат беларускага парламента — Міхаілам Мясніковічам і Уладзімірам Андрэйчанкам, якая прайшла ў Савеце Рэспублікі ў аўторак, 3 верасня. У мерапрыемстве таксама ўдзельнічалі старшыні пастаянных профільных камісій Савета Рэспублікі і Палаты прадстаўнікоў — Сяргей Рахманаў і Валерый Варанецкі.**



Фота БелТА.

### Аб'яднаць намаганні

— Вельмі сімвалічна, што ваш візіт у нашу краіну адбываецца ў 130-гадовы юбілей заснавання Міжпарламенцкага саюза, — падкрэсліў Міхаіл Мясніковіч, вітаючы госцю. Ён звярнуў увагу на смелае і цікавае выступленне кіраўніка гэтай арганізацыі на міжнароднай канферэнцыі, прысвечанай барацьбе з тэрарызмам. «У прынцыпе, вашае ўступнае слова генерыравала цікавыя думкі, на мой погляд, выступоўцаў і экспертаў, — падкрэсліў ён. — Надзвычай цікавая тэма, і я хацеў бы яшчэ раз звярнуць увагу на ключавыя тэзісы выступлення Прэзідэнта нашай краіны, які адзначыў, што вялікія дзяржавы і палітыкі павінны сур'ёзна заняцца вырашэннем пытанняў у барацьбе з тэрарызмам, асабліва ў сучасных яго формах».

У гэтай сувязі асаблівая роля аддаецца парламентарыям. На думку спікера верхняй палаты беларускага парламента, роля Міжпарламенцкага саюза (далей — МПС), парламентарызму ў цэлым, вельмі важная і можа мабілізаваць намаганні ўсіх краін у вырашэнні гэтых актуальных задач.

Што датычыцца работы беларускага парламента, як адзначыў Міхаіл Мясніковіч, разам з калегам з ніжняй палаты вядзецца работа над актуальнымі пытаннямі Парадку дня — 2030 па дасягненні Мэт устойлівага развіцця і наогул усіх ініцыятыў, якія зыходзяць у тым ліку ад МПС і ААН. У гэтай сувязі старшыня Савета Рэспублікі выказаў прапанову аб актывізацыі работы МПС з Міжпарламенцкай асамблеяй краін СНД і асабіста яе старшынёй — Валянцінай Мацвіенка (спікерам Савета Федэрацыі Федэральнага сходу РФ. — **«МС»**).

— Я кажу аб гэтым, таму што мы дастаткова актыўна працуем у рамках Міжпарламенцкай асамблеі краін СНД. Мне ўяўляецца, што два такія вялікія кансорцыумы маглі б супрацоўнічаць больш актыўна, — выказаў упэўненасць ён і пацікавіўся думкай на гэты конт Габрыэлы Куэвас Баран.

Другое пытанне, на якім Міхаіл Мясніковіч засяродзіў увагу госці, датычылася нейкага большага ўплыву з боку МПС на працэсы, што адбываюцца ў свеце, павышэння ролі гэтай арганізацыі.

— Зразумела, што прымаемыя рашэнні не з'яўляюцца абавязковымі для нацыянальных парламентаў, але могуць быць дакументы другога ўзроўню, своеасаблівыя дарожныя карты, якія матывавалі б нацыянальныя парламенты прымаць уласныя рашэнні на аснове дакументаў МПС, — адзначыў ён.

### Агульны інтарэс

Старшыня Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі Уладзімір Андрэйчанка, у сваю чаргу, адзначыў, што беларускія дэпутаты вельмі высока ацэньваюць супрацоўніцтва з МПС, прымаюць удзел практычна ва ўсіх асамблеях, сусветных сустрэчах спікераў парламентаў, што праходзяць па ініцыятыве гэтай арганізацыі, якая з'яўляецца адной з найстарэйшых уплывовых няўрадавых у свеце і адыгрывае вельмі важную ролю ў развіцці парламентарызму.

— Мы вельмі ўважліва сочым за тэматычнымі публікацыямі, што выдае МПС, у якіх прыводзіцца параўнальны аналіз работы парламентаў. Я хачу сказаць, што многія рэкамендацыі маюць істотны інтарэс і для беларускага парламентарызму, — адзначыў ён.

Спікер ніжняй палаты звярнуў увагу на такую форму ўзаемадзеяння, што ўяўляе вялікую цікавасць, як сусветная канферэнцыя спікераў парламентаў. Дарэчы, такія сустрэчы праходзілі па ініцыятыве МПС ужо чатыры разы, у дзвюх з якіх — у Жэневе і Нью-Ёрку — прымаў удзел і Уладзімір Андрэйчанка.

— Я хачу сказаць, што гэта — вельмі знакавыя падзеі, якія дазваляюць умацаваць супрацоўніцтва паміж арганізацыямі аб'яднаных нацый і нацыянальнымі парламентамі, і я лічу, гэта вельмі значным, — упэўнены спікер.

Ён падкрэсліў, што беларускія парламентарыі зацікаўлены ў развіцці адносін з МПС, і, на яго думку, бакі павінны сканцэнтраваць асноўную ўвагу на рашэнні адной з галоўных задач гэтай міжнароднай арганізацыі — збліжэнні парламентаў у справе ўмацавання міру і бяспекі ў свеце.

### Павысіць ролю МПС

Са свайго боку генеральны сакратар МПС Габрыэла Куэвас Баран падзякавала за падтрымку з боку Беларусі падчас выбараў на гэтую пасаду, якія праводзіліся на 137-й Міжпарламенцкай асамблеі ў Санкт-Пецярбургу два гады таму. «Гэта быў вельмі важны момант для мяне, які змяніў маё жыццё», — прыгадала яна.

Адной з галоўных задач арганізацыі на гэты момант яна вызначыла пашырэнне прадстаўніцтва МПС у пасяджэннях і канферэнцыях высокага ўзроўню, такіх, напрыклад, што адбыліся ў Мінску.

— Прэзідэнт вашай краіны Аляксандр Лукашэнка ў сваім выступленні зрабіў вельмі важную заяву, асабліва мне спадабалася фраза наконт таго, што ў нас адна планета і мы павінны з ёй разабрацца, — падкрэсліла яна. — Я лічу, што Міжпарламенцкаму саюзу і аддаецца такая важная роля, бо, у першую чаргу, мы з'яўляемся заканадаўчым органам, а ў другую — плануем бюджэт. Такім чынам, мы знаходзімся ў цэнтры вырашэння канфлікту ці праблем, якія ўзнікаюць.

Аднак, на яе думку, МПС, як і любая іншая міжнародная арганізацыя, будзе настолькі моцнай, наколькі гэтага жадаюць яе ўдзельнікі, таму як і любую іншую арганізацыю, міжпарламенцкі саюз неабходна ўмацоўваць.

Што датычыцца прапановы Міхаіла Мясніковіча аб наладжванні сувязяў з Міжпарламенцкай асамблеяй краін СНД, старшыня МПС адзначыла: Валянціна Мацвіенка з'яўляецца вельмі важным і кваліфікаваным кіраўніком, што сочыць за ўсімі падзеямі, ініцыятывамі, якія сыходзяць з боку Міжпарламенцкага саюза, і дастаткова добрая сувязь паміж дзвюма арганізацыямі ўжо існуе.

— Я лічу, што ў дадатак да гэтай прапановы вельмі важнае значэнне мае прапанова па наладжванні шляхоў супрацоўніцтва еўразійскіх краін з нашай арганізацыяй, каб яны былі больш уцягнутыя ў нашу штодзённую дзейнасць, — падкрэсліла яна.

Адказваючы на другую частку пытання, якое агучыў на сустрэчы Міхаіл Мясніковіч, генсек МПС адзначыла:

— Канешне ж, МПС з'яўляецца важнай арганізацыяй. Мы ўвесь час прымаем рашэнні, рэзалюцыі, робім публікацыі, як вы справядліва адзначылі, нам неабходна рухацца ў кірунку распрацоўкі дарожных картаў, якія сталі б пакрокавай інструкцыяй да таго, як неабходна выкарыстоўваць міжнародныя дагаворы і інструменты на мясцовых узроўнях.

**Вольга АНУФРЫЕВА.**

### У тэму

**Сяргей РАХМАНАЎ, старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па міжнародных справах і нацыянальнай бяспецы:**

— Вельмі важна, што парламентарыі адыгрываюць важную ролю ў вырашэнні ключавых сусветных праблем. Іх роля ўзрастае, паколькі жыццё паказвае, што лідары найбуйнейшых краін свету не спраўляюцца з тымі праблемамі, якія трэба вырашаць, і гэта прагучала ў выступленні нашага Прэзідэнта. Таму неабходна аб'яднаць усю моц разам, у тым ліку невялікім і сярэднім краінам, да якіх адносіцца Беларусь, і, адпаведна, не толькі выканаўчай, але і заканадаўчай улады, экспертнай і грамадзянскай супольнасцяў — мы павінны працаваць разам, таму што пагрозы, якія існуюць сёння ў свеце, вельмі сур'ёзныя, іх нельга недаацэньваць, і калі не будзе каардынацыі работы — не будзе поспеху.

БІБЛІЯТЭКА ДЭПУТАТА

# Дэпутацкі запыт як спосаб вырашэння праблемы

**«Нам, сельскім дэпутатам, даводзіцца сутыкацца з праблемамі, якія на мясцовым узроўні немагчыма вырашыць. Напрыклад, нізкая якасць пітной вады. Ведаю, што для дэпутатаў існуюць розныя рычагі ўздзеяння на сітуацыю, але, магчыма, дзесьці не вельмі эфектыўна імі карыстаюся. На жаль, вопыт дэпутацтва яшчэ вельмі малы. Магчыма, праз любімую газету мне падкажуць выйсце з праблемы».**

*Святлана С.*

**Дзмітрый ХАРЫТОНЧЫК, старшыня Магілёўскага аблсавета дэпутатаў:**

— Сапраўды, існуе шмат вельмі дзейсных рычагоў для ажыццяўлення дэпутатам сваіх паўнамоцтваў. Акцэнтуем увагу на некалькіх з іх. Гэта дэпутацкі запыт, дэпутацкі зварот і прапанова дэпутата аб ліквідацыі парушэння законнасці. Запыт робіцца з мэтай атрымаць афіцыйнае тлумачэнне па пытаннях, якія датычацца найбольш важных грамадскіх інтарэсаў на пэўнай адміністрацыйна-тэрытарыяльнай адзінцы. Звяртацца з ім можна ў адпаведныя мясцовыя выканаўчыя і распарадчыя органы, іх структурныя падраздзяленні, а таксама іншыя арганізацыі, якія размешчаны на падведамаснай Савету тэрыторыі. Ён абавязкова ўключаецца ў павестку і разглядаецца Саветам на сесіі ў парадку, які вызначаны рэгламентам. На сесіі дэпутат або сам агучвае гэтае пытанне, або па яго просьбе гэта робіць старшыня Савета. Мы ацэньваем, наколькі праблема сапраўды патрабуе высокага ўзроўню разгляду. У выпадку адабрэння падтрымліваем. Заяўнік атрымлівае вычарпальную інфармацыю ў дзесяцідзённы або іншы ўстаноўлены Саветам тэрмін. Адказ даецца ў пісьмовай форме і таксама агучваецца на сесіі. Заяўнік выказваецца, ці задаволены ён вынікамі. Да грамадзян ён можа давесці гэты адказ у тым ліку і праз сродкі масавай інфармацыі. Як паказвае практыка, з дэпутацкім запытам звяртаюцца, калі пытанне вельмі значнае — напрыклад, калі справа датычыцца дзяржпраграмы «Чыстая вада» ці ачышчальных збудаванняў, калі пытанне патрабуе адчувальнай працы і звязана з вялікай колькасцю людзей — будаўніцтва бальніцы, дзіцячага садка і гэтак далей.

На практыцы дэпутаты часцей абмяжоўваюцца дэпутацкім зваротам. Тэмы там не настолькі вострыя, каб разглядаць іх на сесіі. Тэрмін разгляду — дзесяць дзён або, калі спатрэбіцца значная прапрацоўка, да месяца.

Што датычыцца прапановы дэпутата аб ліквідацыі парушэння законнасці, то тут, спадзяюся, усё зразумела. Калі дэпутат бачыць парушэнне, ён уносіць прапанову па яго ліквідацыі, а кампетэнтныя органы павінны прарэагаваць і прыняць усе неабходныя меры па ўстанаўленні законнасці і правапарадку.

**Падрыхтавала Нэлі ЗІГУЛЯ.**

# «У рабоце з людзьмі імкнуся да таго, каб вынік быў»

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС».)*

***— Вялікая імавернасць, што пытанне па ўстаноўцы пандуса ў гэтым доме вырашыцца ў самы бліжэйшы час, ва ўсякім выпадку, мы будзем трымаць гэтае пытанне на кантролі, — паклаўшы трубку, кажа старшыня Мінскага абласнога Савета дэпутатаў.***

Усяго на суботнюю прамую лінію паспела звярнуцца 25 чалавек. Праблемы абмяркоўваліся розныя: ад узаемаадносін з аднавяскоўцамі і кіраўніцтвам прадпрыемстваў да трывожных сігналаў аб парушэннях. Тры тыдні жыхары Мар'інай Горкі жывуць без газу з-за капітальнага рамонту дамоў старой пабудовы. Пытанні водазабеспячэння і землекарыстання хвалююць жыхароў Дзяржынскага і Вілейскага раёнаў. На прадпрыемстве ЗАТ «Аэрамаш» Мінскага раёна затрымліваюць выплату заработнай платы, такая ж праблема і ў сістэме жыллёва-камунальнай гаспадаркі ў Калодзішчах.

— Па кожным званку аператыўна звязваюся з мясцовымі органамі ўлады і, у залежнасці ад іх кампетэнцыі, вяду дыялог з зацікаўленымі: ад старшынь раённай вертыкалі да старшынь сельскіх Саветаў, — кажа Наталля Віктараўна. — Галоўнае тут — не зацягваць з вырашэннем узнятых праблем. Трымаю на кантролі да самага іх вырашэння.

***— Вось людзі вам тэлефануюць з праблемамі і скаргамі. Вы гэта ацэньваеце як недапрацоўку мясцовых органаў улады ці як асаблівы давер да вас?***

— Мой абавязак — дапамагаць людзям. Калі ў іх ёсць нейкая праблема на



узроўні маёй кампетэнцыі і я яе магу вырашыць, вядома, абавязкова дапамагу. Не, гэта не недапрацоўка, гэта магчымасць нам пачуць людзей, іх чаканні і праблемы, і прымаць меры для іх вырашэння. А часам чалавеку важна, каб яго выслухалі і пачулі. Часта бывае, нічога яму ад нас не трэба. Ёсць і такія званкі. Можа быць, чалавеку проста трэба выгаварыцца. А я не толькі службовая асоба, але і проста жанчына, я гэта магу зразумець *(усміхаецца)*.

## Калі паабяцалі, то выканалі

***— Калі казаць пра работу з насельніцтвам у цэлым, якія пытанні вам даводзіцца вырашаць як старшыні Мінскага абласавета часцей за ўсё?***

— Даводзіцца вырашаць самыя розныя пытанні. Добраўпарадкаванне, напрыклад, навядзенне парадку на зямлі.

Цяпер у нас у Мінскай вобласці ідзе вельмі вялікая работа па вырашэнні праблемы састарэлага пустуючага жылля. Калі можам знайсці ўласніка недагледжанага дома, то знаходзім яго і супольна зносім трухлявае жыллё, наводзім парадак на ўчастку. Калі няма, то сітуацыя ўскладняецца: камісійна збіраем усе дакументы і ў судовым парадку гэты дом перадаём сельсавету, адміністрацыйна-тэрытарыяльнай адзінцы. І толькі пасля гэтага прымаем рашэнне ў дачыненні да такога дома.

Вельмі важна сёння навесці тут парадак, каб такіх вось кінутых дамоў было як мага менш. Папершае, зямля не павінна пуставаць, да таго ж такія будынкі небяспечныя з пункту гледжання супрацьпажарнай бяспекі — ёсць магчымасць пранікнення ў іх асацыяльных груп насельніцтва і г. д.

Дарэчы, на прамой лініі былі два такія пытанні. Давялося аператыўна правяраць, дзе гэтыя дамы знаходзяцца ў рэестры, цяпер ідзе высвятленне асобы ўласніка. З гэтымі пытаннямі мы працуем.

Вялікая работа праводзіцца і ў частцы нявыкарыстанай маёмасці, уласнікамі якой з'яўляюцца юрыдычныя асобы. Тут мясцовыя Саветы дэпутатаў не застаюцца ўбаку. Яны прымаюць удзел у інвентарызацыі нявыкарыстанай маёмасці і прадстаўляюць раённым выканаўчым камітэтам інфармацыю для далейшай работы з такімі аб'ектамі. Многія з іх выстаўляюцца на аўкцыёны. Бо вельмі важна цяпер эфектыўна ўцягнуць яшчэ нармальныя будынкі і збудаванні ў абарот, па магчымасці стварыць новыя рабочыя месцы. Таму прапануем іх прадстаўнікам малога бізнесу, прадаём з пэўнымі ўмовамі нават за адну базавую велічыню.

***— Ці ёсць праблемы, якія вы не можаце вырашыць аператыўна?***

— Гэта тыя пытанні, якія патрабуюць фінансавання. Напрыклад, маштабнае добраўпарадкаванне населеных пунктаў, укладка асфальту. Яны не вырашаюцца імгненна. Пры падрыхтоўцы адказу на такі зварот стараюся, каб нашы службы не ўводзілі людзей у зман, а казалі праўду: што з улікам фінансавання пытанне можа быць вырашана, напрыклад, не сёлета, а ў 2020 годзе. Каб людзі рэальна ўяўлялі сітуацыю і магчымасці мясцовых улад, а не спадзяваліся на цуд. А ў цэлым імкнуся да таго, каб вынік быў. Калі паабяцалі, то выканалі!

## Улічыць інтарэсы патэнцыйнага работніка

***— Чым кіруецеся ў рабоце з насельніцтвам?***

— Я цяпер у абавязковым парадку стараюся аператыўна наведаць усе рэгіёны, пабываць у як мага большай колькасці сельскіх Саветаў. Кожны раён мае свае асаблівасці, сваю непаўторнасць. Унікаю ў мясцовыя праблемы, недаробкі, якія ў нас магчымасці па фінансаванні. Тым больш што ў нас зараз ідзе фарміраванне бюджэту на наступны год. Вядома, самае важнае цяпер — зладжаная работа мясцовых вытворчасцяў, каб мы маглі забяспечыць людзей заработнай платай.

Без ілжывай сціпласці магу сказаць, што роля мясцовых Саветаў у жыцці рэгіёнаў вялізная. Мы сёння стараемся не толькі маштабна бачыць усе праблемы тэрытарыяльнага ўзроўню, але і ўнікаць у штодзённыя патрэбы мясцовага насельніцтва: ад насычэння таварамі гандлёвых аб'ектаў, якія знаходзяцца на тэрыторыі сельскіх Саветаў, і ўзроўню бытавога абслугоўвання да садзейнічання занятасці людзей. Вопыт работы камісій па садзейнічанні занятасці, якія ўзначальваюць сёння Саветы, паказаў, што нам шмат чаго ўдалося дасягнуць, немала людзей працаўладкавана, але і тут яшчэ многа трэба будзе зрабіць.

***— На прыкладзе Мінскай вобласці: што паказала практыка стварэння камісій па садзейнічанні занятасці?***

— У адпаведнасці з Дэкрэтам Прэзідэнта ў Мінскай вобласці былі створаны камісіі па садзейнічанні занятасці насельніцтва. Мы ўжо паспяхова працаўладкавалі больш за 10 тысяч чалавек. Імкнуліся падыходзіць індывідуальна да кожнага, хто звярнуўся з праблемай пошуку рабочага месца, зыходзячы з інтарэсаў не толькі працадаўца, але і будучага работніка. Мушу прызнацца, што задача гэта няпростая.

У сельскай мясцовасці, ды і ў раённых цэнтрах, заўсёды была праблема з працаўладкаваннем. Мы ўзаемадзейнічалі не толькі з тымі, хто сам да нас звяртаўся з праблемай знайсці прыдатную работу. Кагосьці запрашалі, давалі рэкамендацыі, прапаноўвалі прайсці перанавучанне. Цяпер для гэтага ёсць розныя перспектывы. Калі хтосьці жадае або бачыць сябе ў новай прафесіі, ёсць магчымасць накіраваць людзей на перападрыхтоўку — гэтыя формы таксама ў нас актыўна выкарыстоўваюцца. У камісіях ёсць поўны банк існуючых вакансій. На пасяджэнні камісій запрашаюцца кіраўнікі прадпрыемстваў, зацікаўленых у тым, каб знайсці для сябе новыя кадры. Проста на пасяджэнні камісіі часта і адбываецца знаёмства. Ад такой практыкі, бясспрэчна, маем станоўчы эфект.

***— Наталля Віктараўна, падагульняючы праведзеную размову з жыхарамі Мінскай вобласці, што можаце сказаць, ці была яна карысна вам як кіраўніку?***

— Канчатковы вынік нашай работы — стварэнне камфортных умоў для жыцця людзей. Мы і імкнёмся працаваць для таго, каб у нас як мага менш было болевых пунктаў і праблем. Для гэтага і праводзім прамыя лініі, каб быць на пастаяннай сувязі з людзьмі, каб пачуць іх праблемы і вырашаць іх. Што датычыцца мяне асабіста, то я даю чалавеку, які звярнуўся, свой тэлефон, мне можна тэлефанаваць не толькі на прамую лінію, але і на працягу дня.

Прынцып у мяне адзін: можаш нешта вырашыць? Дапамажы! Самае галоўнае ў нашай рабоце — гэта не быць абыякавым.

**Наталля БІТЭЛЬ.**

ВЫБАРЫ-2019

# КАМІСІІ СФАРМІРАВАНЫ, можна падаваць дакументы аб рэгістрацыі ініцыятыўных груп па зборы подпісаў за прэтэндэнтаў на дэпутацкія мандаты

**У Гомелі сфарміраваны склады абласной і акруговых выбарчых камісій па выбарах дэпутатаў у Палату прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь сёмага склікання. На сумесным пасяджэнні аблвыканкама і прэзідыума абласнога Савета дэпутатаў створана Гомельская абласная і 17 акруговых выбарчых камісій.**

На 13 месцаў у абласной выбарчай камісіі прэтэндавалі 20 чалавек. Кандыдатаў у іх склад актыўна вылучалі як палітычныя партыі і грамадскія аб'яднанні, так і працоўныя калектывы, а таксама грамадзяне шляхам збору подпісаў. Па выніках галасавання членаў аблвыканкама і прэзідыума аблсавета дэпутатаў абласная выбарчая камісія сфарміравана ў поўным складзе.

Вызначаны на пасяджэнні і склады акруговых камісій. На 221 месца заяўкі падалі 330 чалавек. Каля паловы вылучэнняў — ад грамадскіх аб'яднанняў, адзначае **начальнік галоўнага ўпраўлення арганізацыйна-кадравай работы Гомельскага аблвыканкама Дзмітрый РАЖКОЎ:**

— Практычна ўсе палітычныя партыі, грамадскія аб'яднанні, якія прадстаўлены ў нашай вобласці, прапанавалі сваіх прадстаўнікоў. Усё гэта дазволіла сфарміраваць камісіі ў максімальным па колькасці складзе — 13 чалавек. Упэўнены, што яны змогуць выканаць усе патрабаванні Выбарчага кодэкса і правесці выбарчую кампанію на высокім арганізацыйным узроўні.

Старшыні абласной і акруговай выбарчых камісій будуць выбраны шляхам галасавання на першых пасяджэннях. З трэцяга верасня прэтэндэнты на дэпутацкія мандаты падаюць дакументы аб рэгістрацыі ініцыятыўных груп па зборы подпісаў у іх падтрымку.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**

# ПАДАТАК «НА ХВОСТ»

## Дзе і колькі трэба плаціць за ўтрыманне хатняга гадаванца?

**Трэба сказаць, што кожная адміністрацыйна-тэрытарыяльная адзінка самастойна прымае рашэнне, колькі павінен плаціць уладальнік жывёлы ў мясцовы бюджэт. «МС» вырашыла параўнаць гэты лічбы. Цікава?**

Перш за ўсё адзначым, што пададак на ўтрыманне сабак (на катоў, дарэчы, яго няма) адносіцца да лакальных падаткаў. Гэта значыць, што ён зацвярджаецца на сесіях мясцовых Саветаў дэпутатаў і цалкам залічваецца ў бюджэт адміністрацыйна-тэрытарыяльнай адзінкі. Дарэчы, да такіх жа мясцовых бюджэтаў адносяцца курортны збор і падатак на нарыхтоўшчыкаў.

Мы зазірнулі ў юрыдычную базу і ўпэўніліся, што ў большасці выпадкаў (як і патрабуе глава 29 Падатковага кодэкса) падыход да налічэння гэтага падатку амаль аднолькавы ва ўсіх абласных цэнтрах, але ёсць і адрозненні. Так, напрыклад, у Віцебску, Гомелі, Магілёве і Брэсце народныя выбраннікі палічылі, што ўладальнікі павінны плаціць падатак у памеры 0,3 базавай велічыні (далей — БВ) у квартал за ўтрыманне свайго сабачкі. Сума павялічыцца да 1,5 БВ у тым выпадку, калі ў хаце жыве гадаванец патэнцыйна небяспечнай пароды. У сталіцы, дарэчы, гэтая сума складае базавую велічыню. А вось у Гродне падыход да налічэння падатку «на хвост» залежыць ад велічыні і пароды чатырохнога. Штомесяц за сабачку, які ў карку не дасягае вышыні 40 сантыметраў, давядзецца заплаціць 0,05 БВ, ад 40 да 70 сантыметраў — 0,1 БВ, а вышэй за гэты памер і таксама за патэнцыйна небяспечныя пароды — 0,2 БВ за кожны месяц падатковага перыяду.



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

### ЯК ПЛАЦІЦЬ?

Падатак налічваецца на гаспадароў сабак (колькасць апошніх неабмежаваная) і шчанюкоў, пачынаючы з трохмесячнага ўзросту. Сума налічваецца ў жыроўку і аплачваецца разам з камуналкай.

Між іншым, не за кожнага Шарыка давядзецца заплаціць яго гаспадару. Падатак «на хвост» не датычыцца, напрыклад, інвалідаў па зроку, для якіх утрыманне сабакі-павадыра з'яўляецца жыццёвай неабходнасцю; ветэранаў, інвалідаў і ўдзельнікаў Вялікай Айчыннай вайны. Таксама ад яго вызваленыя непрацуючыя пенсіянеры, інваліды першай і другой груп за аднаго сабаку, але пры ўмове, што разам з імі не зарэгістраваны працаздольныя члены сям'і.

А калі гэта звычайны двараvы вартаўнік, што жыве ў будцы? Яго гаспадары, якія жывуць у аднакватэрных і блакіраваных дамах, таксама вызвалены ад адпаведнага падатку. Галоўнае, каб сабака не выкарыстоўваўся ў прадпрымальніцкіх мэтах, інакш кажучы, не належаў заводчыку.

ЦІКАВЫ ВОПЫТ!

# Твой сабака — твая праблема?

## Дэпутаты ў Гродне ўзялі на сябе клопат па стварэнні адмысловай пляцоўкі для выгулу

**Тэма для кожнага горада актуальная. Пакуль такіх месцаў недастаткова. Напрыклад, у Гродне ўсяго пяць пляцовак для выгулу чатырохногіх сяброў. Жыхарам мікраараёна «Дзевятоўка» пашанцавала. Дэпутаты адгукнуліся на іх просьбу і арганізавалі фінансаванне такой пляцоўкі на мясцовай пустцы.**

### НЕДАЛЁКА ДА КАНФЛІКТУ

Здаецца, не такі гэта важны аб'ект — пляцоўка для выгулу сабак. Але насамрэч для тых,хто трымае жывёл, гэта сапраўдны рай.

— Да гаспадароў сабак ставяцца так: «Твой сабака — твая праблема», — кажа Аляксандр, які вёў на выгул свайго гадаванца. — І гэту праблему кожны вырашае па-свойму. Хтосьці ідзе гуляць чым далей, хтосьці ледзь не з суседняга квартала трымае жывёлу на доўгім павадку, а сабака мітусіцца паміж жыхарамі. Зразумела, што пра якасць такога выгулу казаць не выпадае.

Ды і да канфліктаў тут недалёка. Нядаўна адна такая сітуацыя нават атрымала рэзананс у СМІ. Суседзі, якія жывуць у цэнтральнай частцы горада, сур'ёзна пасварыліся з-за сабакі. Яго гаспадыню абвінавацілі ў нападзенні на дзіця, хоць факт у далейшым не пацвердзіўся. Між тым канфлікт доўгі час не заціхаў. Справа завяршылася тым, што на гаспадыню дварняка склалі пратакол за выгул на прыдамавой тэрыторыі. Цяпер там стаіць таблічка: «Выгул сабак забаронены».

Дарэчы, гаспадарам сабак у цэнтры горада сапраўды няпроста. Найбліжэйшае месца для выгулу знаходзіцца каля берага Нёмана, а гэта 1,5—2 кіламетры ад цэнтра. Зразумела, што сабака наўрад ці вытрымае такі працяглы шлях — звычайна яго хапае не больш чым на дзясяткі метраў. Адказныя гаспадары ведаюць такую сітуацыю і прыбіраюць за сваім гадаванцам. Вядома, многія хацелі б мець непадалёк спецыялізаваную пляцоўку, але, як аказалася, у цэнтры горада абсталяваць такі аб'ект проста немагчыма — вельмі шчыльная забудова.

### КАЛІ ЖЫХАРЫ АБУРАЮЦЦА

А вось у жыхароў новага мікраараёна Альшанка іншая праблема. Пляцоўкі тут якраз ёсць, і нават дзве. Але далёка не ўсе гаспадары сабак карыстаюцца імі. Многія выгульваюць сваіх чатырохногіх сяброў у самых ажыўленых месцах. Гэта можа пагражаць не толькі санітарнаму стану наваколля, але і бяспецы жыхароў. Менавіта такі выпадак нядаўна ўзрушыў увесь горад. Байцоўскі сабака ў мікраараёне Альшанка пакусаў дваіх дзяцей: адзін раз каля дома, другі — у кавярні. Прычым у абодвух выпадках у прысутнасці гаспадароў. Справа атрымала рэзананс і выклікала абурэнне жыхароў мікраараёна, яны сабралі подпісы, каб ізаляваць стафаршырскага тэр'ера ад грамадства. У рэшце рэшт сабаку ўсыпілі.

Дарэчы, колькасць прыцягнутых да адказнасці за парушэнне правіл выгулу невысокая. Летась такіх пратаколаў было каля дзесяці, сёлета ўсяго некалькі. Звычайна парушальнікі атрымліваюць заўвагі ад камунальных службаў. Хоць па законе работнікі ЖЭСаў маюць права аштрафаваць на суму да чатырох базавых велічынь, што складае 102 рублі.

### ДАПАМАГЛІ ДЭПУТАТЫ

Усяго ў горадзе абсталявана пяць пляцовак для выгулу. Ёсць некалькі стыхійных месцаў, дзе выгул не забаронены, але яны не агароджаны і няма інфраструктуры.

Жыхарам Дзевятоўкі, можна сказаць, пашанцавала. Нядаўна яны атрымалі для сваіх чатырохногіх гадаванцаў камфортнае месца для выгулаў і трэніровак. Напрыклад, Аляксандр прыходзіць са сваім Рамонам рэгулярна. Раней вадзіў на выгул толькі на павадку, бо сабака малады і можа папросту збегчы і заблукаць. Цяпер рызеншнаўцэр радасна бегае на пляцоўцы і не дастаўляе клопатаў свайму гаспадару.

Былі праблемы з выгулам і ў Юліі. Яна расказала, што хадзіла на шпацыр у прыватны сектар непадалёк. Але мясцовым жыхарам не падабалася, што сабакі бегаюць па наваколлі, нават міліцыю выклікалі. Цяпер такіх праблем не ўзнікае. Бо тут жывёлы могуць бегаць без павадкоў, для іх усталяваны спецыяльныя трэнажоры — сценка, бервяно, лесвіца. Для гаспадароў — акуратныя лаўкі. Ёсць металічныя кантэйнеры для смецця. Пляцоўка абнесена металічнай сеткай, і не абы-як, а з роўнымі слупкамі. Для сабак зроблена паілка, на мясцовай запраўцы дазволілі браць ваду для гэтых мэт. Усе элементы пафарбаваны ў спакойны шэра-блакітны колер. Пляцоўку без перабольшвання можна назваць узорнай. У горадзе яна самая абсталяваная.



— Усё пачалося з ініцыятывы саміх жыхароў, якія звярнуліся ў гарадскі Савет дэпутатаў, — расказала **дэпутат Алена ПАТАПАВА.** — Да справы далучыліся прадпрыемствы, у прыватнасці, фірма «ЗОЎ» узяла на сябе закупку сеткі, на гэта пайшло 2,5 тысячы рублёў. Дэпутат Дзяніс Сырамаха дапамог з фарбай. Праблему з драўлянымі канструкцыямі для трэнажораў вырашыў дэпутат Андрэй Тарас, работнік «Гродначжылбуду».

Устаноўку правялі даволі хутка — літаральна за некалькі тыдняў. За агароджу перанеслі частку маладых дрэўцаў, што тут раслі. Уладальнікі сабак таксама актыўна працавалі.

— Гэта трэба людзям, і яны не засталіся ўбаку, — адзначыла Алена Патапава. — Прыходзілі мамы з дзецьмі, фарбавалі. Яны і фарбу куплялі часткова. Работы вяліся сумесна з гарадскімі камунальнымі службамі.

### ПЛЯЦОЎКА ЯК СРОДАК СЯБРОЎСТВА

Такімі назіраннямі падзялілася адна з ініцыятараў гэтай справы Вольга Хітрушка. Яна гаспадыня хаскі. І пакуль сабака быў малы, ён выклікаў пяшчоту ў навакольных. Калі вырас, пачаліся прэтэнзіі з боку жыхароў. Тым больш, непадалёк знаходзіцца школа.

— Можна было гуляць і на той тэрыторыі, дзе цяпер пляцоўка, — кажа Вольга, — але там побач дарога і сабаку без павадка не адпусціш: можа трапіць пад машыну. Таму мы звярнуліся да дэпутатаў. Справа даволі хутка вырашылася. І цяпер у нас ёсць цудоўнае месца не толькі для выгулу, але і для сустрэч з іншымі гаспадарамі сабак.

Вольга і сама не чакала, што такія сустрэчы аб'ядноўваюць уладальнікаў чатырохногіх сяброў. Яны стварылі групу ў «Вайберы», дзе аб'яднана каля 50 чалавек. Гэта дапамагае разводзіць па часе малых і вялікіх сабак. На дружалюбную пляцоўку прыязджаюць і з іншых канцоў горада, у тым ліку з цэнтра.

Цяпер жыхары хочуць зрабіць навес. Вольга Хітрушка расказала, што адпаведны ліст-просьбу аднеслі ў некалькі інстанцый, у тым ліку ў ЖЭС № 113. Таксама ёсць патрэба ў асвятленні, бо тут яшчэ няма ліхтароў.

Праўда, пакуль існуе праблема балансавага ўтрымання аб'екта. У сувязі з гэтым жыхары самі косяць траву, хоць тэрыторыю вакол пляцоўкі абслугоўвае ЖЭС. Таксама неабходна праводзіць апрацоўку супраць кляшчоў. Самі жыхары прымацавалі на агароджу знакі з правіламі выгулу сабак — напрыклад, сюды забараняецца пускаць малых дзяцей. Асабліва калі ёсць чужыя сабакі.

— Такая пляцоўка забяспечвае парадак з утрыманнем чатырохногіх сяброў. Тут самі гаспадары падтрымліваюць культуру, — адзначае дэпутат Алена Патапава. — Галоўнае — разгрузілі двары і знялі напружанасць паміж утрымальнікамі сабак і тымі, хто іх не мае.

На думку дэпутата, зроблены важны крок да цывілізаванага і гуманнага спосабу ўтрымання жывёл. Але пакуль гэта толькі пачатак справы. Бо такія пляцоўкі патрэбны паўсюдна. І пустак хапае. Вось толькі ці будзе пашырацца новы вопыт? Магчыма, гэта залежыць у першую чаргу ад саміх уладальнікаў сабак. Каму, як не ім, ініцыяваць уладкаванне пляцовак у сваіх мікраараёнах?

**Маргарыта УШКЕВІЧ, фота аўтара.**

ТРЭБА ВЕДАЦЬ

# БРЭША І КУСАЕ...

## Якія сабакі адносяцца да патэнцыйна небяспечных парод?

**Гэты спіс, які складаецца з 40 парод, зацверджаны пастановай Мінсельгасхарчу. Мы паглядзелі, якія пароды ў яго ўваходзяць, і даведаліся, напрыклад, што ўладальнікам пухнатых, у смешных зморшчынках шарпеяў давядзецца заплаціць больш...**

1. Айну.
2. Акабаш.
3. Амерыканскі піт-бультэр'ер.
4. Амерыканскі стафардшырскі тэр'ер.
5. Анаталійскі карабаш.
6. Англійскі мастыф.
7. Аўчарка Даўфмана.
8. Бардоскі дог.
9. Бельгійскі мастыф.
10. Бульмастыф.
11. Бультэр'ер.
12. Горскі ганчак.
13. Грэчаская аўчарка.
14. Даберман-пінчар.
15. Даберман Уладэка Рошыны.
16. Ірландскі ваўкадаў.
17. Канарскі сабака (пера дэ прэса канарыя).
18. Кангал.
19. Капе-норса.
20. Карэльскі мядзведжы сабака.
21. Каўказская аўчарка.
22. Кенгуровы сабака.
23. Лангедоцкі пастухоўскі сабака.
24. Леапардавы ганчак.
25. Мальёрскі бульдог (тэра дэ мальёркін).
26. Марэма (марэмо-анха-абруцкі пастухоўскі сабака).
27. Маскоўскі вартавы.
28. Нямецкая аўчарка.
29. Нямецкі дог.
30. Паўднёваруская аўчарка.
31. Ратвейлер.
32. Румынская аўчарка.
33. Рызеншнаўцар.
34. Супердог і яго помесь з майконгам.
35. Сярэднеазіяцкая аўчарка.
36. Тоса-іну (японскі байцовы сабака).
37. Усходнееўрапейская аўчарка.
38. Філа бразільера.
39. Чорны тэр'ер.
40. Шарпей (кітайскі байцовы сабака).

# ГОЛАС НАШАЙ ПАМЯЦІ

**Тыдзень памяці заслужанага артыста БССР Ільі Кургана абвяшчае Беларускае радыё. 9—15 верасня ў штодзённай праграме «Тэатр Беларускага радыё» будуць гучаць радыёспектаклі і творы класікаў айчыннай літаратуры ў выкананні легендарнага дыктара, пад бадзёрае «Гаворыць Мінск!» якога больш за сорак гадоў прачыналася ўся краіна.**



Ілья Львовіч пайшоў з жыцця 21 жніўня гэтага года, але ў фондах радыё захавалася мноства пастановак, падрыхтаваных «беларускім Левітанам». Часткай гэтых скарбаў Першы нацыянальны канал падзеліцца са слухачамі. Так, 9 верасня прагучаць інсцэніроўка апавядання Янкі Маўра «Апошні вылет» і паэма Пятра Глебкі «Мужнасць», 10 верасня — кампазіцыя «Сцяг брыгады» паводле Аркадзя Куляшова, 11 верасня — фрагмент паэмы Адама Міцкевіча «Пан Тадэвуш», а 12 верасня — урывак з аповесці Кузьмы Чорнага «Скіп'ёўскі лес». Аўдыяспектакль «Крыж міласэрнасці» паводле рамана Валянціны Коўтун, дзе славуты дыктар чытае словы ад аўтара, выйдзе ў эфір 13 і 14 верасня, а завершыць тыдзень памяці фрагмент аповесці Уладзіміра Караткевіча «Чазенія».

**Вікторыя ЗАХАРАВА.**

Тэлесеткі

# Дагнаць і перагнаць Амерыку!

**Лёгкаатлетычнае спаборніцтва Еўропа — ЗША, якое літаральна праз некалькі дзён пройдзе на нацыянальным алімпійскім стадыёне «Дынама» ў Мінску, невыпадкова атрымала гучную назву «Матч стагоддзя». Удзел у першым спартыўным супрацьстаянні кантынентаў сапраўды возьмуць найлепшыя спартсмены з сусветных зборных, у тым ліку — беларусы.**

Паказаць спартыўнае шоу у поўным аб'ёме абяцаюць тэлеканалы Белтэлерадыёкампаніі. «На спаборніцтвах будуць працаваць пяць рэжысёрскіх груп: чатыры беларускія і адна шведская, — анансуюць у медыяхолдынгу. — Мы задзейнічаем самае высокатэхналагічнае абсталяванне, у тым ліку тры перасоўныя тэлестанцыі, а спартыўны канал «Беларусь 5» не толькі пакажа «Матч веку» ў прамым эфіры, але і зладзіць на стадыёне «Дынама» выязную студыю, дзе будуць запісвацца інтэрв'ю з лёгкаатлетамі, трэнерамі і экспертамі».

9 верасня ў 17.40 на «Беларусь 5» выйдзе перадматчавае «Прэв'ю» з запрошанымі гасцямі і шэрагам сюрпрызаў, у 18.10 канал пакажа ў прамым эфіры ўрачыстую цырымонію адкрыцця матчавай сустрэчы Еўропа—ЗША, а з 19 гадзін пачнецца першы дзень спаборніцтваў паміж кантынентамі. У гэты ж час лёгкаатлетычныя старты трапяць у трансляцыю і 10 верасня. Усе навіны і каляспартыўныя падзеі аператыўна раскажуць землякам і замежнай аўдыторыі журналісты Агенцтва тэленавін, Першага нацыянальнага канала Беларускага радыё і міжнароднага радыё «Беларусь».

**Вікторыя ЗАХАРАВА.**

# ШАХМАТНЫ КЛУБ

Выпуск № 76

Аўтар наступнай задачы ***(гл. дыяграму)*** — мінскі майстар Уладзімір Сычоў.



**Белыя:** Крh6, Фс6, Лh5, пе6 (4).

**Чорныя:** Крf6, Сb2, Сс8, Ка6, Кс1, пп. b4, e7, f7, g4, h7 (10).

Мат за 2 хады.

Дасылайце рашэнні на адрас рэдакцыі («Звязда», вул. Б. Хмяльніцкага, 10а, 220013, г. Мінск) або на электронны адрас вядучага аддзела: vadim_ne67@mail.ru

* * *

У Мінску прайшоў другі Мемарыял Віктара Купрэйчыка па хуткіх шахматах. У ім спаборнічалі 92 удзельнікі з 12 краін, у тым ліку 59 з Беларусі і 24 з Расіі. Сярод гульцоў былі 12 гросмайстраў, 9 міжнародных майстроў, 6 майстроў ФІДЭ. Набраўшы 8 балаў з 10, перамог беларускі гросмайстар Сяргей Жыгалка. 2—4-е месцы падзялілі расійскія гросмайстры Сяргей Цівякоў і Юрый Балашоў, малады беларускі шахматыст Максім Царук — па 7,5. На 5—10-м месцах з 7 баламі — Дзяніс Лазавік, Віталь Цацераў (Беларусь), Яўген Свешнікаў, Давід Паравян, Уладзімір Міхайлоўскі (Расія), Рафаэл Ваганян (Арменія). Сярод жанчын найлепшы вынік ва ўкраінскай гросмайстаркі Наталлі Жукавай — 11-е месца.

Адначасова ў сталіцы праходзіў трэці чэмпіянат свету ФІДЭ па хуткіх шахматах (рапідзе) і бліцы сярод хлопчыкаў і дзяўчынак да 8, 10 і 12 гадоў. Юныя шахматысты прадстаўлялі 35 шахматных федэрацый. У агульным заліку па-за канкурэнцыяй была Расія — 17 медалёў (6 залатых, 4 сярэбраныя і 7 бронзавых). На рахунку беларусаў — два залатыя медалі ў рапідзе: Арцём Стрыбук стаў чэмпіёнам свету сярод хлопчыкаў да 12 гадоў, а Варвара Мацкевіч — сярод дзяўчынак да 8 гадоў. Вось як перамагалі юныя чэмпіёны.

Элдэм Хубухшанаў — Арцём Стрыбук. 1. е4 е5 2. Кf3 Кс6 3. Сс4 Сс5 4. 0-0 Кf6 5. d3 d6 6. а4 0-0 7. с3 а5 8. Ка3 h6 9. Кс2 Ке7 10. Ле1 Кg6 11. Ке3 с6 12. Са2 Сb6 13. с4 Кf4 14. g3 Ке6 15. Кf5 Кс5 16. Сb1 С:f5 17. ef Ле8 18. Се3 Кg4 19. Крg2 К:е3+ 20. Л:е3 Фf6 21. Кh4 d5 22. cd cd 23. Ла3 е4 24. de К:е4 25. Лf3 К:f2 26. Фf1 Кg4 27. Фс1 Ле2+ 28. Крh3 h5 29. Кg2 Кf2+ 30. Л:f2 Л:f2 31. Лb3 Ле8 32. Кf4 Фg5 33. Фd1 Сс7 34. К:d5 Сb8 35. Л:b7 Л:h2+, 0:1.

Варвара Мацкевіч — Кіра Ізафатава. 1. е4 с5 2. Кf3 е6 3. d4 cd 4. К:d4 а6 5. с4 Фс7 6. Кс3 Кf6 7. Се3 Сb4 8. Сd3 Кс6 9. f3 d5 10. cd ed 11. 0-0 de 12. К:е4 К:е4 13. С:е4 0-0 14. Фс2 Сd6 15. К:с6 С:h2+ 16. Крh1 bc 17. Ф:с6 Се6 18. Ф:с7 С:с7 19. С:а8 Л:а8 20. b3 Ле8 21. Сf2 Сf5 22. Лfе1 Лd8 23. Лаd1 Лb8 24. Ле7 Са5 25. Ла7 Сс2 26. Лdd7 Лс8 27. Л:а6 Сf5 28. Лd5 Лс1+ 29. Сg1 Лс8 30. Лd:а5 Се6 31. Ла8 Крf8 32. Л:с8+ С:с8 33. Ла8 Кре7 34. Л:с8 f5 35. а4 g5 36. а5 h5 37. а6 Крd7 38. Лс1 g4 39. fg hg 40. а7 f4 41. а8Ф f3 42. Фd5+ Кре7 43. Ле1+ Крf6 44. gf gf 45. Ф:f3+ Крg5 46. Се3+ Крg6 47. Лg1+ Крh7 48. Фh5х

* * *

У сталіцы Літвы прайшоў штогадовы сусветны кангрэс па шахматнай кампазіцыі. У яго рамках адбыўся адкрыты турнір па рашэнні задач і эцюдаў — заключны этап Кубка свету 2018—2019 гадоў. Перамог шматразовы чэмпіён свету з Польшчы Пётр Мурдзя, але па суме вынікаў усіх этапаў Кубак свету выйграў 16-гадовы расійскі рашальнік Даніла Паўлаў.

Адбыўся таксама чэмпіянат свету па рашэнні кампазіцый. Прызавую тройку склалі Польшча, Расія і Англія, а Беларусь фінішавала на 14-м месцы. За нашу каманду выступалі Аляксандр Булаўка (30-е месца з 91 у асабістым заліку), Мікалай Сігневіч і Аляксандр Міхалап. У асабістым заліку чэмпіёнам стаў Пётр Горскі (Польшча).

* * *

Рашэнне задачы з мінулага выпуску: 1.Фf6! Першымі правільна адказалі Васіль Жуковіч, Ігар Ананіч (ён рашыў і папярэднюю задачу), Уладзімір Ізотаў, Віктар Жук.

**Вадзім ЖЫЛКО.**

# ТЭЛЕТЫДЗЕНЬ

Сядзі і глядзі

# ТРЫ НАГОДЫ ЎКЛЮЧЫЦЬ ТЭЛЕВІЗАР

## Пачуцці, дэтэктыў і шопінг на дэсерт

Тэлеканал «Беларусь 2» на наступным тыдні парадуе гледачоў адразу чатырма забаўляльнымі рэаліці-праектамі з блізкага замежжа. Ужо 10 верасня выйдзе рэаліці пра моду і прыгажосць «Багіня шопінгу. Бліскучае вяртанне», у якім чатыром дзяўчатам трэба будзе за чатыры гадзіны патраціць пэўную суму на модны ўбор — ды так, каб атрымаць максімальны бал ад саперніц і вядучага, эксперта па стылі Леаніда Мартынчыка. Між іншым, ва Украіне, дзе і здымаецца праект, ён не траціць папулярнасці ўжо 7 гадоў і 14 сезонаў!



Увечары 11 верасня на «Беларусь 2» — прэм'ера расійскага экстрэмальна-рамантычнага рэаліці-шоу «Каханне на выжыванне». Рамантыка тут у тым, што выпрабаванне праходзяць закаханыя пары, якія адпраўляюцца ў Тайланд, а экстрым — у тым, што водпуск адбываецца зусім не па сістэме «ўсё ўключана», а як паласа перашкод і іспытаў рэўнасцю, побытам, джунглямі і нават... дэтэктарам хлусні. Удзельнікі могуць атрымаць буйны грашовы прыз, але могуць і пасварыцца назаўсёды.

Рэаліці-шоу «Шэрлакі», якое выйдзе 13 верасня, кажа само за сябе: гэта дэтэктыўны квэст, дзе кожнаму ўдзельніку дастаюцца ролі — ад злачынцы да следчых. Задача першага — заблытаць сляды, а другіх — разблытаць справу і за 40 хвілін гульні выявіць зламысніка.

Нарэшце, 14 верасня сустракайце смачную прэм'еру «Кароль дэсертаў» — спаборніцтва вопытных кандытараў у прыгатаванні ласункаў, больш падобных да твораў мастацтва. Галоўнае на час прагляду гэтага рэаліці-шоу — адсесці як мага далей ад халадзільніка.

## Палёт з фантазіяй

Таксама ў верасні ў эфіры «Беларусь 2» з'явіцца штотыднёвы праект для аматараў падарожнічаць па свеце — трэвел-шоу «Селапаляцела». Тут не будзе цытат з аглядной экскурсійнай праграмы, парад па выбары статуснага атэля і пераліку культурных традыцый далёкіх народаў, затое будуць няпростыя задачкі для карэспандэнта. За кожнае выкананае заданне з пяці выпрабаванняў героіні праграмы будуць выдаваць грошы, за якія і трэба пражыць у чарговай краіне, а калі заданне не выканана і грошай няма — круціся як сабе хочаш...




Прынамсі, вось што сцвярджаюць у анонсе стваральнікі праграмы: «У нас усё вырашае не воля лёсу, а фантазія здымачнай групы і вынослівасць вядучай. Ніякіх сумных экскурсій, толькі сапраўдныя эмоцыі і рэальнае жыццё!» Наколькі абяцанні супадуць з рэчаіснасцю, даведаемся ўжо 15 верасня.

## Творчасць

Ужо ў гэту суботу, 7 верасня, сацыякультурны канал «Беларусь 3» прадставіць прэм'еру цыкла праграм «Народны майстар» і, адпаведна, раскажа пра ўладальнікаў звання «Народны майстар Рэспублікі Беларусь».



Ці ведалі вы, колькі творчых землякоў з залатымі рукамі ўваходзіць у айчынны Саюз майстроў? Больш чым 700 чалавек, якія ўвасабляюць вялікі спектр разнастайных рамёстваў: ганчарства, разьба па дрэве, пляценне з саломкі і лазы, выцінанка, вышыўка, абрадавая лялька, кавальскае мастацтва, апрацоўка каменю.

Пра тое, якім шляхам той ці іншы самабытны майстар прыйшоў да творчасці, чым ён захапляецца сам і ўражвае іншых, якраз і апавядзе новая праграма.



## Жывіце здорава са «Звяздой»!

Калі вы падпісаліся на газету «Звязда» на IV квартал або на II паўгоддзе 2019 г., запаўняйце картку ўдзельніка, выразайце і дасылайце да 16 кастрычніка 2019 года ў рэдакцыю на адрас: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А.

Сярод падпісчыкаў 17 кастрычніка 2019 года будуць разыграны сем фітнес-трэкераў і суперпрыз — ровар Mikado. Вынікі будуць апублікаваны ў газеце «Звязда» да 27 кастрычніка.



Прызы можна будзе атрымаць у рэдакцыі па 31 снежня пры падачы квітанцыі аб падпісцы на «Звязду» на IV квартал або на II паўгоддзе 2019 г. і пашпарта. Пасля 31 снежня выдача прызоў спыняецца і прэтэнзіі падпісчыкаў не прымаюцца. Умовы рэкламнай гульні «Жывіце здорава са «Звяздой»!» чытайце ў нумары 168 газеты «Звязда» ад 05.09.2019 г.

**Тэлефон для даведак (017) 263 66 73.**
**Тэрмін правядзення гульні — з 06.09.2019 да 31.12.2019.**



Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі № 3563 ад 28.05.2019 г. выдадзена Міністэрствам антыманапольнага рэгулявання і гандлю Рэспублікі Беларусь.

## Картка ўдзельніка — падпісчыка «Звязды» на IV квартал або II паўгоддзе 2019 года

**Прозвішча, імя, імя па бацьку** ______________________

______________________

**Падпіска аформлена і аплачана ў** ______________________
(аддзяленне сувязі)
______ на IV квартал або II паўгоддзе 2019 года

**Хатні адрас і тэлефон** (абавязкова) ________ (індэкс) ________

______________________

______________________

Удачы ў розыгрышы!

## Беларусь 1

**6.50 Меладрама «Вярні мяне» (16+).**
**8.20** «Клуб рэдактараў».
**9.00, 12.00, 15.00** Навіны.
**9.10** «Арсенал» (12+).
**9.45** «Гісторыі выратавання» (12+).
**10.15** «Усе за стол!» (12+)
**11.10** «На вылет!» (12+)
**12.10** Навіны. Цэнтральны рэгіён.
**12.35** «Кулінарная дыпламатыя» (12+).
**13.15 Меладрама «Блюз для верасня» (16+).**
**15.15** «Твой горад».
**15.30** «Вакол планеты».
**16.20** «Маршрут пабудаваны» (12+).
**16.55 Меладрама «Прынцэса-жаба». 1—4-я серыі (16+).**
**20.40** Навіны надвор'я.
**21.00** «Галоўны эфір».
**22.10 Меладрама «Пільнае толькі сэрца» (16+).**

## Беларусь 2

**7.00** М/с «Чарапашкі-ніндзя» (12+).
**7.25 Серыял «Аўташкола» (12+).**
**9.00, 21.15** «Тэлебарометр».
**9.05** «Селапаляцела» (16+).
**9.55** «ЖаннаПажані» (16+).
**10.45** «Да пабачэння!» (16+)
**11.35** «Багіня шопінгу. Бліскучае вяртанне» (16+).
**12.30 Фантастыка «Доктар Стрэндж» (12+).**
**14.25** «Тата папаў» (16+).
**16.00** «Бітва экстрасэнсаў» (16+).
**18.20** Валейбол. Чэмпіянат Еўропы. Мужчыны. Фінляндыя — Беларусь.
**20.40** «Калі мы дома». Скетчкам (16+).
**21.10** «Спортлато 5 з 36», КЕНО.
**21.45** «Трэці лішні» (16+).
**22.50 Трылер «Званок» (16+).**

## Беларусь 3

**7.35** «Святыні Беларусі».
**8.00, 16.40, 20.15** Навіны культуры.
**8.20, 20.35** «Гэты дзень».
**8.25** «Караблік», «Гаршчочак кашы». М/ф (0+).
**8.45 «Калі ласка, або Пабочным асобам уваход забаронены!» Камедыя (6+) [СЦ].**
**10.00** «Наперад у мінулае».
**10.25** «Беларуская кухня». Жулікі па-далецку.
**11.00** «Сваімі словамі». Тэлевіктарына.
**11.35** «Нацыянальны хіт-парад».
**12.30 «Прыгоды Шэрлака Холмса і доктара Ватсана». Дэтэктыў (12+) [СЦ].**
**15.50** «Майстры і куміры». Народны артыст Беларусі Аляксандр Анісімаў.
**17.00** «Жывая культура». Абрад «Бразгун» (в. Наркі, Чэрыкаўскі раён, Магілёўская вобласць).
**17.25 «Адзінокім даецца інтэрнат». Камедыя (12+) [СЦ].**
**18.55** «Дзесяць фатаграфій». Аляксандр Міхайлаў (12+).
**19.30** «Народны майстар». Вячаслаў Якавенка, Любоў Яшчанка. «Магія глінянай свістулькі».
**20.00** «Архітэктура Беларусі».
**20.40** «Калыханка» (0+).
**21.05 «Цешча». Драма (12+).**
**22.15** Дзень беларускага пісьменства — 2019. Канцэрт «Зямля мая беларуская».

## Беларусь 5

**6.30** Тэніс. WTA. Хірасіма. Фінал.
**8.40** Лёгкая атлетыка. «Мінскі паўмарафон — 2019».
**10.20** Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. Відэачасопіс.
**10.50** Піт-стоп.
**11.20** Гульні «навырост».
**11.50** Лёгкая атлетыка. «Мінскі паўмарафон — 2019».
**12.20** Тэніс. WTA. Наньчан. Фінал.
**13.55** Аўтаспорт. Дрыфтынг. Пары-матч — чэмпіянат Беларусі. Фінал. Пінск.
**14.50** Футбол. Чэмпіянат Англіі. «Манчэстэр Юнайтэд» — «Лестэр».
**16.35** Авертайм. КХЛ.
**17.00** Хакей. КХЛ. «Дынама-Мінск» — «Металург» (Магнітагорск). (У перапынках — Авертайм. КХЛ.)
**19.15** Футбол. Беларусбанк — чэмпіянат Беларусі. «Дынама-Мінск» — ФК «Слуцк».
**21.00** Барацьба. Чэмпіянат свету. Фіналы.
**23.35** Вынікі тыдня.

## АНТ

**7.00, 9.00, 16.00** (з субцітрамі) «Нашы навіны».
**7.10 Камедыя «Самагоншчыкі» (12+).**
**7.35** «Ералаш» (6+).
**7.45** «Жыццё іншых» (12+).
**8.40** «Метэагід».
**9.10** «Нядзельная пропаведзь» (з субцітрамі).
**9.25 Маст. фільм «Два імгненні кахання» (16+).**
**11.05** «Бачылі відэа?» (6+)
**13.05 Камедыя «Белыя Росы» (12+).**
**14.40** «Здабытак рэспублікі»: Джо Дасэн» (12+).
**16.20** «Яны вызвалялі Беларусь» (16+).
**17.00** «Кропля ў кроплю» (16+).
**20.00** «Контуры».
**21.05** «Вялікая гульня» (16+).
**22.50** «Спартклуб» (16+).
**23.10** «Клуб Вясёлых і Знаходлівых». Летні кубак — 2019 (16+).

## СТБ

**6.00** «Дзіўная справа» (16+).
**7.40, 11.05** Дакументальны спецпраект (16+).
**9.15** «Мінтранс».
**10.00** «Скардзіцца дазваляецца».
**10.30** «Вялікі горад».
**12.20, 13.40, 16.40 «Непадкупны». Серыял (16+).**
**13.30, 16.30** Навіны «24 гадзіны».
**19.30** «Тыдзень».
**20.35** «Засакрэчаныя спісы» (16+).
**22.10 «Шпіён». Серыял (16+).**
**1.00 «Баец. Нараджэнне легенды». Серыял (16+).**

## МІР

**6.00** «Мільён пытанняў аб прыродзе» (6+).
**6.10** «Беларусь сёння» (12+).
**6.40** М/ф (6+).
**6.55** «Ведаем рускую» (6+).
**7.50** «Культ/Турызм» (16+).
**8.20** «Яшчэ танней» (12+).
**8.55** «Сусветныя гульні розуму» (0+).
**9.25** «ФазэндаЛайф» (6+).
**10.00, 16.00** Навіны (бягучы радок).
**10.15** «Нітка да ніткі» (12+).
**10.45, 16.15, 19.30 Серыял «Ганна Герман. Тайна белага анёла» (16+).**
**18.30, 0.00** «Разам».
**23.10, 1.00 Серыял «Сэрцы трох» (16+).**
**4.45 Маст. фільм «Белы клык» (0+).**

## РТР—Беларусь

**7.00 Маст. фільм «Мама Маша» (12+).**
**10.30** «Смехапанарама» Яўгена Петрасяна» (16+).
**11.00** Весткі.
**11.20** «Сто да аднаго» (12+).
**12.15** «Ранішняя пошта» (16+).
**13.00** «Калі ўсе дома» (12+).
**14.00** «Смяяцца дазваляецца» (16+).
**16.15 Камедыя «Мядовы месяц» (12+).**
**18.15, 21.45 Маст. фільм «Сухар» (12+).**
**20.00** Весткі тыдня.
**21.15** «У людзях».
**23.00** Масква. Крэмль. Пуцін.
**23.40** «Вечар у нядзелю».

## НТБ—Беларусь

**6.20** «Астрапрагноз».
**6.25** Terra incognita. Беларусь невядомая (6+).
**6.55, 22.35** «Зразумець і абясшкодзіць» (12+).
**7.30** «Іх норавы» (0+).
**8.00, 10.00, 16.00** «Сення».
**8.20** «Спецыяльны рэпартаж» (12+).
**8.35** «Аднойчы...» (16+)
**9.15** «Хто ў доме гаспадар?» (16+)
**10.25** «Першая перадача» (16+).
**11.05** «Цуд тэхнікі» (12+).
**12.00** «Дачны адказ» (0+).
**13.05** «НашСпажыўНагляд» (16+).
**14.10 Меладрама «Кахаць па-руску-2» (12+).**
**16.20** «Следства вялі...» (16+)
**18.00** «Новыя рускія сенсацыі» (16+).
**19.00** «Вынікі тыдня».
**20.05** «Зоркі сышліся» (16+).
**21.30** «Ты не паверыш!» (16+)
**23.05 Маст. фільм «Казак» (16+).**

## 8 канал

**7.00, 16.15, 18.40, 21.05, 0.10** «Надвор'е» + «Эрана».
**7.05** М/ф «Востраў скарбаў».
**9.00** Дак. фільм «Дарога ў школу».
**9.25** «Утрамдзія».
**9.30** «Гатуй як шэф» (12+).
**9.50** «Вячэрні квартал — 95» (18+).
**11.15 Фантастыка «Мсціўцы» (12+).**
**14.15 Вестэрн «Апошні з магіканаў» (16+).**
**16.20 «Глядзім усёй сям'ёй». Вестэрн «Чынгачгук — Вялікі Змей» (12+).**
**17.55 Серыял «Касл» (12+).**
**18.45** «Рэальны бізнес» (6+).
**18.50 Фантастыка «Каўбоі супраць прышэльцаў» (12+).**
**20.50** «Вечарніца».
**21.10 Маст. фільм «Эверэст» (12+).**
**23.15 Серыял «Тайны Сільверхейда» (16+).**

## ВТБ

**6.05** «Дурні і дарогі» (16+).
**7.15** М/ф «Марын і яго сябры» (0+).
**7.40, 13.10** М/ф «Цімон і Пумба» (0+).
**8.15** «Лаві момант» (16+).
**9.10** «КВЗ. Па-нашаму» (16+).
**10.10** Серыял «Мамачкі» (16+).
**11.15, 1.30** Серыял «Вароніны» (12+).
**12.50** «Ералаш» (6+).
**13.45** Скетч-шоу «Даеш моладзь» (16+).
**14.30** Фантастыка «Пятая хваля» (16+).
**16.50** Серыял «Шчаслівыя разам» (16+).
**17.55, 0.30** «Уральскія пельмені» (16+).
**19.00** Серыял «Два бацькі і два сыны» (16+).
**21.00, 5.10** Серыял «Псіхалагіні-2» (16+).
**22.00** Драма «Другі шанц» (16+).
**2.50** Серыял «Бязмоўны сведка» (16+).
**4.10** Скетч-шоу «6 кадраў» (16+).

## Культура

**6.30, 7.00, 7.30, 10.00, 15.00, 19.30, 23.45** Навіны культуры.
**6.35** «Пешшу...» Масква дваранская.
**7.05** «Маленькія сакрэты вялікіх карцін». Дак. серыял [СЦ].
**7.35** «Астравы». Анатоль Папанаў [СЦ].
**8.15** «Зялёны агеньчык». Маст. фільм [СЦ].
**9.30** «Іншыя Раманавы». «Апошні крыжаносец Расійскай імперыі» [СЦ].
**10.15** «Назіральнік».
**11.10, 1.15** XX стагоддзе. «Музыка ў тэатры, у кіно, на тэлебачанні. Андрэй Пятроў». 1986 год.
**12.30, 18.40, 0.30** «Улада факта». «Італія: ад Рысарджымента — да Рэспублікі».
**13.10** «Прыгожая планета». «Францыя. Гістарычная крэпасць Каркасона».
**13.25** «Лінія жыцця». Радзівон Нахапетаў [СЦ].
**14.20** «Продкі нашых прадкаў». Дак. серыял [СЦ].
**15.10** «Справа №. Кругасветка № 1. Рускі сцяг над акіянамі». Дак. серыял [СЦ].
**15.40** «Агора». Ток-шоу.
**16.40** «Багач, бядняк...» Серыял. 1-я серыя.
**17.55** Да 75-годдзя маэстра. Уладзімір Співакоў і Барыс Бехцераў у БЗК. Запіс 1980 года.
**19.45** «Галоўная роля».
**20.30** «Добрай ночы, малыя!»
**20.45** «Ступені цывілізацыі». «Восем дзён, якія стварылі Рым». Дак. серыял [СЦ].
**21.30** «Саці. Нясумная класіка...»
**22.10** «Белая гвардыя». Маст. фільм. 1-я серыя.
**23.00** Да 75-годдзя маэстра. «Уладзімір Співакоў. Дыялогі з Саламонам Волкавым». Дак. серыял. 1-я серыя [СЦ].
**0.05** «Магістр гульні». «Мёртвыя душы» і воплескі на нябёсах» [СЦ].
**2.30** «Pro memoria». «Лютэцыя Дэмарэ».

## Настальгія

**6.00** Маст. фільм «Маё каханне» (12+).
**7.10, 8.45, 10.55, 14.25, 14.45, 18.50, 21.45, 23.00, 1.05, 2.45, 3.45, 5.00** Музычная настальгія (12+).
**7.35** «Лайма Вайкуле ў канцэртнай зале «Расія». 1990 год (12+).
**8.35, 14.35** «Мастак і паэт Міхаіл Гробман чытае свае вершы». 2005 год (18+).
**9.00** «Быў час». 2009 год (16+).
**10.00** Фільм-канцэрт гурта «Дзеці». 1988 год (18+).
**12.00** Фільм-спектакль «Энергічныя людзі». 1988 год (16+).
**15.00** Тэлеспектакль «Зойкіна кватэра». 1988 год (16+).
**18.00** «СевАлогія» з Севам Наўгародцавым: «Мухаморы». 2005 год (18+).
**19.00** Тэлеспектакль «Узнагарода — тысяча франкаў». 1983 год (16+).
**21.00, 3.00** «Мінулы час» (12+).
**22.00** «Народжаны ў СССР» (12+).
**0.00** «Да і пасля...» з Уладзімірам Малчанавым. Год 1989-ы. 1-я частка. 2008 год (12+).
**1.20** Дак. фільм «Маскоўская элегія» (12+).
**4.00** «Колба часу» (16+).

## EuroSport 1

**2.00** Тэніс. «Гейм, Шэт і Матс».
**2.15, 4.00, 19.15** Watts.
**2.30, 4.30** Тэніс. US Open. Жанчыны. Пары. Фінал.
**3.10** Тэніс. US Open. Мікст. Фінал.
**5.30** Тэніс. US Open. Мужчыны. Фінал.
**7.00** Веласпорт. «Тур Брытаніі».
**8.00, 13.00, 23.10** Веласпорт. «Вуэльта».
**9.25** Снукер. «Мастэрс».
**18.45** Веласпорт. «Вуэльта»-экстра.
**19.40** Конны спорт. Global Champions League.
**20.10** Пола. Polo line.
**21.00** Дзюдо. Чэмпіянат свету.
**22.05** Тэніс. US Open.
**23.50** Валейбол. Чэмпіянат Еўропы.

## Кінакамедыя

**0.45** Між анёлам і чортам (16+).
**2.50** Калядная ноч у Барселоне (18+).
**4.40** Няхай жыве Францыя! (16+)
**6.25** Шпіён па суседстве (12+).
**8.15** Праект А (12+).
**10.10** Праект А: частка другая (12+).
**12.15** Энцыклапедыя разводаў (16+).
**13.55** Стажор (16+).
**15.50** Дзевяць ярдаў (16+).
**17.45** Каханне і іншыя катастрофы (12+).
**19.30** 50 першых пацалункаў (16+).
**21.20** Аднакласнікі (12+).
**23.10** Пацучыныя бегі (12+).

## ТБ3

**6.00** М/ф (6+).
**7.50** Калекцыя «Беларусьфільма». «Дзяржаўная граніца». Маст. фільм (12+).
**9.40** «Перыскоп» (16+).
**10.00, 3.45** «Суд ідзе». Дак. серыял (16+).
**11.00, 17.25** «Сляпая» (16+).
**12.05** «Асцярожна, махляры!» (16+)
**12.40** «Без падману» (16+).
**13.30** «Маскоўская паланіца». Маст. фільм (12+).
**15.15, 23.00, 4.35** «Нераскрытыя тайны» (12+).
**15.45** «Мой герой» (12+).
**16.35** «Развітанне» (16+).
**18.30** «Кроўныя ворагі». Дак. фільм (16+).
**19.20, 2.10** «Парфумерка-2». Серыял (12+).
**21.15** «Пад купалам». Серыял (16+).
**23.50** «Звышнатуральнае». Серыял (16+).
**0.35** «Лапачка». Камедыя (12+).
**5.05** «Часова даступны» (12+).

## ТБ1000

**6.10, 18.30** Бетховен (12+).
**7.45** Эвалюцыя Борна (16+).
**10.20** Захавальнік Месяца (6+).
**12.00** Ілюзія падману-2 (12+).
**14.25** Ідэнтыфікацыя Борна (12+).
**16.40** Арбіта 9 (16+).
**20.10** Сямейнае аграбленне (16+).
**22.00** Назад у будучыню (12+).
**0.15** Калонія Дыгнідад (18+).
**2.20** Немагчымае (16+).
**4.15** Перавага Борна (12+).

## ТБ1000 Рускае кіно

**8.00** Аднакласніцы: новы паварот (16+).
**9.35** М + Ж (16+).
**11.10** Краіна глухіх (12+).
**13.25** Метад Лаўровай (16+).
**15.15** Апельсінавы сок (16+).
**17.05** Сем вячэр (12+).
**18.45** Пра любоff (16+).
**20.55, 5.30** Бабуля лёгкіх паводзін (16+).
**22.35** Дом (16+).
**1.30** Варашылаўскі стралок (16+).
**3.40** Востраў шанцавання (16+).

## National Geographic

**6.00** Зона будаўніцтва (16+).
**6.20** Найбуйнейшы ў свеце рамонт (16+).
**7.10, 14.15, 19.45, 4.25** Мегаполісы (16+).
**8.00** Ледзяная дарога (16+).
**8.45, 13.30** Інстынкт выжывання (16+).
**9.30, 12.40, 18.10** Асушыць акіян (16+).
**10.20, 16.40** Суперкар са сметніка (16+).
**11.05** Дзікі тунец (16+).
**15.05, 21.20, 2.50** Расследаванні авіякатастроф (16+).
**15.50** Міжнародны аэрапорт Дубай (16+).
**17.25** Апошнія крокі Гітлера (16+).
**19.00, 22.10, 0.30, 3.40** Activate: глабальны грамадзянскі рух (16+).
**20.35** Рэальнасць ці фантастыка? (16+)
**22.55** Падарожжы з Горданам Рамзі (16+).
**23.45** Ліхтугі за мяжой (16+).
**1.15** У пагоні за НЛА (16+).
**2.05** Мяжа (16+).
**5.15** Безразважныя вынаходнікі (16+).
**5.40** Навуковыя недарэчнасці (16+).

## Discovery

**8.00, 11.10, 14.50, 21.15** Як гэта зроблена? (12+)
**8.25** Залаты шлях Паркера Шнабеля (16+).
**9.20, 16.40, 22.10** Махінатары (12+).
**10.15, 17.35, 4.35** Круты цюнінг (12+).
**12.05, 23.05** Склады (12+).
**13.00, 3.40** Аляска: сям'я з лесу (16+).
**13.55** Як гэта ўстроена? (12+)
**18.30, 1.50** Залатая ліхаманка (16+).
**19.25, 7.10** Чыгунка Аляскі (16+).
**20.20, 5.30** Ратавальнікі маёмасці (12+).
**0.00** Хуткія і гучныя (12+).
**0.55, 6.20** Выжыванне без купюр (16+).
**2.45** Голыя і напалоханыя (16+).

## Беларусь 1

**6.00, 7.20, 8.15** «Добрай раніцы, Беларусь!»
**7.00, 8.00** (з сурдаперакладам), **9.00, 12.00, 13.00, 15.00, 17.00, 19.00** Навіны.
**7.05, 8.05** Навіны эканомікі.
**7.10, 8.10, 18.15, 23.40** «Зона Х» (16+).
**9.10, 21.50 Серыял «След» (16+).**
**10.50, 12.10, 18.35, 19.20 Серыял «Выпрабаванне» (16+).**
**13.05** «Дзіцячы доктар».
**13.35 Серыял «Адналюб» (16+).**
**14.35, 15.25 Серыял «Дварняжка Ляля» (16+).**
**15.15, 18.00** Навіны рэгіёна.
**17.05** «Беларуская часінка».
**21.00** «Панарама».
**23.20** «Сфера інтарэсаў».
**0.05** «Дзень спорту».

## Беларусь 2

**7.00** «Уключайся!» (12+)
**9.00, 18.20** «Тэлебарометр».
**9.05, 20.05 Серыял «Зразумець. Дараваць» (16+).**
**9.40, 20.35 Серыял «Сямейныя гісторыі» (16+) [СЦ].**
**10.15, 22.10** «Экстрасэнсы-дэтэктывы» (16+).
**11.10, 18.25 Серыял «Опер па выкліку» (16+).**
**12.55, 23.50 Серыял «Жаночы доктар-2» (16+).**
**13.50** «Багіня шопінгу. Бліскучае вяртанне» (16+).
**14.50** М/с «Пінгвіны з Мадагаскара» (0+).
**15.40** «Нічога сабе ньюз» (12+).
**15.45** «Пін_код». Інтэрактыўны маладзёжны праект (12+).
**16.35** М/с «Чарапашкі-ніндзя» (12+).
**16.55** «Калі мы дома». Скетчкам (16+).
**17.25 Серыял «Аўташкола». 1-я серыя (12+).**
**21.10** «Спортлато 6 з 49», КЕНО.
**21.15** «Тата папаў» (16+).
**23.15** «Сыграй мяне, калі зможаш» (12+).

## Беларусь 3

**7.00** «Дабраранак».
**7.35, 12.25** «Беларуская кухня». Заліўное з рыбы.
**8.05, 12.00, 20.15** Навіны культуры.
**8.25, 12.20, 20.35** «Гэты дзень».
**8.30, 18.35 «Фурцава». Маст. фільм. 1-я серыя (16+).**
**9.25, 21.05** «Апошні дзень». Кацярына Фурцава (12+).
**10.05, 17.10 «Таму што кахаю». Меладрама (12+).**
**11.30** «Я хачу гэта ўбачыць!» (6+)
**12.55** «Сваімі словамі». Тэлевіктарына.
**13.30** «Славянскі базар у Віцебску — 2017». Аляксандр Зацэпін. «Есть только миг...»
**15.15** «Дыверсанты Трэцяга рэйха». «Незавершаны скачок» (12+).
**15.55, 21.40 «МУР». Маст. фільм. «1944» (16+).**
**16.40** «Грані Перамогі». Салдаты Перамогі.
**19.30** «Ваша лато», «Пяцёрачка».
**20.00** «Суразмоўцы».
**20.40** «Калыханка» (0+).
**22.30** «Артэфакты». Сярэбраны рыцарскі пояс Стэфана Баторыя.
**22.55** «Люблю і памятаю». Кампазітар, народны артыст СССР Яўген Глебаў.

## Беларусь 5

**7.00, 14.00** Тэніс. WTA. Шэньчжоу.
**13.00** Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. Відэаспасіс.
**13.30** Легенды сусветнага спорту.
**16.00** Футбол. Таварыскі матч. Уэльс — Беларусь.
**18.00** Спорт-кадр.
**18.30** Лёгкая атлетыка. Матчавая сустрэча Еўропа — ЗША. Прэв'ю.
**19.00** Лёгкая атлетыка. Матчавая сустрэча Еўропа — ЗША. Дзень другі.
**22.00** Футбол. Кваліфікацыя да Еўра-2020. Чарнагорыя — Чэхія. (У перапынку — Спортцэнтр.)
**23.45** Фактар сілы.

## АНТ

**6.00, 7.05, 8.05** «Наша раніца».
**7.00** (з субцітрамі), **8.00** (з субцітрамі), **9.00** (з субцітрамі), **11.00, 13.00, 16.00, 18.00** (з субцітрамі), **20.30** Нашы навіны.
**9.10** «Тэорыя змовы» (16+).
**9.55** «Жыць здорава!» (16+)
**11.10 Серыял «Сярэбраны бор» (16+).**
**12.20, 13.10 Серыял «Дыхай са мной» (16+).**
**14.40** «Давай пажэнімся!» (16+)
**15.35, 16.20, 0.05** «Мужчынскае / Жаночае» (16+).
**16.50, 23.05** «На самай справе» (16+).
**18.20** «Удача ў прыдачу!» з «Еўраопт».
**19.05** «Няхай гавораць» (16+).
**20.00** «Час».
**20.30** «Нашы навіны».
**21.10 Серыял «Дыпламат» (16+).**

## СТБ

**5.30** «Цэнтральны рэгіён».
**6.00, 7.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** Навіны «24 гадзіны».
**6.10, 20.15** «Міншчына».
**6.20, 7.45** «Раніца. Студыя добрага настрою» (6+).
**9.10, 23.00** «Загадкі чалавецтва» (16+).
**10.40 «Меч». Серыял (16+).**
**12.25** «Вадзіць па-руску» (16+).
**12.35, 21.15, 23.40** «Самыя шакіруючыя гіпотэзы» (16+).
**13.45, 20.30** «Неверагодна цікавыя гісторыі» (16+).
**14.40, 0.25** «Сакрэтныя тэрыторыі» (16+).
**15.40, 16.50 «Непадкупны». Серыял (16+).**
**20.00, 22.55** «СТБ-спорт».
**20.05** «Сталічныя падрабязнасці».
**22.00** «Скардзіцца дазваляецца».
**1.10** «Дзіўная справа» (16+).

## МІР

**6.00, 20.40, 0.10, 4.05 Серыял «Закон і парадак» (16+).**
**8.30, 10.10 Серыял «Свой чужы сын» (12+).**
**10.00, 13.00, 16.00, 19.00, 0.00** Навіны (бягучы радок).
**13.15, 2.55** «Зала суда. Бітва за грошы» (16+).
**14.10, 1.20** «Справы сямейныя. Бітва за будучыню» (16+).
**15.05, 2.10** «Справы сямейныя. Новыя гісторыі» (16+).
**16.15, 0.55** «Такому мама не навучыць» (12+).
**17.20, 19.20 Серыял «Вяртанне Мухтара-2» (16+).**
**19.55** «Гульня ў кіно» (12+).
**3.40** «Вой, мамачкі!» (16+)

## РТР—Беларусь

**7.00** «Раніца Расіі».
**9.10 Серыял «Снайпер. Зброя адплаты» (12+).**
**11.00, 14.00, 17.00, 20.00** Весткі.
**11.25** «Пра самае галоўнае». Ток-шоу (12+).
**12.35** «Лёс чалавека» (12+).
**13.50, 16.50, 19.50, 23.00** Навіны — Беларусь.
**14.30, 22.25, 23.10** «Хто супраць?» Ток-шоу.
**17.25** «60 хвілін». Ток-шоу.
**18.35** «Андрэй Малахаў. Прамы эфір» (16+).
**20.40 Меладрама «Сэрца маці» (12+).**
**0.25** «Вечар з Уладзімірам Салаўёвым».

## НТБ—Беларусь

**6.00** «Астрапрагноз».
**6.05, 7.00, 8.00, 10.00, 13.00, 16.00, 19.00** «Сёння».
**6.10** «За гранню» (16+).
**6.25** «Беларусы» (6+).
**7.10** «Мальцава» (12+).
**8.05 Серыял «Мухтар. Новы след» (16+).**
**8.50, 10.20 Серыял «Адвакат» (16+).**
**9.40, 22.35** «НЗ.by».
**11.15 Серыял «Ляснік» (16+).**
**13.25, 18.25** Агляд. Надзвычайнае здарэнне.
**14.00 Серыял «Мянтоўскія войны» (16+).**
**16.30 Серыял «Павуцінне» (16+).**
**17.25** «ДНК» (16+).
**19.40** «Сёння. Галоўнае».
**19.50 Серыял «Куба» (16+).**
**20.45 Серыял «Шэф» (16+).**
**23.00 Серыял «Сведкі» (16+).**

## 8 канал

**7.00, 15.55, 18.00, 21.05, 0.30** «Надвор'е» + «Эрана».
**7.05, 16.05** М/с «Цімон і Пумба».
**7.30, 16.00** «Гумарынка».
**7.35 Камедыя «Як пазбавіцца ад хлопца за дзесяць дзён» (12+).**
**9.35, 18.05 Серыял «Лягавы» (16+).**
**11.10** «Шлях АБІ» (6+).
**11.35 Драма «Джоні Д» (16+).**
**13.55, 19.45 Серыял «Целаахоўнік» (16+).**
**14.50 Серыял «Хваран» (12+).**
**16.15 Драма «Каліна чырвоная» (0+).**
**19.40** «Рэальны бізнес» (6+).
**20.50** «Вечарніца».
**21.10 Фантастыка «Яно» (18+).**
**23.25 Серыял «Тайны Сільверхейда» (16+).**



## ВТБ

**6.05** «Лаві момант» (16+).
**7.00** «Дурні і дарогі» (16+).
**8.20, 3.10** Скетч-шоу «Адна за ўсіх» (16+).
**9.20** М/ф «Марын і яго сябры» (0+).
**9.50** М/ф «Тры каты» (0+).
**10.10, 16.25** М/ф «Цімон і Пумба» (0+).
**10.45** «Проста кухня» (16+).
**11.20** «Рогаў. Студыя 24» (16+).
**12.20** Серыял «Шчаслівыя разам» (16+).
**14.45** Анімацыйны фільм «Робаты» (12+)
**17.00** Фантастыка «Гадзіла» (12+).
**19.50, 23.20** «Уральскія пельмені» (16+).
**21.00** Фантастыка «Дывергент-2: інсургент» (12+).
**0.45** «Кіно ў дэталях» (16+).
**1.40** Скетч-шоу «Масгарсмех» (16+).
**2.20** Скетч-шоу «Даеш моладзь» (16+).
**4.20** Скетч-шоу «6 кадраў» (16+).

## Культура

**6.30** «Біблейскі сюжэт».
**7.05** «Сцёпа-марак». «Не люба — не слухай». «Чароўнае кольца». «Архангельскія навелы». М/ф.
**8.15** «Масква, любоў мая». Маст. фільм [СЦ].
**9.45** «Тэлескоп».
**10.15** «Маленькая сакрэты вялікіх карцін». Дак. серыял [СЦ].
**10.45** «Чалавек з бульвара Капуцынаў». Маст. фільм [СЦ].
**12.20, 0.45** «Жывая прырода астравоў Паўднёва-Усходняй Азіі». Дак. фільм [СЦ].
**13.10** «Дом вучоных». Філіп Хайтовіч [СЦ].
**13.40** «Неапаль — душа барока». Дак. фільм [СЦ].
**14.30** «Шафёр на адзін рэйс». Маст. фільм».
**16.50** «Продкі нашых продкаў». Дак. серыял [СЦ].
**17.30** «Кіно пра кіно». «Якой павінна быць «Ганна Карэніна»?» Дак. фільм [СЦ].
**18.10** «Квартэт 4х4».
**20.05** «Сіроты забыцця». Дак. фільм.
**21.00** «Агора». Токшоу.
**22.00** «Карп адмарожаны». Маст. фільм [СЦ].
**23.35** «Клуб 37».
**1.35** «Шукальнікі». «Скарбы беларускіх старавераў».
**2.20** «Містар Пронька». «Леў і 9 гіен». М/ф для дарослых.

## Настальгія

**6.00** Тэлеспектакль «Салярыс». 1968 год (12+).
**8.20, 9.45, 11.00, 13.00, 15.45, 17.00, 19.00, 23.40, 2.20, 3.45, 5.00** Музычная настальгія (12+).
**8.35** «Спецыяльна па вашым заказе». Гумарыстычная праграма. 1990 год (12+).
**9.00, 15.00, 3.00** «Мінулы час» (12+).
**10.00, 4.00** «Народжаныя ў СССР» (12+).
**12.00** «Да і пасля...» з Уладзімірам Малчанавым. Год 1989-ы. 2-я частка. 2008 год (16+).
**13.15** «Аншлаг? Аншлаг!» 1988 год (12+).
**14.30** «Марыля Радовіч у Маскве». Фільм-канцэрт. 1983 год (12+).
**16.00** «Колба часу» (16+).
**18.00** Маст. фільм «Дзяўчына спяшаецца на спатканне» (12+).
**19.50** Кінаканцэрт «Дэтэктыў... Дэтэктыў... Дэтэктыў!» 1983 год (12+).
**21.00** «Быў час». 2009 год (16+).
**22.00** Тэлеспектакль «Дзень нараджэння». 1988 год (18+).
**0.00** «Спяем, сябры!» з Тацццянай Візбар. 2007 год (12+).
**1.00** «Вакол смеху». «Студэнцтва». 1982 год (12+).

## EuroSport 1

**1.05, 9.00, 11.55** Watts.
**1.15** Веласпорт. «Тур Брытаніі».
**2.30, 5.00** Снукер. «Мастэрс».
**4.00, 6.30, 12.00, 21.30** Веласпорт. «Вуэльта».
**8.00** Тэніс. US Open.
**9.30** Веласпорт. Гран-пры.
**10.25** Аўтагонкі. WTCR.
**11.25** Алімпійскія гульні. «Жывыя легенды».
**18.45** Веласпорт. «Вуэльта»-экстра.
**19.15, 23.10** Конны спорт. Global Champions Tour.
**21.00** Алімпійскія гульні. Camps to champs.

## Кінакамедыя

**1.15** Шалёныя суседзі (16+).
**2.55** Тэлі і Толі (12+).
**4.10** Мамы (12+).
**6.00** З новым годам, мамы! (6+)
**7.40** Мамы-3 (12+).
**9.30** Банзай (6+).
**11.35** Чумавыя боты (16+).
**13.35** Шалёныя суседзі (16+).
**15.20** Дачка майго боса (12+).
**17.00** Чаго хочуць жанчыны? (16+)
**19.30** Скандынаўскі фарсаж (16+).
**21.20** Скандынаўскі фарсаж. Гонкі на лёдзе (16+).
**23.10** У ложку з Вікторыяй (18+).

## ТБ3

**6.00** Дакументальная калекцыя «Беларусь-фільма» (12+).
**6.55** М/ф (6+).
**9.00** «У выдатнай форме» (12+).
**9.30** «Паехалі» (12+).
**10.00, 23.25** «Перыскоп» (16+).
**10.20** «Хронікі маскоўскага побыту» (16+).
**11.10, 1.15** «Другі шлюб». Серыял (12+).
**14.45** «Вобланчa, магчымы ападкі...-2». Анімацыйны фільм (6+).
**16.15** «Развітанне» (16+).
**17.10** «Кроўныя ворагі». Дак. фільм (16+).
**18.05, 5.15** «Знак якасці» (16+).
**18.55** «10 самых» (16+).
**19.30** «Маскоўская палонніца». Маст. фільм (12+).
**21.25** «Вайна багоў». Фэнтэзі (12+).
**23.45** «Звышнатуральнае». Серыял (16+).
**4.25** «Нераскрытыя тайны» (12+).

## ТБ1000

**6.10** Усмешка Моны Лізы (12+).
**8.25, 2.25** Сямейнае абрабаванне (16+).
**10.05** Кінг Конг (16+).
**13.35** Назад у будучыню (12+).
**15.50** Назад у будучыню-2 (6+).
**17.55, 4.05** Назад у будучыню-3 (6+).
**20.10** Мацільда (6+).
**22.05** Абліві (16+).
**0.35** У гасцях у Эліс (16+).

## ТБ1000 Рускае кіно

**7.55** Падары мне святло Месяца (12+).
**9.55** 4:0 на карысць Танечкі (6+).
**11.35** Сябры сяброў (16+).
**13.20** Арда (16+).
**15.45** Русалка. Возера мёртвых (16+).
**17.25** Бабуля лёгкіх паводзін (16+).
**19.00** Бабуля лёгкіх паводзін-2. Састарэлыя мсціўцы (16+).
**20.45** Кухня. Апошняя бітва (12+).
**23.00** Край (16+).
**1.40** Шчаслівы выпадак (12+).
**3.45** Адной левай (12+).
**5.30** Пра жонку, мару і яшчэ адну... (12+)

## National Geographic

**6.00** Навуковыя недарэчнасці (16+).
**6.20** Золата Юкана (16+).
**7.50** Аўта-SOS (16+).
**9.25** Рэальнасць ці фантастыка? (16+)
**11.00** Унутры неверагоднай механікі (16+).
**12.35** Дзікі тунец (16+).
**14.10, 2.45** Расследаванні авіякатастроф (16+).
**15.45** Закінутыя скарбы мая (16+).
**17.20** Цуды інжынерыі (16+).
**19.00, 22.05** Нераскрытыя тайны Другой сусветнай вайны (16+).
**19.45** Настольная кніга дыктатара (16+).
**20.35** 911: пажарная брыгада ў эпіцэнтры (16+).
**21.20** 911: паветраны кантроль (16+).
**22.55** Будаўніцтва тунэлю (16+).
**23.40** Армстранг (16+).
**0.25** Гітлерюгенд (16+).
**2.00** Вайна Гітлера супраць прэсы (16+).
**4.25** Пачатак (16+).
**5.15** Гульні розуму (16+).

## Discovery

**8.00** Як гэта зроблена? (12+)
**10.15, 3.40** Як устроены Сусвет (12+).
**11.10, 2.45** Аляска: сям'я з лесу (16+).
**12.05** Хуткія і гучныя (12+).
**13.00, 7.10** Экстрэмальныя фургоны (12+).
**13.55** Іржавая імперыя (12+).
**14.50** Вельмі каштоўныя аўто (12+).
**15.45, 4.35** Паляўнічыя на старызну (12+).
**17.35, 20.45** Склады (12+).
**21.15** Мегаперавозкі (12+).
**23.05** Залатая ліхаманка (16+).
**0.00, 6.20** Джэрэмі Уэйд: цёмныя воды (12+).
**0.55** Круты Чэд (12+).

# ХТО Ў ХАТЦЫ ЖЫВЕ?

**Нядаўна на тэрыторыі нашага дома з'явілася таблічка «Выгул сабак забаронены», а на дзвярах пад'езда ЖЭУ вывесіла аб'яву з заклікам зарэгістраваць чатырохногіх кватарантаў. Пад ёй — канкрэтная дата, да якой гэта можна зрабіць добраахвотна. У іншым выпадку наяўнасць жывёлы ў кватэры камунальнікі паабяцалі высветліць іншым спосабам — напрыклад, падчас рэйдаў. Аб'яву месяц таму знялі. Цікава, чым усё скончылася?**

— Такім чынам мы нагадваем грамадзянам, што жывём у цывілізаванай дзяржаве, — тлумачыць **начальнік аддзела эксплуатацыі і добраўпарадкавання Магілёўскага УКП (упраўленне камунальных прадпрыемстваў) Сяргей МАКАРАНКА.** — У заканадаўстве выразна прапісана, што кожны, хто мае хатнюю жывёлу, павінен плаціць падатак. Але гэты факт чамусьці многія ігнаруюць.

Нагодай для актывізацыі дзеянняў стаў зварот да камунальнікаў падатковай інспекцыі. Сяргей Уладзіміравіч дэманструе афіцыйную паперу, дзе напісана, што гаспадар сабакі павінен зарэгістраваць свайго гадаванца ў жыллёва-эксплуатацыйнай арганізацыі ў трохдзённы тэрмін з моманту набыцця. Раз на квартал ён павінен плаціць 1,5 базавай велічыні за ўтрыманне сабакі патэнцыйна небяспечнай пароды і 0,3 — ва ўсіх астатніх выпадках. Для чыпаваных і стэрылізаваных сабак у Магілёве існуюць ільготы — мінус 10 % ад гэтай лічбы.

УКП падрыхтавала памятку для ўладальнікаў сабак і катоў, якая нагадвае пра неабходнасць рэгістрацыі.

— Будзем размяшчаць яе на інфармацыйных дошках жылых дамоў, — удакладняе суразмоўца. — Падставы вельмі сур'ёзныя. У пачатку лета на тэрыторыі Магілёва былі выпадкі шаленства сабак. Гэта ненармальна, калі нешта пагражае чалавеку.

Па некаторых звестках, у Магілёве каля 3000 зарэгістраваных сабак і прыблізна каля 800 катоў. Толькі ў Ленінскім раёне легальна жывуць 1397 сабак і 260 катоў.

— Катоў таксама трэба рэгістраваць, але аплата за іх не спаганяецца, — удакладнілі ў ЖРЭУ (жыллёва-рамонтным эксплуатацыйным упраўленні) Ленінскага раёна.

Выяўляюць незарэгістраваных жывёл рознымі спосабамі. Дзесьці дапамагаюць камеры відэаназірання, дзесьці «добрыя» суседзі, дзесьці жывёлы самі выдаюць сваіх гаспадароў выццём, гаўканнем ці мяўканнем. Акрамя гэтага, камунальнікі праводзяць штомесячныя рэйды, падчас якіх аглядаецца тэрыторыя, праводзяцца пакватэрныя абходы.

Што датычыцца падатку, то ён цалкам трапляе ў даходную частку мясцовага бюджэту. Развіццё за яго кошт інфраструктуры для катоў і сабак, на жаль, не прадугледжана. На сённяшні дзень у Магілёве 35 пляцовак для выгулу сабак. Але гэта звычайныя пустыры, якія знаходзяцца на аддаленні ад жылых будынкаў. Ніякіх агароджаў, турнікетаў і абсталявання для актыўнага адпачынку чатырохногіх там няма.

— У нас на сённяшні дзень няма такога артыкула затрат і няма нормаў, якімі павінны быць загароды, іх вышыня, — патлумачылі ў Ленінскім ЖРЭУ. — Заканадаўствам наогул не вызначана, што павінна быць у месцах выгулу сабак, але там выразна прапісана, што такія месцы павінны быць. Калі вы ўбачыце на такіх пляцоўках нейкія прыстасаванні для падтрымання сабакам формы, то гэта справа рук выключна добраахвотнікаў, якія спрабуюць самастойна зрабіць нешта зручнае для сваіх улюбёнцаў.

Хоць было б справядліва, калі б падатак «на хвост» ішоў не ў агульную скарбонку, а на стварэнне ўмоў для саміх жа чатырохногіх. На гэтыя грошы можна было б рабіць цывілізаваныя пляцоўкі для выгулу сабак і прытулкі для бадзяжных жывёл. Напэўна, у Беларусі няма населенага пункта, дзе б не бадзяліся пушыстыя беспрытульнікі. Іх па-чалавечы шкада, бо яны чакаюць ад нас дапамогі. А іх адлоўліваюць і знішчаюць. І гэта бесчалавечна. Мы павінны быць адказнымі за тых, каго прыручылі.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

# Які гаспадар, такі і гадаванец

**На пачатак года ў Гомелі афіцыйна было зарэгістравана звыш 4,5 тысячы сабак і 2,6 тысячы катоў. Кожны з іх уладальнікаў падчас рэгістрацыі ў сваіх ЖЭУ і РЭУ быў азнаёмлены з санітарнымі, ветэрынарнымі правіламі ўтрымання хатніх жывёл і атрымаў на свайго чатырохногага сябра адпаведны жэтон і пасведчанне.**

**Намеснік начальніка жыллёвага аддзела КВУП «Гомельская гарадская ЖКГ» Наталля БЫРКОВА** кажа, што для забеспячэння поўнага ўліку хатніх жывёл, якія жывуць у шматкватэрных дамах, жыллёва-эксплуатацыйнымі арганізацыямі штомесяц праводзяцца рэйдавыя праверкі:

— Летась спецыялістамі КЖРЭУП чатырох раёнаў Гомеля было праведзена амаль 400 праверак па выяўленні незарэгістраваных сабак і катоў. Таксама ўладальнікі патэнцыйна небяспечных парод павінны прад'явіць даведкі пра іх навучанне. Мы звяртаем увагу і на факты выгулу сабак, якія не адпавядаюць правілам утрымання. Па выніках праверак выдадзена амаль 2 тысячы прадпісанняў і складзена 400 пратаколаў аб адміністрацыйных правапарушэннях.

Калі вельмі хочацца завесці бультэр'ера ці мастыфа, з сабакам байцовай пароды давядзецца прайсці абавязковае навучанне ў КУП «Спецкамунтранс». Інакш яго не зарэгіструюць. У тым выпадку, калі гаспадар не жадае ставіць свайго любімца на ўлік, адмаўляецца выплачваць падатак ці дапускае парушэнне правіл утрымання, яго могуць прыцягнуць да адміністрацыйнай адказнасці.

Дарэчы, у Гомелі існуе толькі пяць спецыяльных пляцовак, дзе гадаванцы могуць добра размяцца. І гэтыя тэрыторыі ствараюцца для трэніровак жывёл, а не як месца, дзе яны спраўляюць натуральныя патрэбы, нагадвае спецыяліст:

— Той, хто завёў сабаку, абавязаны і прыбіраць за ім. Не трэба забываць і пра ланцужок. Для сабак буйных парод абавязковы аксесуар — наморднік. Каб выключыць усялякія непрыемныя сітуацыі, да ашыйніка павінен быць прымацаваны жэтон. Безнагляднымі сабакі і каты, у тым ліку з ашыйнікамі, жэтонамі і ў намордніках, падлягаюць адлову. Пры гэтым абавязковае чыпаванне хатніх жывёл існуючым заканадаўствам не прадугледжана.

Як расказала **начальнік фінансавага ўпраўлення Гомельскага гарвыканкама Алена РАДЧАНКА,** грошы, якія грамадзяне выплачваюць у якасці падатку, збіраюць КЖРЭУПы, потым яны ідуць у гарадскі бюджэт і накіроўваюцца на ўтрыманне КУП «Спецкамунтранс».

* * *

**Дарэчы, на гэтым тыдні міліцыянеры ўстанавілі асобу гамяльчаніна, які 28 жніўня зайшоў у салон тралейбуса № 20 са стафтэр'ерам без намордніка і з ланцужком, наматаным на ашыйнік.**

Калі людзі папрасілі грамадзяніна прытрымаць свайго сабаку, мужчына адрэагаваў неадэкватна. Ён пачаў абражаць пасажыраў і пагражаць ім. Сведкі інцыдэнту звярнуліся ў міліцыю і перадалі праваахоўнікам запісанае відэа.

Супрацоўнікі аддзела ўнутраных спраў адміністрацыі Савецкага раёна Гомеля знайшлі неадэкватнага пасажыра. Высветлілася, што 29-гадовы беспрацоўны гамяльчанін больш чым 30 разоў прыцягваўся да адміністрацыйнай адказнасці, галоўным чынам за парушэнне правіл дарожнага руху і знаходжанне ў грамадскім месцы ў стане алкагольнага ап'янення. Акрамя таго, ён быў асуджаны за згвалтаванне.

Вядома, што суседзі неаднаразова звярталіся да гаспадара стафтэр'ера з просьбай выкарыстоўваць намордік, але ён ігнараваў просьбы. Як расказаў **афіцыйны прадстаўнік УУС Гомельскага аблвыканкама Віталь ПРЫСТРОМАЎ,** у дачыненні да грамадзяніна за парушэнне правіл утрымання хатніх жывёл складзены адміністрацыйны пратакол.

Трэба памятаць, што паводле артыкула 15.47 «Парушэнне правіл утрымання хатніх і (ці) драпежных жывёл» Кодэкса Рэспублікі Беларусь аб адміністрацыйных правапарушэннях можна атрымаць салідны штраф — ад адной да пятнаццаці базавых велічынь. Калі парушэнне пацягнула прычыненне шкоды здароўю людзей ці маёмасці — ад дзесяці да трыццаці базавых велічынь ці адміністрацыйны арышт.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**




# Ці хапае ў Мінску пляцовак для выгулу жывёл?

**З гэтым пытаннем мы прайшліся па вуліцах Першамайскага раёна. Менавіта тут знаходзіцца шмат паркаў і ўзлессяў, дзе вельмі часта можна сустрэць гаспадароў хатніх жывёл. Чаму тут, а не ў спецыяльна вызначаных месцах, — даведаецеся далей.**



**Алена, гаспадыня Аксель:**

— У нашым раёне насамрэч шмат паркаў, таму выйсці на шпацыр з сабакам ёсць куды. Канешне, такія месцы не прызначаны для гэтай справы, але і мне, і Аксель тут утульна і камфортна. Ведаю адну спецыяльную пляцоўку для выгулу жывёл, але яна знаходзіцца адносна далёка ад дома, а гэта нязручна. Да таго ж я ўзяла сабаку ў даволі вялікім узросце, відаць, ён прывык адчуваць сябе вольна, таму я не баюся яго адпускаць. За сабакам заўсёды прыбіраю.



**Арцём, гаспадар Норыса:**

— Я лічу, што ў Мінску не хапае месцаў для выгулу жывёл. Навокал толькі дзіцячыя пляцоўкі і паркі. У некаторых месцах нават шыльдачкі стаяць: «Нельга выгульваць сабак!» А куды мне яго выводзіць? Таму тут і ходзім.



**Ірына, гаспадыня Рычы:**

— Пляцовак не хапае ад слова «зусім». А калі і ёсць, то яны не абсталяваны як трэба. Таму і давадзіцца гуляць у парках. На дзіцячыя пляцоўкі мы не ходзім: гэта няправільна. Хоць я і заўсёды прыбіраю за Рычы, не ўсе робяць так. Да таго ж вялікія сабакі павінны быць у намордніках.



**Соф'я Міронаўна, гаспадыня Гара:**

— З Гарам гуляем па дварах ды ў парках. А дзе яшчэ? Калі ў парку яшчэ нармальна на гэта рэагуюць, то каля двароў у людзей узнікаюць пытанні. У каго дзеці, у каго больш вялікія сабакі. А я за яго баюся, ён у мяне маленькі і вельмі добры, нікуды не ўлазіць. Знайшла яго гады чатыры таму, з таго часу і не расстаёмся.



**Аляксандр, гаспадар Сцяпана:**

— Спецыяльных месцаў не хапае. Ёсць толькі адна пляцоўка, але далёка. Хацелася б, каб пабудавалі хоць па адной пляцоўцы на кожны раён. Таму што даводзіцца гуляць у дварах, у парках. Мы заўсёды прыбіраем за Сцяпанам, але не ўсе гаспадары аднолькавыя, а тут гуляюць дзеці.

**Маргарыта ГАЙДАРЖЫ,**
**студэнтка 4 курса факультэта журналістыкі БДУ.**

ХТО ПАБАЧ?

# «ЗНАЁМЦЕСЯ, АФАНАСІЙ»

**Сёння ўсё больш жыхароў сталіцы вырашаецца завесці незвычайных для гараджан жывёл. Напрыклад, згадайце гісторыю з ваўком у Сухараве. Дзікая жывёла вымушана была сядзець на ланцугу ў двары аднаго з дамоў прыватнага сектара. Гаспадару жывёлы давялося заплаціць штраф за парушэнне ўмоў утрымання дзікага звера, але ён усё ж не адмовіўся ад свайго сябра, а пабудаваў у сябе на ўчастку вальер.**

**Ці прыгадаем мужчыну, у якога на кватэры вылупілася гусяня і які стаў выкладваць на «Ютубе» відэа пра жыццё свайго крылатага сябра...**

**А нядаўна ў прэсе з'явілася гісторыя пра маладога чалавека, які завёў сабе ліса і цяпер гуляе з ім па горадзе, атрымліваючы асалоду ад увагі супрацьлеглага полу.**

**Маша, жыхарка сталіцы, любіць звыклых для многіх людзей сабак, але завяла сабе... пітона.**



Дзяўчына прызналася, што можа з'ехаць у падарожжа на доўгі тэрмін. Сабака, маўляў, будзе пакутаваць ад разлукі, а вось яе незвычайны гадаванец — наўрад ці.

— З пітонамі ўсё прасцей, — кажа гаспадыня. — Яны не патрабуюць пастаяннага кантакту, бо ў змей не фарміруецца эмацыянальная сувязь з гаспадаром. Праўда, здаецца, што пітон прывык да майго дому, паху і хутчэй за ўсё адчувае сябе больш упэўнена ў знаёмым месцы. Ды і сама я ўжо прывязалася да яго.

Змяю Маша атрымала ў падарунак ад сябра. Папярэдні гаспадар пітона назваў яго Афанасіем. З цягам часу малады чалавек зразумеў, што больш не можа даглядаць змяю. Але ён не гатовы быў аддаваць гадаванца ў заапарк, а хацеў знайсці чалавека, якому было б цікава даглядаць паўзуна, пры гэтым больш-менш адказнага ў гэтай справе.

— Калі я першы раз убачыла Афанасія, то не магла адарваць ад яго вачэй, — успамінае дзяўчына. — Ён павольна поўзаў, і мне ўвесь час хацелася яго ўзяць і пагладзіць. Мне падабаліся яго мяккія звівістыя рухі. Памятаю, як стрымлівала сябе, была вельмі асцярожная, каб не зрабіць пітону непрыемнага.

Маша ніколі не адчувала страху перад змеямі. Калі яна ў дзяцінстве першы раз дакранулася да рэптыліі, то вельмі здзівілася, бо была ўпэўнена, што яны слізкія, а аказалася — не. Пітоны — змеі неядавітыя, таму Маша часта дазваляе гадаванцу «гуляць» па кватэры. Праўда, перад гэтым ёй даводзіцца затыкаць усе шчыліны, каб змяя не выпаўзла наведаць суседзяў.

Але аднойчы Афанасій усё ж напужаў сваю гаспадыню тым, што знік. Два дні Маша шукала яго. Вельмі турбавалася, што ён можа напалохаць суседзяў ці загіне ад рук людзей. Праз два дні бегляк знайшоўся сам — вылез з музычнай калонкі. З той пары Маша стараецца быць больш уважлівай падчас «прагулкі» змяі па кватэры.

Яшчэ новай гаспадыні Афанасія давялося змяніць меню свайго гадаванца. Былы гаспадар карміў яго жывымі мышамі, і пітон хутка з імі распраўляўся. Але Машы здалося, што Афанасію мала маленькай мышкі. Справа ў тым, што пітоны растуць усё жыццё і яе гадаванец «не даганяў да нормы». І вось падчас імправізаванага палявання на больш буйную мыш тая падрапала пітону скуру, і на тым месцы расплылася вялікая гематома. Маша вельмі нервавалася, але ўсё абышлося. З таго часу драпежніку падаюць размарожаных мышак. Ад гэтага лепей усім: гадаванец у бяспецы, а Машы не трэба даваць яму жывых істот штомесяц (а ў гэтым прыемнага было мала). Выдаткоўвае на ежу гаспадыня ўсяго 10-12 рублёў, гэта значна танней, чым утрымліваць кошку. Але... Мой кот мне ўсё ж мілейшы, ён і мяккі, і пушысты, і ўмее тэрапеўтычна мурлыкаць. Праўда, кожнаму сваё.

**Наталля ТАЛІВІНСКАЯ, фота аўтара.**

МЕРКАВАННЕ

# ЭПІДЭМІЯ АНТЫГУМАНІЗМУ

## З пачаткам грыбнога сезона рэзка ўзрастае колькасць бадзяжных жывёл. Гараджане вывозяць гадаванцаў у лясы

Летась у Мінску мужчына з п'яных вачэй скінуў сабаку з балкона, пра гэта пісалі з абурэннем ледзь не ўсе сродкі масавай інфармацыі. Асуджаны пазней мінчанін прыйшоў тады дапамагчы маці сваёй жонкі з рамонтам. На вочы трапіў цешчын сабака, які не пажадаў ісці на прагулку з п'яным чалавекам — жывёлы, дарэчы, вельмі часта негатыўна рэагуюць на алкаголь. Тады абураны homo sapiens пабіў няшчасную жывёліну і выкінуў з балкона пятага паверха. Людзі, якія сталі сведкамі здарэння, патэлефанавалі ў міліцыю. Была заведзеная крымінальная справа па частцы 1 артыкула 339-1 Крымінальнага кодэкса (жорсткае абыходжанне з жывёлай, якое выклікала гібель). Кажуць, што вінаваты раскаяўся ў судзе. Яно і вядома, мусіш каяцца, як засвеціць рэальны тэрмін. А можа, сцяміў што-небудзь пра свае паводзіны, калі абуралася ўся краіна, хацелася б верыць.

На жаль, гэта далёка не адзіны выпадак. Праз некалькі месяцаў зноў у СМІ з'явілася паведамленне, што п'яная кампанія ў Віцебску выкінула з балкона цяпер ужо трэцяга паверха шчанюка. Праўда, гэтым разам сабачка выжыў, яму дапамаглі валанцёры, з часам уладкавалі ў сям'ю.

Можна згадаць іншыя «гучныя» справы — напрыклад, калі рыбак у Чашніцкім раёне адкруціў галовы шасці птушанятам бакланаў, таму што яны перашкаджалі яму засяродзіцца на рыбнай лоўлі. А некалькі гадоў таму ў сеціве ўзнік амаль што цэлы рух, які асуджаў жорсткасць у дачыненні да добермана Эйса. Гаспадар, які ўзяў сабаку ў прытулку, праз тыдзень адсек яму галаву, бо жывёла не выконвала санітарныя правілы паводзін. Такія прыклады можна згадваць дзясяткамі. Катоў знаходзяць з адсечанымі хвастамі і выкалатымі вачамі, сабак з адсечанымі лапамі і ўсяляк пакалечаных. На жаль, двухногія садыстаў у грамадстве хапае. І ад іх церпяць не толькі браты нашы меншыя. Нездарма ж псіхолагі, якія спецыялізуюцца ў пытаннях хатняга гвалту, раяць дзяўчатам прыглядацца да таго, як кавалер альбо каханы паводзіць сябе з жывёламі. Праяўленне агрэсіі да бездапаможнай істоты часта сведчыць пра агрэсіўны характар у цэлым.

У нашым заканадаўстве цяпер ёсць адпаведны артыкул, па якім можна прыцягваць да адказнасці крыўдзіцеляў жывёл. І гэта апошнім часам збольшага робіца. Ды і грамадства асуджае падобныя з'явы. Але ж не меншага асуджэння заслугоўвае псеўдагуманізм суайчыннікаў, якія не забіваюць, не ўсыпляюць гадаванцаў у лячэбніцах, а выкідваюць іх на вуліцу і тым самым часта асуджаюць жывую істоту на доўгія пакуты і павольную смерць. Адсюль праблема бадзяжных сабак і катоў у гарадах.

Праўда, у гарадах, асабліва вялікіх, ёсць службы, якія займаюцца адловам жывёл, размяшчэннем іх у прытулку. Больш складаная сітуацыя ў сельскай мясцовасці. Нядаўна ў адным з сельсаветаў Кобрынскага раёна расказалі, што колькасць бадзяжных сабак у вёсках шматкроць узрастае з пачаткам грыбнога сезона.

— ?!

— Гараджане ў гэтую пару выязджаюць на ціхае паляванне, а заадно прыхопліваюць гадаванцаў, каб... выкінуць іх на ўзлеску паблізу вёсак.

А што, лета прайшло, дзеці нацешыліся катом ці сабачкам, да таго ж мілае кацяня ці шчаня, якога бралі вясной на пацеху малым, падрасло. Цяпер меншым членам сям'і трэба ў школу, дарослым на работу, выгульваць былога любімца няма каму, трэба нешта вырашаць — разважае часам гаспадар кватэры ды і жонка пагаджаецца з галавой сям'і. А калі гадаванец яшчэ робіць лужыну на падлозе альбо драпае дарагую мэблю, кіпцюрамі пакідае зацяжкі на шторах, прысуд гаспадыні адназначны: вязіце яго куды хочаце. «Везці ў лячэбніцу, трэба плаціць, час траціць, — чухае патыліцу гаспадар, ды і дзеці не хочуць усыпляць Барсіка, — а вось у наступную суботу паедзем у грыбы, туды і прыхопім. Можа, якой адзінокай бабулі прыглянецца». І з пачуццём уласнага гуманізму і выканання перад сям'ёй абавязку гарадскія кіроўцы выкідваюць няшчасную жывёліну з машыны, часта на хаду.

Толькі ў вясковай бабулі, як правіла, ёсць свой сабака альбо кот. Да таго ж часта выкідаюць хворых жывёлін, бо лячыць — гэта ж таксама азначае дадатковыя затраты з сямейнага бюджэту. Вось летась каля вёскі Ліпава памянёнага Кобрынскага раёна ашываўся даволі вялікі сабака, потым ён адзічэў, азлобіўся з голаду і стаў душыць вясковых курэй. Праз некаторы час небараку забілі абураныя гаспадары. А цяпер, расказалі ў гэтай вёсцы, з надыходам восені пабольшала катоў, значыць, падвозяць іх бессаромныя гараджане. Выкідаюць, як старую адзежыну ці паламаную рэч.

Летась і аўтару гэтых радкоў давялося бачыць кацяня, якое, відавочна, толькі што выкінулі з машыны. Мы тады праехалі на дачу ў Камянецкім маршруткай. Ад шашы трэба ісці каля трох кіламетраў. І толькі збочылі на свой паварот, як з дрэва з жахліва-немым мяўканнем спусцілася дзіўная істота. Цалкам чорнае кацяня было і не падобнае на кацяня, бо галава ў яго крыху ненатуральным чынам аказалася вывернутая на бок. «Гэта што за чарцяня?» — здзіўлена вымавіў сын. Можа, хацелі скруціць галаву катку, ды не давялі справу да канца альбо трапіў ён галавой пад кола і цудам застаўся жывы? Адным словам, той незвычайны каток дайшоў за намі да вёскі, там яго пакінула ў сябе сям'я, у якой летам жыве малы ўнук. За год наша Чарцяня вырасла ў добрага кацяру, які выглядае страшнавата, бо бегае па вуліцы з крыху скрыўленай набок галавой. Гэтаму яшчэ пашанцавала. А колькі іх так і канае ўздоўж дарог без вады і ежы!

> Не меншага асуджэння заслугоўвае псеўдагуманізм суайчыннікаў, якія не забіваюць, не ўсыпляюць гадаванцаў у лячэбніцах, а выкідваюць іх на вуліцу і тым самым часта асуджаюць жывую істоту на доўгія пакуты і павольную смерць.

Падобных гісторый у кожнага, калі падумаць, цэлы мех. Вунь калега з Мінска ўбачыла шчанючка на запраўцы і не магла прайсці, забрала, цяпер ён жыве ў іх. А калега з Гродна падабрала сабачку, стала гуляць з ім у двары, дык што вы думаеце? Знайшліся гаспадары, сказалі, што ён збег ад іх, забралі, а праз тыдзень вярнулі ёй зноў, маўляў, сікае не там, і наогул нацешыліся яны...

Ды што там гаварыць, праблемы бадзяжных жывёл ствараюць іх былыя гаспадары. На вуліцу жывёліна трапляе толькі ад некага з дому. А потым, калі выжывае, бескантрольна размнажаецца. Калі няма свядомасці, культуры, спагады ў суайчыннікаў, трэба ўстанаўліваць меры процідзеяння заканадаўча. Я лічу, што павінен быць падатак на ўтрыманне жывёлы, і не сімвалічны, тады іншы падумае, заводзіць яму гадаванца ці не. Вось у Нідэрландах няма бадзяжных жывёл наогул, бо там вялікі падатак. Ну і пагалоўнае чыпаванне неабходна, тады лягчэй будзе адсачыць, чый сабачка з галаду пайшоў душыць курэй у Кобрынскім раёне альбо чыё кацяня прападае ў Камянецкім.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

# НЕ РЭЧЫ, А ЖЫВЫЯ ІСТОТЫ



Пляцоўка для выгулу сабак у Вільнюсе.

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС».)*

У нашай краіне больш за дзесяць гадоў не могуць прыняць закон «Аб абыходжанні з жывёламі». Больш за тое, ініцыятыва аб прыняцці такога дакумента зыходзіла ад абаронцаў жывёл, цяпер жа яны не маюць магчымасці абмеркаваць самы апошні варыянт праекта. «На сённяшні дзень праект знаходзіцца ў Міністэрстве жыллёва-камунальнай гаспадаркі. На жаль, у склад рабочай групы, якая займаецца распрацоўкай закона, не ўваходзяць зоаабаронцы. Іх прысутнасць неабходна, бо мы ведаем тое, чаго не ведаюць людзі, якія разглядаюць праект, — кажа **Вольга АГЕЕВА, каардынатар зоаабарончага руху Беларусі «Разам»,** саветнік намесніка старшыні Ліберальна-дэмакратычнай партыі па ахове прыроды. — Ідзя абаронцаў жывёл у тым, каб гэты закон перш за ўсё абараняў правы жывёл. Усе папярэднія праекты былі накіраваны на тое, каб зрабіць зручным жыццё людзей. Пры правільным падыходзе адно другому не перашкаджае: і жывёлы ў бяспецы, і людзям камфортна».

Нягледзячы на адсутнасць закона аб абыходжанні з жывёламі, адказнасць за жорсткае абыходжанне з імі прадугледжана на Кодэксам Рэспублікі Беларусь аб адміністрацыйных правапарушэннях. Роўна як і адказнасць грамадзян за парушэнне згаданых правіл. Аднак у адпаведнасці з Грамадзянскім кодэксам Беларусі жывёла мае статус рэчы. Можа, таму з імі нярэдка абыходзяцца як з неадушаўлёнымі прадметамі? А ў законе павінна быць дакладна прапісана, што сабакі, каты і іншыя жывёлы, якіх людзі эксплуатуюць у цырках, кантактных запарках, — не рэчы! Фармулёўка, якую прапануе Вольга Маёрава, — «жывыя істоты».

## Адтэрміноўка прысуду — пяць дзён

Дзяржаўнае прадпрыемства «Фаўна горада» асацыюецца ў мінчан з пунктам усыплення жывёл. На сайце гэтай арганізацыі сказана, што яна не менш за пяць дзён часова трымае адлоўленых безнаглядных жывёл і жывёл, якія паступілі ад насельніцтва сталіцы. Гэта значыць, за пяць дзён павінен знайсціся стары гаспадар ці з'явіцца новы, інакш сабака або кот адправяцца ў вечнасць. Сярод гэтых бадзяжных жывёл шмат маладых і цалкам здаровых, нягледзячы на вулічныя ўмовы жыцця, але яны асуджаныя. У зоаабаронцаў не хапае месцаў для ўтрымання такіх жывёл, таму што іх вельмі шмат.

Чаму так адбываецца? Чаму адзіны спосаб рэгулявання колькасці бадзяжных жывёл — адлоў з наступнай эўтаназіяй? Можна, вядома, ківаць на чыноўнікаў, дэпутатаў — яны ніяк не могуць пачуць абаронцаў жывёл і прыняць адпаведны закон «Аб абыходжанні з жывёламі». Але давайце паглядзім на звычайных людзей. Вось у скверыку сядзіць маладая жанчына, уткнуўшыся ў гаджэты, яе дзіця дзесьці гуляе само па сабе. Як толькі ў полі зроку з'яўляецца чалавек з сабакам, суластаўным па памерах з катом, да таго ж на ланцужку, пачынаецца істэрыка: «Ваш сабака пакусае маё дзіця, ваш сабака — разносчык інфекцый». Як гэтае дзіця потым будзе ставіцца да жывёл? Гэта не чыноўнікі і не дэпутаты пакідаюць восенню на дачах жывёл, а нашы суседзі. Гэта спадкаемцы пажылых людзей карыстаюцца пакінутай ім нерухомасцю, выкідваючы на вуліцу хатніх гадаванцаў памерлых сваякоў. Вось таму павялічваецца колькасць кінутых людзьмі жывёл. А адлоў і ўсыпленне, якія практыкуюцца з 2004 года, неэфектыўныя. Таму што на змену кожнай, будзем называць рэчы сваімі імёнамі, забітай жывёле прыйдуць дзве-тры новыя, выкінутыя былымі гаспадарамі, або якія з'явіліся на свет ад бяздомных бацькоў.

> ❍ ГЭТА ЦІКАВА!
>
> **У Мінску працуе «Котакафэ», у якім кампанію наведвальнікам складаюць сімпатычныя мурзікі. Цікава і тое, што Cat Cafe ў Вільнюсе адкрылі нашы суайчыннікі з літоўскімі партнёрамі.**

Між тым жыхары розных гарадоў не раз скардзіліся, што адлоў жывёл адбываецца на вачах дзяцей і часам не абыходзіцца без жорсткасці. Актывісты зоаабарончага руху «Разам» правялі перамовы з кіраўніцтвам «Фаўны горада», якое пагадзілася экіпіраваць відэарэгістратарамі работнікаў, якія выязджаюць на адлоў жывёл.

«У нашай краіне няма дзяржпрытулкаў для жывёл, і ні ў якіх дакументах няма такога тэрміна, — тлумачыць Вольга Агеева. — Тыя прытулкі, якія ладзяць валанцёры на свае страх і рызыку, па факце з'яўляюцца незаконнымі. Але гэта адзіны спосаб выратоваць жывёлу ад эўтаназіі».

Зрэшты, у Віцебску месца ўтрымання бяздомных жывёл называюць прытулкам, і ўтрымліваецца яно за кошт бюджэту. Але тут не забіваюць жывёл! «У Віцебску, калі не атрымоўваецца знайсці добрыя рукі, сабакі і каты застаюцца ў прытулку да канца жыцця, — дзеліцца ўражаннямі Вольга Агеева. — Персаналу гэтай установы дапамагаюць неабыякавыя гараджане, таксама актыўна шэфствуюць школьнікі — перадаюць корм, пасцілкі. Літаральна днямі ў прытулку змянілася кіраўніцтва, і ўсе зоаабаронцы спадзяюцца, што тут захаваюцца традыцыі гуманнага стаўлення да нашых меншых братоў».

## Стэрылізацыя, вакцынацыя, свабода

Па вопыце нашых суседзяў можна казаць толькі пра адзін эфектыўны спосаб зніжэння колькасці бяздомных жывёл — стэрылізацыю. І не толькі тых, якія ўжо на вуліцы, але і хатніх. Далёка не кожны гаспадар падвяргае гадаванца гэтай аперацыі. Па розных прычынах: ад «навошта ўмешвацца ў прыроду» і рэлігійных да фінансавых. І сапраўды, працэдура не з танных. На дзяржаўнай ветстанцыі стэрылізацыя кошкі каштуе 75 рублёў, сабакі — 110. У прыватных ветклініках разбежка ад 45 да 110 рублёў за стэрылізацыю кошкі, сабакі — ад 70 да 250.

Што датычыцца рэлігійных матываў, то пазіцыя каталіцкай царквы вядомая: стэрылізацыя значна больш гуманная, чым цяжкае жыццё бяздомных жывёл і іх галодная смерць. Пасля сустрэчы прадстаўнікоў зоаабарончага руху «Разам» і аб'яднання дапамогі бяздомным жывёлам «Заашанц» у Беларускім экзархаце праяснілася пазіцыя праваслаўнай царквы. Яна таксама падтрымлівае стэрылізацыю жывёл. Вядома, прыхаджане часам наракаюць, што гэта дарагая працэдура. Але можна звярнуцца ў «Заашанц» і атрымаць талон, які дае істотную зніжку на аперацыю.

Як расказала Вольга Агеева, цяпер зоаабарончы рух «Разам» працуе над стварэннем цэнтра бясплатнай стэрылізацыі для жывёл. Адным з партнёраў праекта з'яўляецца ветклініка «Сас Энімал Сэрвіс», якая акажа неабходную арганізацыйную дапамогу зоаабаронцам. Вядомая сусветная статыстыка: пасля таго як 70 % жывёл стэрылізаваныя, адбываецца прыкметнае скарачэнне колькасці бездагляднах жывёл, а праз пяць гадоў іх зусім не застаецца.

## Куды ідзе падатак за валоданне сабакамі

У нас хадзіць з сабакамі ўсюды забаронена: у парках, скверах. А ў Літве, напрыклад, можна гуляць з сабакам у Бернардзінскім парку пры ўмове, што даўжыня ланцужка не большая за метр і на ўсялякі выпадак ёсць пакецік. Не кажучы пра тое, колькі гараджан ходзяць з сабакамі. А ў нас ці мы шмат бачым людзей з сабакамі на цэнтральных гарадскіх вуліцах? Цяпер гаспадары сабак і ўвогуле занепакоеныя тым, што ў цэнтры Мінска зоаненавіснікі раскідалі атручаную ежу.

У нашай краіне існуе падатак за валоданне сабакамі, які павысіўся сёлета. У Мінску стаўка падатку за пароды сабак, уключаныя ў пералік патэнцыйна небяспечных, складае 1 базавую велічыню (25,5 рубля) на квартал. За астатніх хатніх гадаванцаў іх гаспадарам давядзецца заплаціць 0,3 базавай велічыні на квартал (7,65 рубля). Па словах **рэферэнта ўпраўлення жыллёвай гаспадаркі МЖКГ Наталлі КРОХ,** сродкі ад гэтага падатку паступаюць у мясцовыя бюджэты. А выдаткоўваюцца яны «на адлоў і ўтрыманне бяздомных жывёл і на ўтрыманне і бягучы рамонт абсталявання і пляцовак для выгулу хатніх жывёл».

Што датычыцца колькасці пляцовак для выгулу, то ў Мінску 49 пляцовак, якія знаходзяцца на балансе арганізацый ЖКГ. Зусім няшмат для двухмільённага горада! Выклікае пытанні іх размяшчэнне: недзе дзве пляцоўкі на адной вуліцы, а недзе — адна пляцоўка на пяць кварталаў. Як патлумачыла **галоўны спецыяліст аддзела па добраўпарадкаванні, санітарным утрыманні жылога фонду ДА «Мінская гарадская жыллёвая гаспадарка» Кацярына КОРНЕВА,** па існуючых горадабудаўнічых нормах мінімальная адлегласць ад вокнаў жылых дамоў да пляцоўкі для выгулу сабак павінна складаць 40 метраў. У раёнах старой забудовы трапіцца ў гэтую норму праблематычна. Што да новай забудовы, то пляцоўкі праектуюцца. Пытанне ў тым, ці даходзіць праект да рэалізацыі, ці аўтамабілісты адбіваюць месца для паркоўкі альбо банальна не хапае сродкаў.

Адказныя гаспадары жывёл выгульваюць гадаванца з пакецікам, аднак куды яго падзець? Данасім да найбліжэйшай сметніцы. А, напрыклад, у Таліне ў кожным скверы і парку ўстаноўлены спецыяльныя скрыні для гэтых самых пакецікаў. Ва Украіне таксама ёсць спецыяльныя скрыні «для відходів тварин». Па словах Кацярыны Корневай, пытанне аб устаноўцы такіх скрынь разглядалася, але паколькі фінансавыя магчымасці абмежаваныя, то ў найбліжэйшы час не варта спадзявацца на паляпшэнне інфраструктуры для сабак.

## Чаму ў Еўропе няма бяздомных сабак?

У нас любы чалавек можа ўзяць дахаты сабаку або ката. Калі жывёла перастае падабацца, расчароўвае свайго гаспадара, ён проста выкідвае яе на вуліцу. І гэта ў найлепшым выпадку. Вядомы факты, калі сабак вывозілі за горад, прывязвалі ў лесе. Для чалавека, які выкінуў жывёлу, ніякага пакарання не прадугледжана. У нас жа нават не ўсе рэгіструюць хатніх гадаванцаў, водзяць іх на прышчэпкі. Да сабак і катоў сапраўды стаўленне як да рэчаў: надакучылі, зламаліся — выкінулі. Таму зоаабаронцы дамагаюцца ўнясення змяненняў у артыкул 137 Грамадзянскага кодэкса, які вызначае жывёлу як рэч.

Іншая справа ў Еўропе. Там уладальнік абавязаны жывёлу чыпаваць, своечасова рабіць прышчэпкі, ствараць умовы для камфортнага жыцця гадаванца. У чыпе ўтрымліваюцца звесткі і пра ўладальніка, таму ніхто не выкідвае жывёл на вуліцу, каб не праславіцца нядобрапрыстойным грамадзянінам і не заплаціць штраф.

За мяжой, перш чым набыць жывёлу, чалавек адказвае сабе на шэраг пытанняў: ці гатовы ён вылучыць час і грошы на гадаванца на працягу ўсяго яго жыцця? Там вельмі сур'ёзна пра гэта думаюць. А ў нас падпарадкоўваюцца эмоцыям: вой, які прыгожанькі, які пухнаценькі, возьму я яго дадому. А гэта як дзіця: мала нарадзіць, атрымаць дапамогу — яго трэба гадаваць, выхоўваць, утрымліваць.

**Аксана ЯНОЎСКАЯ, фота аўтара.**


**ОКОЛОВСКИЙ СЕЛЬСКИЙ ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ Логойского района Минской области 9 октября 2019 года в 10.00 ПРОВОДИТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН по продаже земельного участка в частную собственность гражданам Республики Беларусь для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома**

| № п/п | Адрес земельного участка, кадастровый номер | Площадь, га | Инженерная и транспортная инфраструктура | Расходы по подготовке документов (рублей) | Начальная цена (рублей) | Задаток (рублей) |
|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | Минская область, Логойский район, Околовский сельсовет, д. Чистый Бор, д.19А, земельный участок с кадастровым номером 623285415101000023, целевое назначение земельного участка – для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома | 0,2500 | Возможность подключения электроустановок к существующим электрическим сетям отсутствует, нет возможности подключения водоснабжения, водоотведения, ливневой канализации, газоснабжение из индивидуальной газобаллонной установки, имеется подъездная грунтовая дорога | 2175,31+ публикация в газете | 2000,00 | 200,00 |

Задаток (10% от начальной цены) перечисляется на расчетный счет (IBAN) BY53AKBB36006191211090000000 в ОАО «АСБ Беларусбанк», код банка (BIC) AKBBBY2X, код платежа – 04901, получатель – Околовский сельский исполнительный комитет, УНП 600181669, ОКПО 04431582.

Победитель аукциона обязан в течение 10 (десяти) рабочих дней после утверждения результатов аукциона внести плату за земельный участок, возместить расходы, связанные с подготовкой документации, размещением рекламы, необходимой для проведения аукциона. Рассрочка по оплате за земельный участок не предусмотрена. Порядок проведения аукциона оговорен в условиях его проведения.

Затраты на строительство, в том числе проектирование, объектов распределительной инженерной и транспортной инфраструктуры к земельным участкам подлежат возмещению в порядке и случаях, предусмотренных в соответствии с Указом Президента Республики Беларусь от 7 февраля 2006 г. № 72 «О мерах по государственному регулированию отношений при размещении и организации строительства жилых домов, объектов инженерной, транспортной и социальной инфраструктуры».

Всем желающим предоставляется возможность ознакомиться с документацией и земельным участком, выставляемым на аукцион. Порядок проведения аукциона оговорен в условиях его проведения.

**Аукцион состоится 9 октября 2019 года в 10.00** по адресу: Минская область, Логойский район, д. Околово, д. 52.

**Заявление на участие и необходимые документы принимаются по рабочим дням с 8.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00. Последний день приема заявлений 3 октября 2019 года до 17.00.**

**Контактные телефоны: 8 (01774) 72-1-35, 74-6-25. Наш сайт в интернете: loqoysk.qov.by**



**ООО «БелИнвестОценка» извещает о проведении повторного открытого аукциона в г. Любани по продаже объекта Филиала № 6 «Любанский КСМ» ОАО «Белорусский цементный завод»**

**Лот № 1:** Изолированное помещение (гараж) с инвентарным № 643/Д-4728 площадью 67,9 кв. м, расположенное по адресу: Минская обл., г. Любань, ул. Боровика, 44Б-2.

***Начальная цена продажи – 7380 рублей, в т. ч. НДС – 1230 руб.***

Извещение о предыдущих несостоявшихся аукционах по данному лоту было опубликовано в газете «Звязда» от 23.02.2019 г. № 37 и в газете «Голас Любаншчыны» от 16.11.2018 г. № 69.

Аукцион состоится **16.09.2019 г. в 14.00** по адресу: Минская обл., Любанский р-н, п/о Смольгово (Филиал № 6 «Любанский КСМ»). Заявление на участие в аукционе принимаются в рабочие дни с 9.00 до 17.00 по 13.09.2019 г. включительно по адресу: г. Минск, ул. Казинца, 62, оф. 910. Заключительная регистрация участников – 16.09.2019 г. с 13.30 до 13.55 по месту проведения аукциона.

**Задаток –** 10 % от начальной цены предмета аукциона, перечисляется Организатору аукциона на р/с BY29BPSB30121505440129330000 в ЦБУ № 701 ОАО «БПС-Сбербанк», код BPSBBY2X. Получатель – ООО «БелИнвестОценка», УНП 191692351.

Участник, ставший победителем аукциона, после окончания аукциона обязан: подписать протокол аукциона; возместить затраты на организацию и проведение аукциона в течение 3 банковских дней после проведения аукциона; заключить договор купли-продажи с ОАО «Белорусский цементный завод» не позднее 10 рабочих дней со дня подписания протокола о результатах аукциона.

**Дополнительную информацию можно узнать у Организатора аукциона: 8(017) 398-29-44, 8(029) 615-40-08, e-mail: belinvo@tut.by и на сайте belinvo.by**

# Калі цвіце сумнік, робіцца сумна,

## Ці як адна расліна паказвае «жоўтую картку» ўсёй рабоце па добраўпарадкаванні

**Калі я прыязджаю на малую радзіму, стараюся знаходзіць час, каб прайсціся па вёсцы, пагладзець, што робіцца за плотам. І апошнім часам засмучае стан зямель, што не выкарыстоўваюцца пад гаспадарчыя патрэбы. Недагледжаныя, яны з лужкоў і пойма паволі ператвараюцца ў зборнікі пустазелля, сярод якога яркім цветам «гарыць» сумнік канадскі. Быццам сігналізуе — час вырашаць праблему!**

## Агрэсія і хуткасць — фактар поспеху

Сумнік канадскі і міжвідавыя гібрыды з канца XX стагоддзя актыўна пашыраюць арэал на тэрыторыі Беларусі, засяляючы пустэчы, абочыны дарог, лясныя паляны, сады і паркі, сухадольныя і пойменныя лугі, берагі вадаёмаў, утвараючы месцамі суцэльныя зараснікі на значнай плошчы. А гэта значыць, што, трапіўшы ў лес, сумнік пазбавіць нас грыбоў і ягад, а на палях і лугах пагоршыць якасць травянога корму, з-за яго знікнуць абарыгенныя віды раслін і жывёл.

Па словах **начальніка ўпраўлення біялагічнай і ландшафтнай разнастайнасці Мінпрыроды Мікалая СВІДЗІНСКАГА**, на 1 студзеня 2018 года сумнік «захапіў» 970,4 га зямлі. Але падчас інвентарызацыі высветлілася, што гэта расліна займае яшчэ большую тэрыторыю — 2859,8 га (на 01.10.2018 года). Сёння сумнік сустракаецца амаль па ўсёй Беларусі.

## Хто дапамог «захопніку»?

Чаму ж так моцна распаўсюдзіўся гэты госць з Паўночнай Амерыкі па нашай краіне? Першая прычына — яго ўласцівасці. Прыгожая шматгадовая расліна, якая не патрабуе догляду і цешыць позірк да позняй восені. Як не пасадзіць яе ў сваім агародчыку ці на могілках? Пры гэтым ніхто з кветкаводаў не звяртае ўвагі, наколькі актыўна яна размнажаецца (адна расліна прадукуе да 20 000 насення) і хутка выходзіць за першапачатковыя межы. Для вызначэння другой прычыны варта ўспомніць, дзе ў асноўным сустракаецца сумнік канадскі. Гэта пусткі, землі запасу, землі, якія выйшлі з сельскагаспадарчага абароту — то-бок тэрыторыі, якія добра не даглядаюць землекарыстальнікі. Сярод такіх нядбайных гаспадароў могуць быць сельскагаспадарчыя прадпрыемствы, прадпрыемствы лясной гаспадаркі, энергасеткі, дарожныя арганізацыі, сельвыканкамы, гаражныя і садаводчыя кааператывы і іншыя.

## Планы для раёнаў

Сёння ў Беларусі дзейнічае Палажэнне аб парадку правядзення мерапрыемстваў па рэгуляванні відаў раслін, распаўсюджванне і колькасць якіх выклікае занепакоенасць. У гэты спіс уваходзіць і сумнік канадскі.



Часцей за ўсё інвазійны від можна сустрэць на пустках і іншых недагледжаных землях.

На аснове дакумента мясцовыя органы ўлады распрацоўваюць і зацвярджаюць па ўзгадненні з тэрытарыяльнымі органамі Мінпрыроды (штогод да 15 красавіка) раённыя планы мерапрыемстваў, дзе адзначаюцца месцы росту такіх раслін, землекарыстальнікі, тэрміны і спосабы рэгулявання распаўсюджвання і колькасці. Органы ўлады павінны таксама арганізаваць правядзенне палявых даследаванняў для пошуку раслін. З мясцовых бюджэтаў выдзяляюцца сродкі на набыццё гербіцыдаў, правядзенне работ.

Роля ж спецыялістаў галіны аховы прыроды — сачыць, каб гэтыя планы выконваліся цалкам і ва ўстаноўленыя тэрміны.

## Меры барацьбы

Калі ўвогуле не рабіць ніякіх захадаў, сумнік канадскі штогод будзе павялічваць сваю плошчу на 15—20 % і ўрэшце зойме ўсю тэрыторыю нашай краіны. Як жа яго знішчыць?

Калі расліна на ўчастку распаўсюдзілася не вельмі шырока, падыдзе механічны спосаб — шматразовае кашэнне на працягу сезона, нават невялікіх парасткаў сумніку (да 15—20 см). На вялікіх плошчах лепш выкарыстоўваць хімічны спосаб (прымяненне гербіцыдаў) ці камбінаваны. Навукоўцы таксама раяць узворваць глебу ў месцах росту расліны.

Пры гэтым у межах населеных пунктаў і на землях гаспадарчага прызначэння нельга дапускаць з'яўлення пустак. Найлепшы выхад з сітуацыі — неадкладнае залужэнне ці перазалужэнне мясцовымі злакамі.

Для фізічных жа асоб пажадана зусім не вырошчваць сумнік у сваіх кветніках, а калі ён ужо расце — кожны год, як толькі мяцёлка пачне цямнець (а значыць хутка на месцы кветак з'явіцца насенне), зразаць яе і абавязкова ўтылізаваць у кампоставых ямах (на глыбіні 40 см). Карэнішча таксама трэба выдаліць, высушыць і выкінуць ці спаліць.

## Разам вырашым праблему

— Рэгуляванне распаўсюджвання і колькасці інвазійных відаў — абавязак кожнага землекарыстальніка, як юрыдычных, так і фізічных асоб, — гаворыць Мікалай Свідзінскі. — Таму я заклікаю грамадзян усімі даступнымі спосабамі абмежаваць распаўсюджванне гэтай расліны — на сядзібных участках, могілках і іншых землях.

Вельмі важная пры гэтым роля і мясцовых органаў кіравання і самакіравання, упэўнены прадстаўнік Мінпрыроды. Яны разам са спецыялістамі прыродаахоўнага ведамства павінны праводзіць маніторынг і растлумачальную работу з насельніцтвам і землекарыстальнікамі, а таксама кантраляваць стан тэрыторый, на якіх раней быў знішчаны сумнік.

## Пакаранне ідзе следам

Сёння, калі на пэўнай тэрыторыі зафіксавана месца росту сумніку, яно ўключана ў раённы план мерапрыемстваў, але землекарыстальнік не выканаў прадпісанні тэрытарыяльных органаў Мінпрыроды па яго знішчэнні, — ён прыцягваецца да адміністрацыйнай адказнасці па арт. 23.1 КаАП (прадугледжвае папярэджанне ці накладанне штрафу ў памеры да 20 базавых велічынь). Але ў будучым для пакарання нядбайных гаспадароў будзе дзейнічаць асобны артыкул Кодэкса.

Па словах **начальніка ўпраўлення каардынацыі кантрольнай дзейнасці Мінпрыроды Аляксандра ЦАБРУКА**, такія прапановы былі ўнесены ў праект закона «Аб змяненні кодэксаў па пытаннях адміністрацыйнай адказнасці». Плануецца, што артыкул «Парушэнне парадку абыходжання з аб'ектамі расліннага свету» будзе прадугледжваць адказнасць (ад папярэджання да штрафу ў памеры ад 2 да 30 базавых велічынь) за распаўсюджванне і несвоечасовае правядзенне мерапрыемстваў па рэгуляванні колькасці і распаўсюджвання відаў. Цяпер праект закона знаходзіцца на разглядзе ў парламенце.

## Народны кантроль

Калі на вашым участку няма сумніку канадскага, але вы ведаеце тэрыторыі, дзе ён расце, паведамляйце пра іх мясцовым органам улады, землекарыстальнікам і тэрытарыяльным органам Мінпрыроды для прыняцця мер рэагавання.

— Толькі сумеснымі намаганнямі землекарыстальнікаў, грамадзян і прыродаахоўнага ведамства мы зможам спыніць экспансію сумніку канадскага, — падкрэсліў Мікалай Свідзінскі.

**Вераніка КОЛАСАВА.**


Центр Промышленной Оценки

• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

**Извещение о проведении повторного аукциона**

| | | |
|---|---|---|
| **Организатор аукциона** | ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703 | |
| **Продавец** | ОАО «ОС и ВТ», г. Минск, ул. Филимонова, 25 | |
| **Предмет аукциона<br>Месторасположение: г. Минск, ул. Филимонова, 25-12** | | |
| Наименование (назначение) | Общая площадь | Инвентарный номер |
| **Помещение общественного питания с архивными и складскими помещениями** | 1356,1 кв. м | 500/D-798788380 |
| **Начальная цена с НДС 20 % – 900 479,27 бел. руб.**<br>(цена снижена на 5 %) | | |
| **Задаток 10 %** от начальной цены предмета аукциона перечисляется на р/с BY60 BLBB 3012 0191 0213 9000 1001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области, г. Минск, ул. Коллекторная, 11 БИК BLBBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа: ЗАО «Центр промышленной оценки» | | |
| **Срок подписания договора купли-продажи:** 10 рабочих дней после проведения аукциона | | |
| **Условия оплаты предмета аукциона** | | |
| Если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты за предмет аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение **30 (тридцати) календарных дней** после заключения договора купли-продажи | | |
| Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, определения лица, выигравшего аукцион, а также возмещения затрат и оплаты вознаграждения за организацию аукциона, оговорен в Условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.cpo.by | | |
| Извещение о проведении предыдущего аукциона опубликовано в номере газеты «Звязда» от 14.08.2019 | | |
| Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным без объяснения причин снятия | | |
| **Дата и время проведения аукциона: 27.09.2019 в 14.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, офис 1703. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по 25.09.2019 до 17.00 по указанному адресу.<br>Тел.: +375 17-280-36-37; +375 44-317-95-42. E-mail: auction@cpo.by** | | |

**Могилевский филиал**
**РУП «Институт недвижимости и оценки»**
**сообщает о проведении 20.09.2019 г.**
**повторного открытого аукциона (цена снижена)**

Лот № 1: Изолированное помещение с инв. № 710/D-84708 – Изолированное помещение № 2, площадь – 1556,5 кв. м, назначение: помещение, не относящееся к жилищному фонду, расположенное по адресу: Могилевская обл., г. Бобруйск, ул. Станционная, 5-2.
Капитальное строение, в котором находится данное изолированное помещение, расположено на земельном участке с кадастровым номером 741000000006001553. Отдельный земельный участок не выделен.
***Начальная цена продажи: 916 800,00 бел. рублей с учетом НДС. Сумма задатка: 91 680,00 бел. руб.***

**Аукцион состоится 20 сентября 2019 года в 11.00** по адресу: г. Могилев, ул. Первомайская, 77, к. 352. Подача заявок (осуществляется лично) и внесение задатка: по 19.09.2019 до 15.00 в рабочие дни с 8.30 до 12.30, с 13.30 до 16.30. Аукцион может быть отменен в любое время, но не позднее, чем за три дня до даты аукциона

**Продавец:** ОАО «Могилевоблавтотранс» УНП 700167884, г. Могилев, ш. Гомельское, 1

**Расчетный счет для внесения задатка:** Получатель платежа РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182,
р/с IBAN BY21BPSB30121543370109330000 в ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, BIC банка BPSBBY2X

**Срок и условия оплаты:** победитель аукциона уплачивает вознаграждение за организацию и проведение аукциона в размере 0,3 % от конечной цены продажи лота в течение 3 (трех) рабочих дней со дня проведения аукциона. Победитель аукциона обязан в течение 10 (десяти) рабочих дней со дня подписания протокола аукциона подписать договор купли-продажи предмета аукциона. Оплата предмета аукциона производится на условиях заключенного договора купли-продажи. Внесенный Победителем аукциона задаток засчитывается в счет оплаты за предмет аукциона

Информация о предыдущем аукционе была опубликована в номере газеты «Звязда» от 09.07.2019

**Организатор аукциона:** Могилевский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182, г. Могилев, ул. Первомайская, 77, к. 352

**Дополнительную информацию можно получить по тел.: +375222-72-41-14, +37529-624-26-25, Mogilev@ino.by, на сайте ino.by**

**Вниманию акционеров ОАО «Элема»**
(г. Минск, ул. Тростенецкая, 5)!
**Наблюдательный совет ОАО «Элема» доводит до сведения акционеров, что 13.09.2019 г. состоится внеочередное общее собрание акционеров ОАО «Элема»**

Место проведения собрания – г. Минск, ул. Тростенецкая, 5А, Дом культуры ОАО «Элема»;
- время начала собрания – 15.00;
- время и место регистрации участников собрания: в день проведения собрания с 14.00 до 14.50 по адресу: г. Минск, ул. Тростенецкая, 5А, Дом культуры ОАО «Элема»;
- время и место ознакомления акционеров с документами по вопросам повестки дня собрания: в рабочие дни (понедельник-пятница) с 06.09.2019 г. по 12.09.2019 г. по адресу: г. Минск, ул. Тростенецкая, 5А, Дом культуры ОАО «Элема» (приемная директора) с 9.00 до 15.00; 13.09.2019 г. – по месту проведения собрания с 9.00 до 15.00.

Орган общества, созывающий внеочередное общее собрание акционеров, – наблюдательный совет, основание его созыва – собственная инициатива наблюдательного совета.

**Повестка дня:**

1. О выкупе акций собственного выпуска на баланс ОАО «Элема».

Список лиц, имеющих право на участие в собрании, будет составлен по состоянию на 11.09.2019 г.

Просим принять участие в собрании или поручить представлять Ваши интересы на собрании акционеров представителю. Для участия в собрании акционеру необходимо при себе иметь паспорт, представителю акционера – паспорт и доверенность, оформленную в соответствии с требованиями законодательства, либо иной документ, подтверждающий его полномочия в качестве представителя.

**Дополнительная информация по телефону + 375 17 364 73 09.**

УНП 100074549



МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

**РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ № 15 ад 17 лютага 2009 года выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.**
**Заснавальнікі:** Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

**Дырэктар — галоўны рэдактар СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.**
**Адказны за выпуск: АНУФРЫЕВА В. А.**

Грамадскі савет: **ПАПКОЎ А. А.,** старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні; **ЦУПРЫК Л. А.**, старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па дзяржаўным будаўніцтве, мясцовым самакіраванні і рэгламенце; **ПАПКО В. М.**, намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па міжнародных справах; **БЕЛЯКОЎ А. Э.**, намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці; **ПАНАСЮК В. В.**, старшыня Мінскага гарадскога Савета дэпутатаў; **ДРЫЛЁНАК Т. Л.**, старшыня Лёзненскага раённага Савета дэпутатаў; **СУШЧАНКА М. Л.**, старшыня Глушанскага пасялковага Савета дэпутатаў Бабруйскага раёна.

**Выдавец — рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»**

**АДРАС РЭДАКЦЫІ:**
220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10 а.

**КАНТАКТНЫ ТЭЛЕФОН** 287 18 31;
**e-mail:** info@zviazda.by

**Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 03.04.2009. 220013, г. Мінск, пр. Незалежнасці, 79.**

**Тыраж 14.804. Нумар падпісаны ў 19.30 5 верасня 2019 года.**